Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 30 (4473) 25 ліпеня 2008 г.

У нумары:

Сяброўства ўзнаўляецца

Творы нашых пісьменнікаў перакладаюцца і выдаюцца ў іншых краінах.

Стар. 3

Ён адкрыў Еўропе казахаў

Ураджэнца Нясвіжа знакамітым зрабіла... ссылка ў Сібір.

Стар. 4

Прырода — вось яго натхненне!

Адукацыя і вакаліста і піяніста атрымана адначасова, у адным ВНУ.

Стар. 11

Літаратары ўсміхаюцца

Штомесячная старонка сатыры і гумару.

Стар. 13

Яшчэ адзін верш Міколы Купрэева

Невядомы твор з архіва паэтавага сябра.

Стар. 14

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА II ПАЎГОДДЗЕ 2008 г.

Для індывідуальных падпісчыкаў:	*Ведамасная падпіска:*
1 месяц — 6720 руб. Падпісны індэкс — 63856	1 месяц — 8710 руб. Падпісны індэкс — 638562

Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў: другое паўгоддзе, на 1 месяц — 4500 руб. Падпісны індэкс — 63815

Льготная падпіска: 1 месяц — 6820 руб. Падпісны індэкс — 63880

Каб год для вас быў неблагім — падпішыцеся на «ЛіМ»!

Дарогамі Напалеона

20 ліпеня ў мястэчку Іванава, што на Брэстчыне, прайшло музычнае свята пад рамантычнаю назвай "Тасцёўня Напалеона Орды".

Ідэя гэтага музычнага праекта нарадзілася ў калектыве Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга летась, калі ўвесь культурны свет адзначаў 200-годдзе з дня нараджэння Напалеона Орды. Тады заслужаны калектыў, у рэпертуары якога музыка "беларускага Напалеона" даўно і трывала займае пачэснае месца, упершыню ажыццявіў падарожжа на радзіму гэтага рознабаковага таленту — мастака і кампазітара, публіцыста і педагога, музычнага дзеяча і вучонага. На іванаўскай зямлі Напалеон Орда нарадзіўся і пахаваны; у Іванаве ўстаноўлены помнік яму — адзіны ў Еўропе; імем яго названыя вуліца і дзіцячая школа мастацтваў, а паблізу вёскі Варацэвічы ўпарадкоўваецца радзінная сядзіба Орды, на аснове якой разгорнуты музейны комплекс. І вось ужо другі год запар незвычайная гасцёўня сабрала на яго радзіме людзей творчых і аматараў мастацтва. Прычым сёлетняя вандроўка Нацыянальнага канцэртнага аркестра па Напалеонавай дарозе супала са святкаваннем 585-годдзя горада Іванава.

"Жыццё славутага ўраджэнца Брэстчыны — прыклад таго, як грамадзянін павінен любіць сваю Радзіму і рабіць усё, каб яна квітнела і развівалася, — сцвярджае маэстра М. Фінберг. І дадае: — Напалеон Орда — аўтар "Граматыкі музыкі", якая доўгі час была лепшым дапаможнікам па тэорыі музыкі. Ён стваральнік больш як дваццаці канцэртных паланезаў ды іншых твораў, што па-сучаснаму загучалі ў выкананні нашых камерных калектываў, дзякуючы адмысловай працы выдатных аранжыроўшчыкаў аркестра. "Гасцёўня Напалеона Орды" — працяг нашага праекта вяртання ў мастацкі ўжытак музыкі, што стагоддзямі гучала ў невялікіх гарадах Беларусі. І вось якая атрымалася повязь: мастак Орда многія са сваіх акварэльных малюнкаў, графічных работ прысвяціў Нясвіжу і Мірскаму замку. І фэсты нашага аркестра рухаюцца нібы па карце яго мастакоўскіх дарог: ад "Музаў Нясвіжа" да "Мірскага замка" і далей — да радзімы творцы, да "Гасцёўні..." на іванаўскай зямлі".

Галоўная канцэртная праграма "Напалеон Орда ў сусветнай музычнай прасторы", якую вяла і каменціравала доктар мастацтвазнаўства, рупліўца беларускага музычнага адраджэння Вольга Дадзіёмава, у кантэксце іванаўскага свята набыла знакавае, патрыятычнае, асветніцкае, духоўна-эстэтычнае гучанне. Яскравым падарункам для месцічаў сталася выступленне Біг-бэнда з прэзентацыяй джазавай класікі ды песенны гала-канцэрт з удзелам салістаў аркестра. Пад рубрыкай "Славутыя імёны Беларусі" Нацыянальны канцэртны аркестр правёў сустрэчу з народным артыстам краіны, знаным кампазітарам Эдуардам Зарыцкім.

"Гасцёўня Напалеона Орды" завяршыла багаты на падзеі сезон заслужанага калектыву. Праміне час летніх вакацый, і ўжо 7 верасня музыканты пад кіраўніцтвам М. Фінберга правядуць чацвёртую па ліку імпрэзу камернай і духоўнай музыкі ў Тураве (дарэчы, таксама адлюстраваным у малюнках Н. Орды), а праз нейкі час выправяцца ў Мсціслаў, дзе ўжо сёмы раз пройдзе свята камернай музыкі.

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

Вітаем «Новы час»!

Падзеяй лета, дый не будзе перабольшваннем сказаць — усяго сёлетняга года, сталася выстаўка "Новы час". Яна разгарнулася ў сталічным Палацы мастацтва на пачатку гэтага месяца і прабудзе тут да 27 ліпеня. Экспазіцыя, у якой прадстаўлены творы выпускнікоў мастацкага факультэта Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў 2002 —2007 гадоў, апраўдвае сваю амбіцыйную назву: атмасфера выставачнай залы поўніцца творчымі павевамі новага часу.

Міністр культуры Беларусі Уладзімір Матвейчук, які наведаў вернісаж, звярнуўся з прывітальным словам да ўсіх шматлікіх прысутных і адзначыў:

— *Наша дзяржава заўсёды годна і паважліва ставіцца да інтэлігенцыі, творчай моладзі. Канкрэтны прыклад — адкрыццё такой адметнай выстаўкі, што без пампезнасці, без шуму адлюстроўвае нармальныя ўзаемаадносіны Міністэрства культуры, Беларускага саюза мастакоў і Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Сёння Міністэрству культуры трэба найперш звярнуць увагу на падрыхтоўку моладзі, на работу з выпускнікамі мастацкіх навучальных устаноў. Трэба, каб маладыя спецыялісты пацвярджалі сваю кваліфікацыю і заяўлялі пра сябе менавіта тут, у арганізацыях і навучальных установах Рэспублікі Беларусь. Але ўражанне такое, што хтосьці з аўтараў работ, прадстаўленых на выстаўцы, у Беларусі не працуе, многія пайшлі "на вольны хлеб". А стасункі з маладымі спецыялістамі павінны ажыццяўляцца ў рэальным жыцці нашай краіны, і малады чалавек, які атрымаў досыць высокую кваліфікацыю ў дзяржаўнай навучальнай установе, мусіць радаваць сваім талентам найперш сваю краіну, абавязкова адпрацаваўшы два гады па месцы размеркавання.*

Маладым талентам, паводле слоў У. Матвейчука, будуць прапаноўвацца сацыяльныя заказы ў Мінску, у абласных цэнтрах, тым болей, што павялічваюцца запатрабаванні грамадзян краіны, у тым ліку духоўныя. "Калі ж ёсць нешта, чаго мы недагледзелі, не зразумелі, — падкажыце, што трэба зрабіць, каб праца ваша была заўважаная і запатрабаваная ў нашай краіне", — падкрэсліў міністр.

Рэктар БДАМ Рычард Смольскі выказаў персанальную падзяку У. Матвейчуку за ініцыятыву правядзення выстаўкі, а таксама ўдзячнасць кіраўніцтву Беларускага саюза мастакоў за клопат па яе арганізацыі. Выступілі таксама старшыня БСМ Уладзімір Савіч і стыпендыят спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі Дзяніс Чубукоў. Лейтматывам разваг наконт гэтай выстаўкі гучала думка пра яе значэнне як падзеі ў жыцці Беларусі ды пажаданне рэгулярна ладзіць агледзіны творчасці маладых.

Лана ІВАНОВА

На здымку: міністр культуры Беларусі Уладзімір Матвейчук (у цэнтры групы) знаёміцца з выстаўкай.

Фота Кастуся Дробава

Ушанавалі Тодара Кляшторнага

У наш час — час духоўнага адраджэння — імя і творы вядомага беларускага паэта Тодара Кляшторнага, які загінуў у час рэпрэсій, уваскрасаюць для сучаснага грамадства, каб быць разам з народам, сваёй Айчынай. Як сказаў паэт, "Мы жылі, жывём і будзем жыць", каб хваляваць і ўзвышаць душы тых, каму дадзена прадаўжаць род беларускі на зямлі роднай Бацькаўшчыны.

На Лепельшчыне, якая стала калыскай таленту паэта, прайшлі краязнаўчыя чытанні, прысвечаныя знакамітаму земляку. Пасля экскурсіі па музеі Тодара Кляшторнага, які створаны ў вёсцы Камень — родных яго мясцінах, моладзь запоўніла актавую залу Дома культуры. На сцэне, на асобным століку, партрэт паэта і жывыя кветкі, якія прынеслі яго нашчадкі. Хацелася ўглядзецца ў прыгожы і натхнёны твар, адчуць самае галоўнае: духоўную моц творцы.

Вечарына памяці паэта змясціла ў сабе цудоўныя вершы Тодара Кляшторнага ў выкананні юных чытальнікаў, жывыя ўспаміны дачок паэта Тадзіяны Тодараўны і Маі Тодараўны, канцэртныя выступленні членаў літаратурна-музычнага аб'яднання "Выток", паэтычныя выступленні віцебскіх пісьменнікаў.

Галоўная мэта чытанняў — далучэнне моладзі і школьнікаў да творчай спадчыны песняра, бо высокае паэтычнае слова, якое выпраменьваецца чулым і чыстым сэрцам, здольна лячыць і ачышчаць душы. У асобе свайго знакамітага земляка маладыя лепяльчане імкнуцца знайсці сябра, дарадчыка, адчуць тое святло, якое дае толькі шчырая любоў да Бацькаўшчыны, да людзей, да жыцця.

На чытаннях была асобна вылучана тэма кахання ў вершах Тодара Кляшторнага.

Вы — тайна
жнівеньскіх начэй,
Вы — шэпты
спелага калосся,
З глыбокай мудрасці вачэй
Свіціцца даль,
вясна і восень...

Гэткія вершы — цудоўны ўступ для сур'ёзнай размовы з моладдзю аб тым, што на пачатку жыцця асабліва хвалюе кожнага чалавека — каханне, вернасць, адказнасць за будучую сям'ю, дзяцей. Каб быць шчаслівым у каханні, трэба заставацца паэтам, калі нават і не пішаш вершы. Сваім дачушкам Тодар даў цудоўныя, паэтычныя імёны: Тадзіяна (ад імя бацькі і маці Яніны), Весналіна, Мая. На літаратурных чытаннях прысутнічалі старэйшая і малодшая, чые выступленні з затоеным дыханнем слухалі прысутныя. Дарэчы, Тадзіяна Тодараўна — паэтэса, аўтар многіх кніг для дзяцей. У музеі бацькі ёсць і яе куток, яе творы. Гэтым разам яна падаравала музею кнігу "Янка Купала і Тодар Кляшторны". У сваім выступленні Тадзіяна Тодараўна падкрэсліла, што талент ніколі не памірае, ён заўсёды жывы: "Душа паэта — у вершах. Пішыце пра яго, спявайце пра яго. Тодар Кляшторны заўсёды будзе жыць".

Ад імя Саюза пісьменнікаў Беларусі старшыня Віцебскага абласнога аддзялення, лаўрэат Міжнароднай літаратурнай прэміі імя Сімяона Полацкага Тамара Краснова-Гусачэнка выказала глыбокую ўдзячнасць кіраўнікам раёна, работнікам аддзела культуры Лепельскага райвыканкама, Каменскага Дома культуры, грамадскасці — усім, хто ўзнаўляе памяць аб выдатным беларускім майстры паэтычнага слова Тодары Кляшторным і падаравала бібліятэцы-музею сваю новую кнігу "Осень молодая", якая ў канцы мінулага года выйшла ў выдавецтве "Мастацкая літаратура".

У цэнтры Каменскага сельсавета ёсць і вуліца, якая носіць імя Тодара Кляшторнага: 15 добраўпарадкаваных сучасных дамоў, дзе жывуць спецыялісты сельскай гаспадаркі, механізатары, даяркі. У кожны дом падведзены прыродны газ — так выконваецца дзяржаўная праграма па пераўтварэнні і развіцці вёскі. У вёсцы Камень побач з музеем паэта — Дом для ветэранаў "Святліца", дзе жывуць адзінокія састарэлыя, аддзяленне сувязі, магазін, школа, будуецца аграгарадок. Як парадаваўся б наш зямляк за свае родныя мясціны!

Старшыня сельсавета Мікалай Мікалаевіч Сініца распавядаў, што на вуліцы імя паэта абавязкова пасадзяць клёны, якія ён так любіў і аб якіх спяваў у вершах. "Будзе алея памяці, — кажа Мікалай Мікалаевіч, — тут і ручай побач, нібы гамоніць аб мінулым і аб будучыні".

Валянціна АЛЕЙНІКАВА

На здымку: Т. Кляшторнага — Тадзіяна і Мая — у музеі свайго бацькі (злева).

Фота аўтара

У Саюзе пісьменнікаў Беларусі

17 ліпеня 2008 года адбыўся Прэзідыум праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі, на якім было зацверджана рашэнне журы па падвядзенні вынікаў рэспубліканскага конкурсу на лепшы твор 2007 года.

Трэба ўлічыць, што намінацый у гэтым годзе ўдвая больш: паэзія, проза, дзіцячая літаратура, драматургія, літаратурная крытыка, публіцыстыка, пераклад, сатыра і гумар, дэтэктыўны жанр, песенны жанр. Пераможцы атрымаюць узнагароды 7 верасня на свяце "Дзень беларускага пісьменства".

Па прапанове рэвізійнай камісіі Скобелеў Эдуард Марцінавіч выключаны з ліку членаў ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі" за сістэматычныя парушэнні яго статута. За дадзенае рашэнне Прэзідыум прагаласаваў аднагалосна.

Таксама было разгледжана пытанне падрыхтоўкі і ўдзелу Саюза пісьменнікаў Беларусі ў свяце "Дзень беларускага пісьменства", якое ў гэтым годзе пройдзе ў горадзе Барысаве 7 верасня 2008 года.

Н. К.

Першыя лаўрэаты

Сёлета заснаваны літаратурныя прэміі Магілёўскага абласнога аддзялення грамадскага аб'яднання "Саюз пісьменнікаў Беларусі". Няданая названы лаўрэаты гэтых прэмій за творы, выдадзеныя ў 2007 годзе. Прэміі імя Івана Чыгрынава за кнігу апавяданняў "Святая память" удастоіўся Аляксандр Церахаў; прэміі імя Аляксея Пысіна за кнігу паэзіі "Окно во все времена" — Іван Пехцераў; прэміі імя Васіля Хомчанкі за кнігу вершаў для дзяцей "Адмыслоўцы" — Васіль Рагаўцоў. Уручэнне дыпломаў і грашовых прэмій адбудзецца напярэдадні Дня беларускага пісьменства.

Уладзімір ДУКТАЎ

З кірмашу

Тыдзень таму прагучаў заключны акорд "Славянскага базару ў Віцебску", а яго ўдзельнікі, госці, відавочцы яшчэ жывуць фестывальнымі ўражаннямі.

Асаблівыя ўспаміны пра сёлетняе свята мастацтваў захаваюць лаўрэаты XVII Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні "Віцебск-2008", бо ім пашанцавала прывезці з гэтага песеннага кірмашу не толькі сувеніры. Спявак з Літвы Данатас Монтвідас, абсалютны лідэр сёлетняга конкурсу (набраў максімальную колькасць балаў), узнагароджаны Гран-пры, атрымаў прэмію ў памеры 10 тыс. долараў, спецыяльны прыз "Ліра" і дыплом. Прадстаўнік Беларусі Віталь Гардзей падзяліў з расіянкай Ленай Валеўскай 1-ю прэмію ($6 тыс. напалам). Лаўрэату 2-й прэміі Надзіко (Грузія) уручылі чэк на $4 тыс. Уладзіслаў з Украіны ды Пламен Патаў з Балгарыі падзялілі 3-ю прэмію — $2 тыс.

А яшчэ Віталю Гардзею і Лене Валеўскай уручылі Спецыяльныя прызы Парламенцкага сходу Беларусі і Расіі ды па сертыфікаце на запіс сольнага альбома — ад Фонду гуманітарнага супрацоўніцтва СНД. Спецыяльная прэмія імя У. Мулявіна "За лепшае ўвасабленне нацыянальнай тэмы і высокае выканальніцкае майстэрства" — у Лючыі з Румыніі. Міжнародная федэрацыя арганізатараў фестываляў адзначыла дыпломам польскую канкурсантку Флорэк. Сяргею Грыгарану (Арменія) даставалася ўзнагарода ад тэлерадыёкампаніі "Мір". За арыгінальнасць выканання журы адзначыла спецыяльнай прэміяй Арне Ватнёй з Нарвегіі. Астатнія канкурсанты атрымалі каштоўныя прызы ад спонсараў.

Я. КАРЛІМА

Рэкорд Раеўскага

Апошнія 35 гадоў пачэсная пасада мастацкага кіраўніка Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы нязменна ўспрымаецца ў звязку з імем свайго шаноўнага ўладальніка — народнага артыста Беларусі, лаўрэата Дзяржаўных прэмій СССР і БССР Валерыя Раеўскага.

З яго прыходам у 1973 годзе ў шэрагі купалаўцаў у новай якасці распачалася свежая старонка ў беларускай гісторыі тэатральнага мастацтва. Валерый Раеўскі прынёс з сабой адметна новы стыль, іншую філасофію самаго ўспрымання і ўвасаблення сцэнічнай дзеі. Сімбіёз традыцыйных элементаў з наватарскімі ўнёскамі майстра зрабіў Купалаўскі тэатр унікальным. Яшчэ ніколі Шэкспір, Чэхаў, Дастаеўскі не гучалі настолькі сучасна, неадрыўна ад плыні эпохі, свежа, у чымсыці дзёрзка і рызыкоўна, і праз гэта яшчэ "смачней".

Днямі ў Малой рэпетыцыйнай зале тэатра ў коле сяброў, калег і прадстаўнікоў СМІ адбылося ўрачыстае віншаванне майстра з 35-годдзем дзейнасці на пасадзе мастацкага кіраўніка тэатра. Пасля лавіны цёплых слоў удзячнасці, пажаданняў добрага здароў'я і далейшых поспехаў на тэатральнай ніве дырэктар Купалаўскага тэатра Мікалай Кірычэнка ўручыў В. Раеўскаму... вынятку з працоўнай кніжкі, як сведчанне пра цяжкі і доўгі, але плённы творчы шлях майстра.

За 35 гадоў творчай дзейнасці В. Раеўскі паставіў больш як 40 лепшых спектакляў тэатра. Яму належыць увогуле болей як 60 пастановак у Беларусі і за мяжою. Амаль 90 купалаўцаў за гэты немалы час атрымалі ганаровыя званні народных артыстаў, заслужаных дзеячаў мастацтваў, лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі Беларусі, лаўрэатаў спецыяльнай прэміі Прэзідэнта і г.д.

"Сёння мы проста хацелі сказаць шчырыя словы ўдзячнасці Валерыю Мікалаевічу за яго працу, за тое, што ён вытрымаў за

ўвесь гэты час. 35 гадоў — дата, якая ў гэтым выпадку заслугоўвае занясення ў кнігу рэкордаў Гінеса: няма ніводнага мастацкага кіраўніка ў краінах СНД, які б гэтак доўга быў на чале тэатра", — сцвярджалі ўдзельнікі цырымоніі.

"Я вось падумаў, што мы, беларусы, народ залішне сціплы і неяк не ўмеем адзначаць гэткія падзеі і славіць сваіх герояў. Бо калі б такая нагода надарылася, напрыклад, у Арменіі ці ў Грузіі, дык быў бы і феерверк, і заклалі б пліту з адбіткам далоні Валерыя Мікалаевіча, — казаў прафесар Рычард Смольскі, рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, у якой выкладае і прафесар В. Раеўскі. — Нягледзячы на тое, што знешне гэтая дата адзначаецца сціпла, камерна, сама падзея выбітная для найноўшай культуры нашай краіны. За гэтыя 35 гадоў Купалаўскі тэатр шмат чаго перажыў, былі і ўзлёты і падзенні, пэўныя складанасці. Але ж марку лепшага тэатра Беларусі (і не толькі) ён трымаў. Несумненна, тут ёсць заслуга Валерыя Раеўскага. І 35 гадоў яго мастацкага кіраўніцтва — рэкорд, які ў Беларусі за бліжэйшае стагоддзе наўрад ці хто паб'е".

Рэжысёра павіншаваў старшыня Беларускага саюза тэатральных дзеячаў драматург Аляксей Дударaў, прэм'еру новай п'есы якога ў пастаноўцы В. Раеўскага неўзабаве ўбачыць публіка.

Захар ШЧАРБАКОЎ

На здымку: Аляксей Дударaў і Валерый Раеўскі.

Фота Кастуся Дробава

Сведчаць дакументы

На пачатку ліпеня ў будынку Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі сабраліся пісьменнікі, гісторыкі, журналісты, вайскоўцы Войска Польскага і Беларускай Арміі. Нацыянальны музей сумесна з Польскім Інстытутам зладкавалі выставу, якая носіць назву "З найвялікшай жорсткасцю... Злачынствы вермахта ў Полыпчы, верасень — кастрычнік 1939 г.". Выстава паказвае злачынствы нямецкай арміі, здзейсненыя на польскіх землях у першыя два месяцы Другой сусветнай вайны. Уступнае слова сказаў дырэктар музея Сяргей Вечар, адкрылі выставу госці з Полыпчы Марэк Краеўскі і Яцэк Паўловіч.

Задача фотаэкспазіцыі заключаецца ў тым, каб папоўніць матэрыялы выставы Гамбургскага Інстытута Грамадскіх Даследаванняў "Вайна на знішчэнне. Злачынствы вермахта 1941—1944 гг.". У некаторых нямецкіх асяродках экспазіцыі гамбургскай выставы выклікалі шырокія дыскусіі на тэму вермахта. Але агульнавядома, што з першага дня вайны нямецкая армія дзейнічала з пагардай да міжнародных канвенцый, а "рыцарскім" салдатам вермахта дазвалялася чыніць шматлікія злачынствы над палоннымі і насельніцтвам.

Перыяд з 1 верасня па 25 кастрычніка 1939 г. — час функцыянавання так званай вайсковай адміністрацыі. У той час вермахт з'яўляўся вышэйшай уладай на акупаванай тэрыторыі і нёс прававую адказнасць за дзейнасць усіх аб'яднанняў і ўстаноў трэцяга рэйха. Экспазіцыя дакументальна пацвярджае акты злачынстваў, здзейсненых падчас авіяцыйных бамбардзіровак, а таксама праявы антысемітызму і генацыду, учыненых над інтэрніраванымі асобамі, грамадзянскімі абаронцамі і ваеннапалоннымі.

Анатоль КУДЛАСЕВІЧ

Чароўныя падарожжы

У Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы прайшла прэзентацыя кнігі вядомай літоўскай пісьменніцы Эміліі Балененэ-Легютэ "Падарожжы на планету мараў". Кніга казак была выдадзена ў Ліёне (Францыя) на сродкі беларускай мастачкі Вольгі Дзёмкінай, якая да таго ж выступіла ў якасці ілюстратара выдання.

Год таму ў Парыжы пры падтрымцы беларускага прадстаўніцтва ў ЮНЕСКА, пасольстваў Беларусі і Літвы ў Францыі адбылася ўрачыстая прэзентацыя гэтага сумеснага твора двух таленавітых людзей. Кніга выйшла ў чатырох варыянтах: на англійскай, літоўскай, беларускай і французскай мовах.

Цікава, што да апошняга года ні аўтар, ні ілюстратар не ведалі адно аднаго. Падчас прэзентацыі Вольга Дзёмкіна распавяла, як за студэнцкім часам набыла адразу 2 экземпляры кнігі літоўскай пісьменніцы "Уцёс і ружы", адзін з якіх пранесла з сабой праз доўгія гады. Чароўныя казкі не раз ратавалі мастачку ад нуды і служылі крыніцай творчага натхнення. "Падарожжы на планету мараў" стала пятай кнігай, да якіх стварыла ілюстрацыі Вольга Дзёмкіна. Да таго ж габелены і кніжная графіка беларускай мастачкі сталі пераможцамі шматлікіх міжнародных конкурсаў, а яе творчасць адзначана залатым медалём Міжнароднай акадэміі мастацтва і літаратуры LUTEC у Парыжы і медалём Нацыянальнай асамблеі Францыі. Творы нашай славутай зямлячкі ўвайшлі ў энцыклапедыі мастацтва Беларусі, Германіі і Францыі. Іх можна пабачыць не толькі ў гістарыка-культурным запаведніку "Заслаўе" і Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі, але і ў лепшых выставачных галерэях Еўропы і ЗША.

Аўтар кнігі Эмілія Балененэ-Легютэ вядомая ў Беларусі ў першую чаргу сваімі перакладамі на літоўскую мову твораў Якуба Коласа, Міхася Лынькова, Вячаслава Адамчыка, а таксама шэрагам артыкулаў пра Янку Купалу.У 2001 годзе яе кніга аб Францыску Скарыне была прызнана ў Літве лепшай кнігай года. Творы пісьменніцы перакладзены на англійскую, нямецкую, польскую, французскую, азербайджанскую і беларускую мовы. У сваім выступленні Балененэ-Легютэ асаблівую ўвагу надала сферы культуры, якая на пэўным гістарычным этапе была агульнай для беларускага і літоўскага народаў, а таксама нагадала ўсім прысутным пра Грундвальдскую бітву, 598-я ўгодкі якой мы адзначылі 15 ліпеня.

На думку Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Літвы ў Рэспубліцы Беларусь Эдмінаса Багдонаса, менавіта такія акцыі маюць найбольшае значэнне для пашырэння культурных сувязяў паміж нашымі краінамі.

У сваю чаргу Вольга Дзёмкіна, якая апошнія 12 гадоў жыве ў Ліёне, паабяцала прывезці наступным разам 500 экземпляраў кнігі "Падарожжы на планету мараў" і столькі ж кніжак, прысвечаных гісторыі Францыі, якія будуць перададзены ў дзіцячыя і школьныя бібліятэкі.

Ян АКУЛІН

Прыцягненне радзімы

У мінскім фальварку "Добрыя мысліі", што па вуліцы Магілёўскай, адкрылася выстава твораў мастака Вячкі Целеша, які на цырымоніі яе адкрыцця расказаў пра свой творчы шлях, адказаў на шматлікія пытанні, згадаў шмат якія старонкі сваёй біяграфіі.

Нарадзіўся мастак у пасёлку Краснасельскі Ваўкавыскага раёна, а з 20-гадовага ўзросту (з 1958 года) ён стала жыве ў сталіцы Латвіі — горадзе Рыга. Мастак удзельнічаў у 76 рэспубліканскіх і міжнародных выставах, жывапісныя і графічныя творы мастака знаходзяцца ў музеях і прыватных зборах Латвіі, Беларусі, Расіі, Ізраіля, Румыніі, Чэхіі, Францыі, Канады, ЗША.

Шматгранная творчасць мастака не засталася па-за ўвагай сусветнай грамадскасці. Імя Вячкі Целеша ўнесена ў каталог "Сусветны экслібрыс", у міжнародны каталог "Мініяцюрная графіка і экслібрыс" (Пекін), у 80-томную "Сусветную энцыклапедыю мастакоў усіх часоў і народаў".

Вядомы Вячка Целеш у Беларусі ды Латвіі і як краязнаўца, філакартыст. Дастаткова згадаць асобныя яго кнігі: "Гарады Беларусі на старых паштоўках" (2000 г.), "Мінск на старых паштоўках" (1984 г.), "Рыга на старых паштоўках" (1991 г.).

Наш зямляк — член Саюза мастакоў Латвіі і Саюза мастакоў Беларусі. У 2006 годзе ён узнагароджаны вышэйшай узнагародай Латвійскай рэспублікі — Ордэнам Трох Зорак.

Лявон ЦЕЛЕШ,
г. Дзяржынск

На здымку: Вячка Целеш сярод арганізатараў і наведвальнікаў выставы.

Фота аўтара

Фантазійныя паралелі

Мяккае і цвёрдае, цёплае і халоднае... Здаецца, наогул не гарманічныя яны між сабой, але спалучыліся ў адной прасторы — шкло і габелен.

У Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі адкрылася выстава "Паралельныя сусветы", дзе прадстаўлены работы трох мастакоў: Людмілы Пуцейкі, Ларысы Густавай (габелен) і Таццяны Малышавай (шкло). Такая "кампанія кантрастаў" зусім не выпадковасць, бо аўтаркі твораў — даўнія сяброўкі, аднакурсніцы, удзельніцы шматлікіх сумесных выстаў, творчых паездак і сустрэч, акрамя таго, іх майстэрні знаходзяцца пад адным дахам.

Работы Л. Пуцейкі і Л. Густавай уражваюць шматколернасцю, яркасцю, а некаторыя і памерам (габелен "Вясна" Л. Пуцейкі — самы вялікі на выставе). Асновай іх з'яўляюцца прыродныя матывы. Фантазія аўтараў здаецца бязмежнай. Тут можна знайсці купальскую легенду — "Папараць-кветку" — у інтэрпрэтацыі Людмілы Пуцейкі, "паслухаць" яе светла-жоўтую "Сімфонію святла"... Ларысу Густаву натхняе на творчасць і любы сэрцу горад Мінск: на выстаўцы прадстаўлены яе чатыры невялікія творы пад агульнай назвай "Мой Мінск". Калі хто не ведаў, што ўнутраны стан чалавека, а менавіта трывога, мае свой колер і нейкія абрысы, то можа ўбачыць гэта ў дыптыху Л. Густавай "Трывога".

На выставе прадстаўлена дзевяць габеленаў, створаных у розныя гады Л. Пуцейкай, і чатырнаццаць, пераважна мініяцюрных, — Л. Густавай.

Прыгажосць мяккіх, шарсцяных і паўшарсцяных палотнаў дапаўняюць зіхатлівыя грані шкла — работы Таццяны Малышавай. Уражвае іх палітра. Акрамя каляровага шкла, выкарыстоўваюцца бясколернае, сульфіднае і вітражнае. Пераважае змяшаная аўтарская тэхніка: выдзіманне, гута, налепы. У сваіх творах Т.Малышава не абмяжоўваецца адным матэрыялам, у спалучэнні са шклом выкарыстоўвае хроманікелевую фольгу, метал (прыкладам — кампазіцыя паводле ранніх рамантычных вершаў Янкі Купалы). Розныя аўтары, розныя кірункі творчасці, а аб'ядноўвае іх адно — любоў да карпатлівай ручной працы. Той, хто сам займаецца вырабам габелена ці шкларобствам альбо проста цікавіцца гэтымі відамі творчасці, абавязкова ацэніць унікальную дзейнасць мастакоў, чыя выстава працягнецца яшчэ тыдзень.

Таццяна КЛІМКОВІЧ
Фота Кастуся Дробава

Слава Шклова

Пра слаўную гісторыю Шклова нямала было напісана і сказана летась, калі гэтае ўтульнае і самабытнае мястэчка, што на Магілёўшчыне, прымала ў сябе шматлікіх гасцей Дня беларускага пісьменства. І вось адна з найбольш яскравых старонак шклоўскай мінуўшчыны адлюстравалася ў дакументальным фільме.

Прэзентацыя стужкі "Шклоўскі афорт" адбылася ў сталічным Доме кіно. Гэта новая рэжысёрская работа лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі Юрыя Цвяткова, што вельмі знамянальна для творчага чалавека, які нямала гадоў аддаў дзяржаўнай і грамадскай працы. Далёка не ўсе гледачы маладзейшага пакалення знаёмыя са старонкамі яго кінематаграфічнай біяграфіі: Ю. Цвяткоў пасля заканчэння ВГІКа ў пачатку 1960-х дэбютаваў на "Беларусьфільме" як сааператар-пастаноўшчык кароткаметражкі "Мост", потым працаваў над самымі рознымі карцінамі. Ён вылучыўся як рэжысёр-дакументаліст і за стварэнне цыкла гісторыка-рэвалюцыйных фільмаў ("Гісторыя адной тэлеграмы", "Чарвякову... тэрмінова... Ленін" ды інш.) у 1986-м атрымаў Дзяржаўную прэмію БССР. Апроч таго, Ю. Цвяткоў ставіў мастацкія фільмы, сярод якіх "Вясновая казка", "Пасля кірмашу", "Ясь і Яніна", "Марынка, Янка і таямніцы каралеўскага замка".

"Шклоўскі афорт" распавядае пра той перыяд канца XVIII ст., калі ўключаны ў склад Расійскай імперыі, пазбаўлены магдэбургскага права гарадок быў падараваны Кацярынай II яе адстаўному фаварыту генералу Зорычу. У гады яго кіравання мястэчка перажыло сапраўдны рэнесанс. Тут з'явіліся верф і гарбарня, канатная, шаўковая, ветразевая фарбрыкі, наладзілася вінаробства. Адкрылася вайсковае вучылішча. Пры сядзібе быў створаны тэатр, які набыў еўрапейскую славу: на спектаклі балетнай трупы Зорыча з'язджаліся прыхільнікі Тэрпсіхоры з Пецярбурга, Масквы, Варшавы, Вены. Для беларусаў дарагі той факт, што 14 з мясцовых прыгонных артыстак паступілі ў распараджэнне дырэкцыі імператарскіх тэатраў, а былыя "шклоўскія карыфейкі", як тады называлі першых салістак Пелагею ды Кацярыну Азарычавых, зазіхацелі зоркамі на сцэнах Пецярбурга і Масквы. (Дарэчы сказаць, у фільме браў удзел спадкаемца школы пецярбургскага балета, мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага тэатра балета Беларусі Валянцін Елізар'еў).

Асоба генерала-князя Зорыча, як сведчыць гісторыя, была яркая і неадназначная. Але яго дзейнасць у Шклове паспрыяла нараджэнню і развіццю шэрага добрых традыцый. Таму невыпадкова і заслужана пастаўлены летась у горадзе помнік шклоўскаму мецэнату Сямёну Зорычу. І радуе, што да слаўнай старонкі айчыннай гісторыі і мастацкага жыцця, звязанай з яго імем, далучыліся беларускія кінадакументалісты.

Лана ІВАНОВА

На здымку: помнік графу Зорычу ў Шклове.

Фота Віктара Кавалёва

Слова трымаў зямляк

Цікавая сустрэча адбылася зусім нядаўна ў Буда-Кашалёўскай цэнтральнай раённай бібліятэцы. Да нас у госці завітаў наш добра знаёмы і паважаны зямляк, пісьменнік Анатоль Зэкаў. Адпачываючы на сваёй малой радзіме ў вёсцы Патапаўка, Анатоль Мікалаевіч наведаў раённую бібліятэку, каб яшчэ раз сустрэцца з чытачамі, пацікавіцца навінамі, расказаць пра сябе. Сустрэча адбылася якраз у час правядзення раённай нарады работнікаў бібліятэк.

У сваім выступленні перад бібліятэкарамі Анатоль Мікалаевіч не толькі распавядаў пра свой жыццёвы і творчы шлях, але і гаварыў пра набыткі часопіса "Полымя", які заўсёды рады вітаць і сапраўдных творцаў, і пачаткоўцаў.

Прысутныя з задавальненнем і захапленнем слухалі яго цудоўныя вершы, пародыі, гумарэскі. Удзельнікі сустрэчы не змаглі ўтрымацца ад пытанняў, на якія Анатоль Мікалаевіч адказваў шчыра і з гумарам.

У літаратурнай гасцёўні "Натхненне", якая дзейнічае пры бібліятэцы, Анатоль Зэкаў і гомельскія пісьменнікі Ганна Атрошчанка і Лідзія Возісава сустрэліся з мясцовымі паэтамі-пачаткоўцамі.

Ала ПЕВЕНЬ,
загадчык аддзела бібліятэчнай рэкламы і маркетынгу

Сяброўства ўзнаўляецца

Кніга Георгія Марчука "Голас і слова", перакладзеная на таджыкскую мову, выйшла ў выдавецтве "Адіб" (Душанбе). Паказальна, што выпуск кнігі ажыццёўлены пад рэдакцыяй вядомага таджыкскага празаіка і драматурга, даўняга сябра беларускай літаратуры Ато Хамдама. Пераклад зрабіў І. Косімзада. Дарэчы, названае выдавецтва плануе выпусціць у свет зборнік апавяданняў беларускіх пісьменнікаў.

Трэба адзначыць, што творы Г. Марчука раней перакладаліся на ўкраінскую, македонскую, рускую, літоўскую, казахскую мовы.

Марыя РУДОВІЧ

Годам літаратуры і чытання аб'яўлены 2008-ы ў Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Гэтае рашэнне падпісалі Прэзідэнты дзевяці краін. У тым ліку, і Беларусь. На сумесным пасяджэнні Савета па гуманітарным супрацоўніцтве дзяржаў-удзельніц СНД у лютым гэтага года ўхвалены Прыкладны план асноўных мерапрыемстваў.

У СНД — Год літаратуры і чытання

Узаемадзеянне краін СНД у галіне літаратуры і кнігавыдання, іх імкненне да больш цесных культурных стасункаў заўважна актывізавалася апошнім часам. Садзейнічала гэтаму тое, што кіраўнікі дзяржаў СНД, вызначылі гуманітарную сферу адным з прыярытэтных напрамкаў супрацоўніцтва.

Як вядома, яшчэ ў маі 2005 года ў Маскве была прынятая дэкларацыя аб гуманітарным супрацоўніцтве, а ў жніўні таго ж года ў Казані падпісана адпаведнае пагадненне. Створаны Савет па гуманітарным супрацоўніцтве і — што не менш важна — заснаваны Міждзяржаўны фонд, які мусіць забяспечваць сферу рэсурсамі, спансіраваць памкненні да агульначалавечых прыярытэтаў. Праходзяць форумы творчай і навуковай інтэлігенцыі дзяржаў-удзельніц СНД, дзе досыць плённа працуе палата "Літаратура і кнігавыданне".

У імкненні да аднаўлення культурных ды літаратурных сувязяў кансалідуюцца існуючыя Саюзы пісьменнікаў Расіі, Беларусі, іншых дзяржаў Садружнасці. Створана Міжнароднае супольніцтва пісьменніцкіх саюзаў, у якім удзельнічаюць 10 краін СНД. І ўсе ўдзельнікі супольніцтва прызнаюць неабходным замацаванне праз літаратуру вышэйшых духоўных і маральных каштоўнасцяў, разглядаюць кнігу абавязковай умовай як агульнай адукацыі, так і ўсебаковага развіцця чалавека. Менавіта з улікам гэтага прапануецца садзейнічаць прапагандзе чытання ў сваіх дзяржавах, распрацоўцы і прыняццю на дзяржаўным узроўні нацыянальных праграм падтрымкі чытання.

Зыходзячы менавіта з неабходнасці аднаўлення ролі чытання ў нашых постсавецкіх краінах, а таксама з улікам адзначаемых у 2008 годзе юбілейных дат — 1150-годдзя заснавальніка таджыцка-персідскай літаратуры А.Рудакі, 100-годдзя знанага армянскага пісьменніка В.Сараяна і 100-годдзя вядомага азербайджанскага пісьменніка М. Мушвіга — падтрымана прапанова Рэспублікі Таджыкістан і зварот II Форуму творчай і навуковай інтэлігенцыі дзяржаў-удзельніц СНД, іншых арганізацый аб аб'яўленні 2008 года Годам літаратуры і чытання ў СНД.

Мерапрыемствы мусяць быць не другараднымі. Многае ў шэрагу запланаванага гарантавана прыцягне ўвагу грамадскасці. У праграме Года літаратуры і чытання ў СНД каля двух дзесяткаў буйных праектаў, сярод якіх — правядзенне V Міжнароднага конкурсу "Мастацтва кнігі", стварэнне фундаментальнай электроннай бібліятэкі "Эпас і літаратура народаў Еўразіі", правядзенне Другога форуму перакладчыкаў краін СНД у Ерэване, падтрымка выдання і перавыдання айчыннай класічнай літаратуры (уключаючы мастацкую, філасофскую і інш. літаратуру), падтрымка твораў, прысвечаных агульнай Перамозе ў Вялікай Айчыннай вайне.

Асобная важкая тэма Года літаратуры і чытання — гэта ўдасканаленне архіўнай і бібліятэчнай справы, супрацоўніцтва на базе новых інфармацыйных тэхналогій. Адначасова мяркуецца надаць новыя імпульсы развіццю кніжнага рынку, кнігаабмену і кнігавыдання. Каторы год рашэннем гэтых праблем заклапочаны створаны ў рамках СНД Міждзяржаўны савет па супрацоўніцтве ў галіне перыядычнага друку, кнігавыдання і паліграфіі.

Вельмі неабходная сёння і падтрымка новых імёнаў у нацыянальнай прозе, паэзіі, драматургіі. Таму плануецца заснаваць спецыяльныя прэміі ў галіне літаратуры для маладых пісьменнікаў і перакладчыкаў. У верасні будуць падведзены вынікі творчага спаборніцтва на атрыманне прэміі "Садружнасць дэбютаў" у галіне паэзіі для маладых літаратараў нашых краін. Разам з падтрымкай часопіса "Дружба народов" плануецца выпуск новых спецыялізаваных выданняў, дзе б мелі магчымасць друкавацца сучасныя аўтары.

У серыі "Бібліятэка часопіса "Дружба народов" запланавана выданне 6 кніг серыі "Бібліятэчка аўтараў СНД". І — выданне казак народаў СНД. Гэтым годам даецца старт выдавецкаму праекту "Скрыжаванні культур", які будуць ажыццяўляць літаратары Расійскай Федэрацыі і чатырох краін СНД — пры непасрэдным удзеле і выкарыстанні ў працы фондаў Усерасійскай дзяржаўнай бібліятэкі замежнай літаратуры імя М.Рудаміна. Распачнецца першы этап праекта, прымеркаваны да III Форуму творчай і навуковай інтэлігенцыі "Класіка літаратур СНД", які пройдзе ў Душанбе сёлета ў верасні. Садзейнічаць узаемным кантактам пісьменнікаў краін СНД павінен таксама II Форум перакладчыкаў, які адбудзецца сёлета ў кастрычніку ў Ерэване.

Многія балючыя праблемы творцаў і магчымасці іх вырашэння закладзеныя ў доўгатэрміновую міждзяржаўную навукова-даследчую праграму "Сацыяльназначная кніга ў краінах СНД". У Беларусі такая кніга мае дзяржаўную падтрымку. Мяркуецца праводзіць вывучэнне чытацкага і пакупніцкага попыту, праводзіць манітарынг кніжнага рынку, вывучаць і ўдасканальваць даведачна-інфармацыйнае і рэкламна-прапагандысцкае забеспячэнне выдавецкіх і кнігагандлёвых працэсаў, выяўляць і ўкараняць найбольш пазітыўныя і эфектыўныя метады грамадскага і дзяржаўнага ўздзеяння на сучасную кніжную справу.

Ірына ТУЛУПАВА

Ён адкрыў Еўропе казахаў

Гады ссылкі ўраджэнца Нясвіжа Адольфа Янушкевіча ператварыліся ў гады плённай працы

Імя і справы Фелікса Янушкевіча добра вядомы ў Казахстане. Яго "Дзённікі і лісты з падарожжа па казахскіх стэпах" у перакладзе на рускую мову Фаіны Сцякловай выдадзены ў 1966 годзе ў Алма-Аце. Потым былі пераклады на мову казахскую. Былі мастацкія творы і даследаванні пра яго, але як пра польскага падарожніка і пісьменніка — мабыць, на той падставе, што "Дзённікі і лісты" Ф. Янушкевіча напісаны па-польску, бо па-руску ці, тым больш, па-беларуску яны не маглі быць тады надрукаваны.

Адольф Янушкевіч нарадзіўся 9 чэрвеня 1803 года ў Нясвіжы ў сям'і дробнага шляхціца. Потым гэтая сям'я ўзяла ў арэнду фальварак Вусава (Усава) на Капыльшчыне. Сабраўшы крыху грошай, Янушкевічы купілі ўласны фальварак Дзягільня каля Койданава (цяпер Дзяржынск).

З Дзягільні Адольф накіраваўся на вучобу на філалагічны факультэт славутага на беларуска-літоўскіх землях Віленскага універсітэта. Тады ж на старонках часопіса "Дзённік віленьскі" з'явіўся яго першы вершаваны твор — сентыментальная "дума" "Мелітон і Эвеліна". Юнак зблізіўся з членамі тайных студэнцкіх згуртаванняў філаматаў і філарэтаў, пазнаёміўся з Адамам Міцкевічам, які потым вывеў Янушкевіча ў трэцяй частцы сваёй паэмы "Дзяды" ў вобразе адважнага змагара Фелікса. Герой вяшчуе, што ў царскай Расіі ўсіх патрыётаў чакаюць "Сібір, казематы ды турмы".

Неўзабаве на такі ж змагарны і пакутніцкі шлях уступіў і сам Янушкевіч. Скончыўшы універсітэт, ён накіраваўся да сваіх украінскіх сваякоў і застаўся там працаваць. У 1830 годзе падарожнічаў па Еўропе, у Дрэздэне сустрэўся з Міцкевічам і Гётэ. Пачуўшы пра пачатак паўстання 1830 года, вярнуўся назад, стаў адным з кіраўнікоў "Легіі Літвы, Валыні, Падоліі і Украіны" — арганізацыі, якая ў многім засноўвалася па тых жа прынцыпах, што і дзекабрысты. У першым жа баі мужны падпаручнік атрымаў сем ран, непрытомны зваліўся з каня і трапіў у палон. У час допытаў у кіеўскай цытадэлі не папрасіў літасці, як яму прапаноўвалі, а сказаў, што ўдзельнічаў у паўстанні "па перакананні". Суд пад старшынствам фельдмаршала Сакена прыгаварыў Янушкевіча да пажыццёвай ссылкі ў Сібір, канфіскацыі ўсёй маёмасці і пазбаўлення шляхецкага звання.

Ссылку наш суайчыннік адбываў у Табольску і Ішыме. Там жа пачаў цікавіцца побытам вандроўных казахаў, якіх называў па тагачасным звычаі "кіргізамі", іх мовай і фальклорам. У 1846 годзе здзейсніў працяглае падарожжа па казахскіх стэпах.

Свае ўражанні Адольф Янушкевіч занатоўваў у "Падарожны дзённік". Непісьменных "кіргізаў" аўтар, насуперак тагачасным расавым забабонам, ставіў упоравень з народамі Еўропы. У доказ таму можна прывесці мноства фактаў. Напрыклад, паслухаўшы выступленні спаборніцтвы народных акынаў Арынбая і Цюбека, Янушкевіч у лісце да паэта Г. Зялінскага ўсклікаў: "Няўжо гэта дзікія варвары? Няўжо гэта народ, які назаўжды пазбаўлены лепшай будучыні, чым вечная пастушыная нішчымнасць?.. О, не! Народ, які надзелены такімі здольнасцямі, не можа заставаццца чужым цывілізацыі: дух яе калі-небудзь пранікне ў кіргізскія пустыні, распаліць тут іскру святла, і прыйдзе час, калі сённяшні вандроўнік зойме пачэснае месца сярод народаў, што цяпер глядзяць на яго напышліва, бы вышэйшыя касты Індыі на няшчасных парыяў".

Самыя ўзнёслыя і сардэчныя словы Янушкевіч адрасаваў дасведчанаму і справядліваму Абаю Кунанбаеву — бацьку славутага казахскага песняра Абая, па прыкладзе якога ссыльны дапамагаў качэўнікам. Янушкевіч сам лячыў казахаў, хворых на ліхаманку, мірыў і аб'ядноўваў варожыя плямёны, сумленна вёў ускладнёны перапіс вандроўнага народа. Казахі палюбілі нашага земляка, лічылі яго "сваім". "Відаць, — пісаў ён, — я пакрысе ператвараюся ў кіргіза, і юрта становіцца для мяне звычайным жытлом".

З уступленнем на царскі трон Аляксандра II нарэшце прыйшло памілаванне. Янушкевіч вярнуўся да сваякоў у Дзягільню, дзе і памёр, знясілены, 19 чэрвеня 1857 года. Пасмяротна прыйшла да яго еўрапейская вядомасць. У 1861 годзе ў Парыжы былі выдадзены яго лісты і дзённікавыя запісы. У 1875 годзе іх перавыдалі ў Берліне. Дзякуючы дзягільненскаму рэвалюцыянеру і вучонаму, падарожніку і пісьменніку ў Еўропе сталі ведаць пра казахаў.

Памяць пра Адольфа Янушкевіча аднаўляецца на яго радзіме. Мая маці, літаратар Ганна Матусэвіч, пераклала на беларускую мову яго кнігу "Жыццяпіс і лісты з кіргізскіх стэпаў", якая цяпер рыхтуецца да друку дзякуючы падтрымцы Польскага інстытута ў Мінску. Ля Дзягільні было знойдзена сямейнае пахаванне Янушкевічаў. Супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі Мікола Крывальцэвіч правёў там археалагічныя даследаванні.

Сёлета спаўняецца 205 год з дня нараджэння Адольфа Янушкевіча. Яму была прысвечана вечарына, якая прайшла ў Доме-музеі Валенція Ваньковіча ў Мінску. На ёй дэкламаваліся ўрыўкі з перакладу яго твораў. Пісьменнік Кастусь Цвірка гаварыў пра сувязі Адольфа Янушкевіча з Адамам Міцкевічам. Гісторык Вольга Гарбачова ахарактарызавала паўстанне 1830 — 1831 гадоў. Гучалі песні тых часоў. Прайшоў таксама юбілейны вечар у Дзяржынску, упарадкаваны могілкі ў Дзягільні.

Вераніка МАТУСЭВІЧ

ВІНШУЕМ

з **75**-годдзем **Гублера** Навума Якаўлевіча, беларускага празаіка.

з **70**-годдзем **Шабаліна** Аляксандра Андрэевіча, беларускага публіцыста, празаіка.

з **60**-годдзем **Аўруціна** Анатоля Юр'евіча, паэта, крытыка, перакладчыка.

Юбілейны каляндар

180 гадоў **Гараўскаму** Іпаліту Гіларыевічу, беларускаму мастаку-пейзажысту.

180 гадоў **Малышэўскаму** Івану Ігнатавічу, пісьменніку, гісторыку царквы, славяназнаўцу.

145 гадоў **Краснянскаму** Уладзіміру Гаўрылавічу, беларускаму краязнаўцу, педагогу.

120 гадоў **Вазнясенскаму** Аляксандру Мікалаевічу, рускаму і беларускаму літаратуразнаўцу.

110 гадоў **Кобецу** Рыгору Якаўлевічу, беларускаму драматургу, празаіку.

110 гадоў **Сямашку** Сцяпану Пятровічу, беларускаму празаіку.

100 гадоў **Лявоннаму** Юрку (Юркевічу Леаніду Мікалаевічу), беларускаму паэту.

95 гадоў **Вайтовіч** Ніне Трафімаўне, беларускаму мовазнаўцу.

90 гадоў **Бярозкіну** Рыгору Саламонавічу, беларускаму крытыку.

90 гадоў **Грамовічу** Івану Іванавічу, беларускаму празаіку.

70 гадоў **Машкову** Уладзіміру Георгіевічу, беларускаму празаіку.

Не адно дзесяцігоддзе шчыруе Леанід Левановіч, апрацоўваючы празаічную дзялянку, стварыў сотні твораў, выдаў дзесяткі кніг. Імя празаіка не патрабуе асаблівага прадстаўлення. Леанід Кірэевіч, пэўна, змог ужо выхаваць і свайго чытача. І вось калектыў Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа прапанаваў, а Міністэрства культуры вылучыла цыкл раманаў Леаніда Левановіча "Шчыглы", "Паводка сярод зімы", "Дзікая ружа" і "Сіняе лета" на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь. Усе чатыры раманы выходзілі ў розныя гады асобнымі кніжкамі, паводле першых двух на Беларускім радыё ставіліся радыёспектаклі.

На атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь

Балючыя кропкі рэчаіснасці

Месцы спляцення нервовых валокнаў — біялагічна актыўныя кропкі, уздзейнічаеш на іх — рэагуе ўвесь арганізм. Аналагічныя кропкі можна знайсці і ў грамадстве, у самой гісторыі — гэта не адназначныя перыяды: рэвалюцыя, калектывізацыя, вайна, рэпрэсіі, культ асобы... Ёсць кропкі найвышэйшага напружання, паваротныя пункты пуцявінь-долі і ў чалавечым жыцці. Зноў і зноў вяртаемся мы да гэтых балючых скрыжаванняў, ці ў роздуме над асабістым жыццём, ці ў асэнсаванні шляхоў радзімы. Справа пісьменніка — выявіць у мастацкім творы звышактыўныя кропкі жыцця, і праз мастацкія вобразы ўздзейнічаць на іх. Адгукнецца душа чытача — ёсць плён ад пісьменніцкай працы. Такою мне ўяўляецца сацыяльная місія пісьменніка.

Тэмы сваіх раманаў Левановіч знаходзіць у супярэчнасцях жыцця, якія адначасова з'яўляюцца і рухавіком развіцця, своеасаблівымі актыўнымі кропкамі. Раманам "Сіняе лета" завяршаецца цыкл. Чытачы папярэдніх твораў зноў сустрэліся са знаёмымі героямі, яны памужнелі і пасталелі за дваццаць гадоў — такі храналагічны перыяд ахопліваюць чатыры раманы. Дваццаць гадоў — узрост пакалення. Вось і Андрэй Сахута з басаногага падшыванца ператварыўся ў пачэснага жаніха, прыязджае ў родную вёску для арганізацыі маладзёжнай фермы: "Дарагі Андрэй Мацвеевіч, — адказвае старшыня калгаса, — выходзіць так, што мы не жывём, а змагаемся. Ад самай рэвалюцыі... То з голадам, то з галечаю, то з ворагамі... А то самі сабе ствараем бар'еры, перашкоды розныя. І самі ж іх перамагаем... А на хвермах моладзі няма. Не загоніш туды..." Некалькі ключавых праблем акрэсліваецца двума-трыма сказамі звычайнай размовы, гэтыя праблемы скразной ніткай праходзяць праз узгаданыя творы Левановіча.

Непаразуменне паміж уладай і народам, чыноўнікамі і падначаленымі, адносіны паміж жанчынай і мужчынам, чалавекам і прыродай — усё гэта прыцягвае ўвагу аўтара. Праблемы — сутнасць жыцця бяскхітрасных вясковых людзей і высокіх дзяржаўных чыноўнікаў.

Дваццаць гадоў для чалавека — чвэрць адпушчанага часу, для гісторыі — не так і многа. Але ж якія гады! З сярэдзіны вайны да палёту ў космас. Акрэслены перыяд — адзін з самых супярэчлівых і складаных. Цяжкі і гераічны: перамога ў Айчыннай вайне, культ Сталіна, яго смерць, хрушчоўская адліга... Пасляваенная галеча, аднаўленне разбуранай гаспадаркі, адбудоўванне спаленых вёсак, дэмаграфічная праблема...

З Леанідам Кірэевічам я пазнаёміўся ў сярэдзіне дзевяностых. Пастановачны аддзел літаратурнай рэдакцыі беларускага радыё браў для працы два раманы Левановіча "Шчыглы" і "Паводка сярод зімы". Заслужаны артыст рэспублікі Ігар Лапцінскі задаволена паціраў рукі: "Цудоўныя раманы! Артысты будуць купацца ў матэрыяле". І не падмануўся. Творы сапраўды фактурныя, выпуклыя і рэльефныя, з выразна акрэсленымі і адметнымі характарамі галоўных герояў і персанажаў, хаця аўтар і не выштукоўваецца ў пошуку арыгінальных сюжэтных хадоў, — яго проза прыйшлася даспадобы не толькі чытачам, але і слухачам. Вельмі арганічна паклаліся раманы ў пракрустава ложа радыёспектакляў.

Унутраная культура народа выхоўваецца вёскай — усё навідавоку і сярод людзей. "Горад і вёска адрозніваюцца не памерамі, а наяўнасцю душы" (Освальд Шпенглер). І вось гэтая душа народа рознабакова адлюстроўваецца, прасвечвае праз характары галоўных герояў. Вёска моцная прыроднымі каранямі, жыве суладна касмічным рытмам, здаецца, і час запавольвае хаду, дамінуе архаічны ўклад і спрадвечныя традыцыі. Мегаполіс нівеліруе чалавека, нават угрызаецца ў прыродны ландшафт, адзін год падобны да другога, вёска ж — адметная кожнай парой: вясна, перш за ўсё, — час ворыва і сяўбы; лета — касавіца і догляд за палеткамі, восень — збор ураджаю, жніво; і толькі зіма, калі ўся прырода дранцвее ў анабіёзе, дае кароткачасовы перадых, але і ён поўніцца штодзённым клопатам: дагледзець жывёлу, прывезці са стога сена. Вось такое жыццё вёскі, пракавечнай Маці-Карміцелькі, паказвае Леанід Левановіч у сваіх раманах. Бацькі перадаюць дзецям набыты вопыт: як правільна пасадзіць дрэва, пакласці першую баразну ці скласці стог сена. Кожны вясковец пазнае ў Хатынічах абрысы сваёй малой радзімы.

Чытаюцца раманы лёгка: уцягваешся ў арбіту лёсаў галоўных герояў і жывеш разам з імі да апошняй старонкі. Магілёўшчына, рака Бесядзь, вёска Хатынічы. Аўтар наўмысна бярэ назву сугучную Хатыні, яго вёска — напалову спалена фашыстамі, пасля вызвалення, як і ўся краіна, паволі адбудоўвалася, залечвала раны, вярталася да мірнага ладу. Вакол гэтай вёскі, што стаіць на беразе Бесядзі, і вакол яе жыхароў закручваюцца лёсы герояў, яна быццам цэнтр сусвету, вось кручэння агульнага сюжэта. Жыццё цячэ, як няспынная рака: Андрэй Сахута з падлетка ператвараецца ў першага сакратара райкама камсамола, Нінка Вароніна (дачка паліцая) з нясмелай дзяўчынкі дарастае да жонкі і маці, а "ўпаўнаважаны з банцікам" (былы інструктар райкама) — цяпер паважаная Ніна Пракопаўна — сакратар ЦК.

Пісьменнік Левановіч належыць да пакалення, што згледзела вайну дзіцячымі вачыма, ваеннае ліхалецце назаўсёды высмаліла ў дзіцячай памяці вогненнае таўро. Таму вайна зноў і зноў вяртаецца на старонкі, то болем незагойных ран ветэранаў, то ўспамінамі пра тых, хто не вярнуўся, то смуткам жанчын, якія так і не дачакаліся сваіх дзяцей, мужоў ці жаніхоў. Можа падацца, у творах замнога бязногіх інвалідаў: і першы сакратар райкама Даўгалёў, і старшыня калгаса Казакевіч, і дзівак-ветэран Лебедзеў, які абсадзіў свой дом бярозавым гаем, усе яны — бязногія. Вялікую цану заплацілі за Перамогу. Родная вёска пісьменніка Клеявічы выправіла на вайну 112 воінаў, а дачакалася — усяго 19 чалавек. Акрамя тых, што не вярнуліся, — два с палавінаю мільёна бязногіх, бязрукіх, скалечаных інвалідаў па ўсёй краіне. Вось такая жахлівая статыстыка. Першы раман цыкла мае балючае і шчымлівае прысвячэнне: "Памяці маіх чатырох братоў..." Іх забрала вайна. Чатыры кнігі Л. Левановіча — свайго роду помнік сваім братам, а разам з імі — агульны помнік кожнаму чацвёртаму беларусу.

Дом будуецца на чатыры вуглы, арыентуецца па баках свету. Так і вёска Хатынічы, як сімвал сялянскага ўкладу, сімвал Беларусі — з'яўляецца пунктам адліку, сістэмай каардынат для ўсіх раманаў. Мяняецца зіма і лета, а вёска стаіць на скразняках часу, на скрыжаванні чалавечых лёсаў, убіраючы ў сябе сусвет. Цыкл раманаў Леаніда Левановіча "Шчыглы", "Паводка сярод зімы", "Дзікая ружа" і "Сіняе лета" — адметная з'ява беларускай літаратуры, тым больш, у час кліпавага мыслення і віртуальных рэальнасцяў.

Учарашні дзень — ужо гісторыя, нічога не выправіць, можна толькі іначай паглядзець на мінулыя падзеі, пераасэнсаваць іх, і такім чынам нешта змяніць у цяперашнім, паўплываць на заўтрашняе. У рамане "Шчыглы" апісваюцца падзеі 1943—45гг., а ў апошнім творы цыкла аўтар піша пра 1961 год: палёт першага чалавека ў космас. Цікава ўспрымаецца публіцыстычная ўстаўка пра першы атрад касманаўтаў. Маё пакаленне толькі нарадзілася, і падзеі, адноўленыя ў раманах, выконваюць ролю зарэзерваванай гістарычнай памяці. Гісторыю лепш вывучаць і спасцігаць не паводле падручнікаў, а праз жывое суперажыванне літаратурным героям, праз мастацкія творы. Вельмі асцярожна кранаецца Левановіч балючых кропак гісторыі, такіх як культ Сталіна і рэпрэсіі: "Колькі іх, трудзяг, дзесьці зямельку параць". Аўтар разумее: народ — вечная катэгорыя, сотні пакаленняў радзімічаў жылі на гэтай зямлі, перадалі яе ў спадчыну, і ўсё тое, што здзейснілася дзядамі і прадзедамі — сёння гісторыя, і якой бы яна ні была, нельга выракацца гэтай памяці. У дзень смерці Сталіна малады Андрэй Сахута ідзе пешкі ў райкам і ўступае ў камсамол, а ў шэсцьдзесят першым, калі прыехаў на чарговы пленум, становіцца сведкам рэакцыі на зруйнаванне помніка. Асоба Сталіна, асэнсаванне яго ролі — не простая тэма, з гэтым іменем ішлі ў атаку і перамагалі, з гэтым іменем звязана і іншае... Выкінулі з маўзалея, паказалі брудную бялізну ўсяму свету. Але шафёры ў знак пратэсту прыклейваюць партрэт генералісімуса на лабавое шкло і возяць па ўсёй краіне. Народ любіць парадак, паважае моцную ўладу. І нікуды не падзець той факт, што Іосіф Вісарыёнавіч прыняў краіну з сахою, а пакінуў развітую індустрыяльную дзяржаву, якая прайшла шлях ад сахі да касмічнай ракеты. Архітэктары "адлігі", а пазней — перабудовы добра ведалі, на якую кропку націснуць, каб разбалансаваць увесь дзяржаўны арганізм: халодная вайна і разбурэнне Савецкага Саюза пачаліся "развянчаннем культу". "Што гэта за ўлада, калі яе не паважаюць і не баяцца", — заўважае адзін з персанажаў рамана. Камунізм аказаўся фігавым лістком, але ж ніхто яшчэ не ведае дакладна, у якую прорву абрынуўся свет, адмовіўшыся ад светлай мары чалавецтва?

Раманы Л. Левановіча густа населены жывымі людзьмі розных пакаленняў і сацыяльнага статуса: сяляне і гарадскія жыхары, дзеці і падлеткі, старшыні калгасаў, настаўнікі і юрысты, медыкі і райкамаўскія работнікі, сукупна — увесь народ. Геаграфія падзей таксама шырокая, ад вёскі Хатынічы і да райцэнтра Лабанаўкі (Касцюковіч), і далей: Гомель, Магілёў, Мінск і Масква, — агульная геаграфія краіны.

Кампазіцыйна кожнаму раздзелу папярэднічаюць паведамленні хронікі БЕЛТА і ТАСС, арыгінальны ход аўтара, які дае сусветную падсветку падзеям, узбуйняе маштабнасць. Струменьчык інфармацыйнасці, гэты наватарскі прыём аўтара, становіцца вельмі дарэчы, бо рассоўвае межы кантэксту і дазваляе ўбачыць у агульным рэчышчы падзей асобныя факты.

З асаблівай любоўю выпісаны Левановічам вобраз жонкі франтавіка Кацярыны Сахуты. Ввосем дзяцей нарадзіла, засталося — трое. Хораша і па-мастацку апісаны маладыя жыхары спаленай вёскі — яны, як птушаняты ў гняздзе цёмнай зямлянкі. Сярод герояў раманаў участковы Уладзімір Бравусаў, фінагент Іван Сырадоеў, юрыст Васілёнак і дырэктар пачатковай школы Пётр Мамута — яны праходзяць праз усе творы. У кожнага свой характар, свая адметная гаворка. Аўтар не злоўжывае дыялектнымі слоўцамі, мова каларытная і вобразная, зразумелая любому чытачу.

Левановіч тонка адчувае прыроду, перадае захапленне сваіх герояў прыроднымі з'явамі. У раманах шмат цудоўных старонак, дзе па-майстэрску і з веданнем справы выпісаны сялянскія справы: сенакос і стагаванне, гонка мёду і догляд пчол. У рамане "Сіняе лета" створаны гімн лесу, спрадвечнай калысцы беларуса: "О, бацюхна Лес! Ты радуеш і грэеш беларуса спрадвеку. Ты ратаваў яго падчас бясконцых ваенных ліхалеццяў, саграваў у сырых зямлянках і куродымных хатах... Слава табе, бацюхна Лес! Жыві вечна насуперак усялякаму ліху. Бо ты — сімвал жыццястойкасці ўсяго жывога".

Мастацтва, перш за ўсё, — пачуццё меры. Далікатна, з неабходным тактам выпісаны інтымныя сцэны паміж Андрэем Сахутам і яго будучай жонкай Адай, або сцэна першай блізказці паміж Ксеняй і Пецькам. У апісанні інтымных сцэн вельмі цяжка не збіцца на пошласць, скаціцца ў вульгарнасць — аўтару ўдаецца вытрымаць пачуццё меры, і ў гэтым праяўляецца яго майстэрства.

Левановіч не спрошчвае і не прыхарошвае жыццё, намагаецца паказаць яго ва ўсіх ракурсах, піша і пра важныя грамадскія падзеі. Некалькі старонак прысвечана любімаму беларусамі Пятру Машэраву. Героі рамана з высокіх кабінетаў — не хадзячыя ідалы, кожны са сваімі недахопамі, могуць і чарку перакуліць, і ананімку "піснуць наверх".

Не абышоў аўтар і праблемы роднай мовы. У рамане "Дзікая ружа" цэлы раздзел прысвечаны апісанню пленума ЦК КПБ (чэрвень 1953 г.), матэрыялы якога былі строга засакрэчаныя аж да часоў перабудовы. Так ужо сталася, што ў беларусаў найбольш нацыянальна свядомымі, на вялікі жаль, становяцца прадстаўнікі нацыянальных меншасцяў: "Даўгалёў (першы сакратар райкама) часам думаў, што гэты яўрэй (загадчык аддзела культуры Бакуновіч адзін размаўляў па-беларуску) — большы беларус, чымся ён, Даўгалёў і калегі райкамаўцы.

У сваіх раманах аўтару ўдалося паказаць жыццястойкасць беларускай нацыі, працалюбства, дасціпнае пачуццё гумару. Адзін дзед Гылігор, мясцовы вырыянт "дзеда Шчукара", чаго варты са сваімі жартамі, якія перадаюцца з вуснаў у вусны і цытуюцца раённым і абласным начальствам. Слёзы і радасць заўсёды ідуць поруч. Асабліва гэта адчуваецца ў рамане "Паводка сярод зімы", у якім узнаўляюцца падзеі 1949 —1950 гг. Гэта паводка радасці насуперак халоднай вайне, нішчымніцы і холаду. Цяжка працавалі людзі, але як спявалі жанчыны, ідучы з сенажаці! Якія вечарынкі — з вечара да раніцы, — грымелі ў вясковым клубе пры газніцы. Адну з такіх вечарынак мы знаходзім у рамане.

Крануўшы ў балючую кропку, можна забіць чалавека, унесці сумяццю ў грамадства, разбурыць краіну, а можна і наадварот — вылечыць душу, паспрыяць аздараўленню. Але "ў прыроды свае законы і клопаты, свой парадак і свая завядзёнка: калі свяціць сонцу, калі ісці дажджу, калі падаць снегу". Такімі словамі заканчваецца апошні раман тэтралогіі.

Працягваецца і жыццё, па словах Леаніда Левановіча, неўзабаве павінны выйсці новыя раманы цыкла.

Анатоль КУДЛАСЕВІЧ

З глыбінь крыніц народных

Інстытут мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі выпусціў у свет дыялекталагічны зборнік "Народныя скарбы" з падзагалоўкам "Да 80-годдзя А. А. Крывіцкага", з імем якога непарыўна звязана развіццё беларускай дыялекталогіі пасляваеннага перыяду.

А адпрацаваў ён у гэтай галіне 55 гадоў — з 1952 па 2007 год, і стаў аўтарам двухсот навуковых прац. Ён прыняў актыўны ўдзел у стварэнні "Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы", за які разам з групай вучоных быў удастоены Дзяржаўнай прэміі СССР. Потым удзельнічаў у стварэнні капітальных прац "Хрэстаматыя па беларускай дыялекталогіі", "Нарысы па беларускай дыялекталогіі", "Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак". Шмат часу аддаў працы над пяцітомным "Лексічным атласам беларускіх народных гаворак". Адначасова працуе ў стварэнні буйнейшых міжнародных лінгвагеаграфічных праектаў — "Агульнаславянскага лінгвістычнага атласа" і "Лінгвістычнага атласа Еўропы". Выключная любоў да роднага слова адчуваецца ў яго працах "Сучасная беларуская літаратурная мова і народныя гаворкі", "Наша родная мова", "У рытме з развіццём мовы". З яго ўдзелам выйшлі выданні па вывучэнні народных гаворак: "Беларуская мова для небеларусаў", "Беларуская мова для тых, хто гаворыць па-руску", "Падручнік беларускай мовы для самаадукацыі", "Фанетыка беларускай мовы", "Практыкум па фанетыцы беларускай мовы" ды інш. Нямала ён зрабіў у галіне дыялектнай лексікаграфіі. Важным яго набыткам стаў пяцітомны "Тураўскі слоўнік", даведнікі дыялектнай лексікі "Жывёльны свет", "Раслінны свет", "Чалавек". Ідэя іх стварэння і распрацоўка планаў належыць А. Крывіцкаму. А вяршыняй яго дасягненняў у вывучэнні роднай мовы стала праца "Дыялекталогія беларускай мовы" (2003).

Ва ўступным артыкуле да выдадзенага зборніка адзначана, што "А. А. Крывіцкі — адзін з самых вядомых на сёння дыялектолагаў Беларусі, гонар і слава нацыянальнай дыялекталагічнай навукі". І далей падкрэсліваецца, што "гэта чалавек энцыклапедычнай дасведчанасці... папросту творчы чалавек, які любіць і ўмее захапляцца жыццём, яго радасцямі і дарыць, аддаваць свае веды, сваю шчаслівую любоў усім, з кім ідзе па жыцці ў працы, навукова-творчых пошуках і адкрыццях".

У першым раздзеле зборніка "З лексікі народных гаворак" падаюцца падборкі дыялектнай лексікі з розных рэгіёнаў рэспублікі. Так, мясцовыя назвы лекавых раслін запісаны на Стаўбцоўшчыне. Гэта разнастайныя словы ў семантычных, лексіка-граматычных, словаўтваральных адносінах: *багон* — багульнік, *дзяткі* — лопух, *душніца* — мята, *завалуха* — макрыца, *маташнік* — падбел. Цікавая лексіка пададзена з Любанскага раёна: *апешаць* — стаміцца ад работы, *замаладзь* — у маладыя гады, *коўцік* — глыток, *лапушыць* — прагна есці, *прывядзёнак* — пазашлюбнае дзіця, *удзвейгу* — у дзве столкі. Значная колькасць арыгінальных слоў запісана на Віцебшчыне, сярод іх *баслуй* — тупы, дурнаваты чалавек, *збродзіць* — знасіць, стаптаць, *каркалеснік* — блін з тварагом, *капцюшка* — лучына, *надкоснік* — шафер, *наўпрок* — насуперак. На Брэстчыне занатаваны лексемы *вушай* — чалавек з вялікімі вушамі, *дрывальнік* — хлеў для дроў, *карачун* — крываногі чалавек, *кацюбнік* — качарэжнік і інш.

Змешчана ў кнізе значная падборка мсціслаўскай лексікі рознага плана. Найбольш слоў, якія называюць асобу: *абарачываннік* — той, хто перакульвае, *абарот* (пеpан.) — пераварацень, *бондачка* — таўстуха, *загроба* — хапуга, *закустоўнік* — каханак, *падскрабанец* (іран.) — апошняе дзіця ў сям'і, *таптун* — няўмелы танцор, *шутавей* — разявака. Зафіксаваны зборныя назоўнікі: *ахламонія* — неарганізаваная кампанія, *бандзёж* — бандытызм. Асобныя назоўнікі называюць розныя віды дзеянняў: *вычышчанне* — выключэнне з калгаса, *блытыканне* — швэнданне, *падпужыванне* — палоханне. З даўніх часоў дайшоў назоўнік *хапун* — звычай у пэўны дзень хапаць дзяўчат для любоўных пацех. Ёсць у падборцы цікавыя прыметнікі: *вартовый* — добры, *дружный* — кампанейскі, *духавый* — араматны, *кавалерыстый* — ганарлівы, *камэдный* — дзівакаваты.

Далей у кнізе ідзе раздзел "Фразеалогія". На Гродзеншчыне зафіксаваны фразеалагічныя адзінкі *абы з рук вон* — вельмі нядбала (зрабіць), *авечка з мястэчка* — някемлівы, няўважлівы чалавек, *за дзень не абыдзеш* (іран.) — пра вельмі тоўстага, *з сядзячага ката* — нізкарослы, *як бык аціліцца* — невядома калі, ніколі. Сярод фразеалагізмаў Брэстчыны вылучаюцца *гультая жаніць* — лайдакаваць, *куры ноч разабралі* — пра летнія світанкі, *ні шэнь ні пень* — пра непаваротлівага чалавека, *як да неба* — вельмі далёка. На Віцебшчыне запісаны рознахарактарныя выслоўі: *бедны гаруе, што не кіруе, а багаты тужыць, што не служыць*; *з галавой не дагаварыўся — і да ног не сунься*; *матчыны рукі заўсягды мяккія*; *на пешага арла і сарока з колам*; *ну й мужыкі пайшлі: усемярых аднаго петуха біць будуць*; *шлюб пад плотам, вяселле потым*.

Асобны раздзел кнігі складаюць "Навуковыя даследаванні". Тут змешчаны артыкулы пра назвы народных свят у палескіх гаворках, пра паходжанне ў розных рэгіёнах назвы *коніка* (цвыркуна), пра пашырэнне назваў *хвоя* і *сасна*. Таксама цікавыя назіранні пра ўзнікненне дзеясловаў эмацыянальна-ацэначнага зместу, утварэнне ў дыялектнай мове ацэначных назваў асобы, зараджэнне беларускай тапанімічнай лексікаграфіі.

У апошнім раздзеле змешчаны звязныя тэксты беларускіх гаворак з Брэстчыны, Віцебшчыны, з Чэрвеньскага, Смалявіцкага, Любанскага раёнаў Міншчыны.

У заключэнне друкуецца складзеная А. Крывіцкім і В. Курцовай "Праграма па вывучэнню назваў працэсаў і дзеянняў у гаворках беларускай мовы". Гэта спецыяльны апытальнік для збіральнікаў духоўных скарбаў беларускага народа. Пытанні размеркаваны па пяці групах, якія ў сваю чаргу дзеляцца на шэраг падгруп. А ўсяго прапануецца адказаць прыкладна на 1400 пытанняў.

Адзначаючы ў кнізе ўсё станоўчае, нельга абысці славутае "на жаль". Ёсць у зборніку шэраг недакладнасцей. У некаторых выпадках заўважана розная падача трывання дзеясловаў у рэестры і ў прыкладзе. Так, дзеяслоў *адскокваць* незакончанага трывання, а ў прыкладзе іншы — *адскочыць*. Тое ж маем пры дзеяслове *прыдаваца*, у прыкладзе *нам прыдалося*. *Харашыці* (незак.), а ў прыкладзе *нахарашы* і г. д. *Нарэзацца* пазначаны *незак*. А гэта ж дзеяслоў закончанага трывання. *Паддацца* правільна пазначаны *зак*., а ў прыкладзе маем *паддаецца*.

Пры некалькіх дыялектных словах няма азначэння: *варыўшы*, *завязваца*, *каласаваць*, *сітро*, *склад*. У кнізе ў розных падборках значная колькасць устойлівых словазлучэнняў. У некаторых выпадках у гэты разрад залічаны звычайныя спалучэнні. Нічога устойлівага няма ў словах *жыць крэпка*, пра што гаворыць і тлумачэнне: жыць заможна, багата. Тое ж маем у *захацець піцькі* (захацець піць), *даваць патолю* (даваць вольнасць), *піпчыць у піпку* (курыць люльку), *стакан з рубцом* (шклянка ёмістасцю 250 грамаў). У асобных выпадках не вытрымана граматычная аднастайнасць рэестравага слова і яго тлумачэння. Так, назоўнік *бестыдок* раскрываецца прыметнікам бессаромны. Тое ж маем пры назоўніку *здохля* — вельмі худы, хваравіты. Прыметнік *вушаты*, наадварот, раскрываецца пры дапамозе назоўніка: чалавек з вялікімі вушамі. Назоўнік *мядзведзь* ілюструецца прыметнікам.

У артыкуле "Ткацтва Гродзенскай вобласці" сцвярджаецца, што матэрыял падаецца па алфавіце. А на справе алфавіт парушаны амаль па ўсім артыкуле. У канцы названы раёны і імёны інфарматараў. Затым назвы раёнаў паўтораны пасля імені кожнага інфарматара — 58 разоў. Навошта? Дарэчы, у найменнях інфарматараў безліч памылак.

У кнізе пададзены індэкс усёй лексікі, але ў яго не ўключаны ўстойлівыя словаспалучэнні. Шкада.

Як цяпер нярэдка здараецца, кніга выйшла без удзелу выдавецкіх работнікаў, што адбілася на элементарнай пісьменнасці: *варабей* (замест верабей) *верхал* (замест вэрхал), *узлесці* (замест узлезці), *вказванне* (прапуск ы), *шчароўная* (прапуск а), *небеленых* (замест нябеленых), *неяркі* (замест няяркі), *захадніх* (заходніх), *з'яўляюццам*, *аздначыць*, *паданне звестак* (падача). Безумоўна, выдавецкага рэдактара насцярожыла б уменне сягаць на паўвека наперад: асновы парадыгматычнай тэорыі распрацаваны "ў 60-х гадах нашага стагоддзя". Відаць "адсюль *выбягаюць* тры важныя характарыстыкі".

У пераліку дыялекталагічных выданняў чамусьці прапушчаны зборнік "Жывое слова" (1978). Няправільна названа адукацыя А. Крывіцкага: не настаўніцкі, а педагагічны інстытут ён закончыў. І не ў 1952 годзе, а на год раней.

Гэтыя недагляды крыху псуюць уражанне, але ў цэлым зборнік пакідае добрае адчуванне.

Георгій ЮРЧАНКА

Пазамежныя кантрасты беларускай літаратуры

У № 6 "Дружбы народов" за 2008 год змешчаны "Сюжеты белорусско-русского порубежья" Алега Ждана, аб'яднаныя агульнай назвай "Надо терпеть", і нізка версэтаў "С молнией в сердце" Алеся Разанава.

Тое, што творы абодвух аўтараў характарызуюць спецыфіку беларускага жыцця і менталітэту, не абмяжоўвае шырыні тэматыкі. Думаецца, менавіта яны былі абраныя для рускага чытача невыпадкова: героі А. Ждана паказальныя для ўсёй сённяшняй усходнеславянскай супольнасці; версэты А. Разанава (пераклад У. Казаравецкага), ужо добра вядомыя ў Беларусі, заглыбляюцца ў сутнасныя асновы быцця, складанасць і неадназначнасць шляху чалавека да свайго ўласнага "я". А. Разанаў прапаноўвае адшукаць па-за межамі рэальнасці слоў і рэчаў рэальнасць іншую — рэальнасць святла і цемры, фальшу і сапраўднасці. А. Ждан у самай складанай сітуацыі знаходзіць іранічны падтэкст, дэманструючы непераможнасць сцвярджальнага пачатку ў жыцці.

"Надо терпеть" (Сюжеты белорусско-русского порубежья) — гэта адна са шматлікіх публікацый А. Ждана ў часопісе "Дружба народов", таму пісьменнік ужо мае ў гэтым выданні пэўную рэпутацыю. (Трэба дадаць, што гэтыя "сюжэты" — частка даволі значнага цыкла апавяданняў, які цалкам будзе змешчаны ў № 5 часопіса "Всемирная литература" за 2008 год). Версэты А. Разанава выглядаюць нават на фоне надрукаванага ў чэрвеньскім, шостым нумары "Дружбы народов" даволі незвычайна. Арыгінальнасць жанру, адметнасць успрымання жыцця ілюструюць выключнасць аўтарскага стылю не толькі ў беларускай літаратуры. Як вядома, яго паэзія перакладалася, апроч рускай, на шмат якія іншыя еўрапейскія мовы.

Безумоўна, з'яўленне твораў беларускай літаратуры на старонках расійскага друку прыемна ўсцешвае, але ўсё-ткі не становіцца нечаканым. Перамога ж пісьменніцы-фантасткі Нікі Ракіцінай на фестывалі Еўрапейскага саюза навуковай фантастыкі "Еўракан-2008" стала сапраўдным сюрпрызам. Застаецца толькі скласці ўласнае меркаванне пра кнігу — раман "Ганітва", які прынёс пісьменніцы перамогу, каб зразумець, чым можа прывабіць сучаснага еўрапейскага чытача сучасны беларускі літаратар. Аднак пакуль важней само гэтае адчуванне, што ўсё-ткі ж — МОЖА.

Жана КАПУСТА

Федарэнка — мысліцель і мастак

Ніколі не пісала пра творчасць Андрэя Федарэнкі. Пра гэта пісалі іншыя, хаця мае творы Андрэй Міхайлавіч рэдагаваў многа разоў. А нядаўна прачытала яго апавяданне "У лесе" ("Маладосць" № 2, 2008г.) Вельмі закранула. Аўтар так глыбока, праніknёна напісаў, па сутнасці, пра ўсіх нас. Апавяданне ж, на першы погляд, лічы без сюжэта. Федарэнка, нібы не вельмі ўдумваючыся, забаўляючыся, настройвае чытача на просценькую гісторыю. Ну, паехаў чалавек па грыбы, назбіраў поўнае вядро, убачыў на ўскрайку лесу дзяўчыну. Заблукала, хоць заблукаць тут было проста немагчыма: людное месца. Стаіць, крычыць у роспачы і адчаі. На першы погляд, просценькая гісторыя — ды не вельмі. Гэтак жа мы, бывае, крычма крычым:"Куда идти в лесу?". І зусім не важна — у горадзе мы, у полі, у лесе: "Куда идти в лесу?". І як дакрычацца, дастукацца да другой душы, як знайсці ў другім чалавеку спагаду да сябе, самотнага, адзінокага, гаротнага, у цяжкую хвіліну сярод людскога лесу? Не дастукацца, не падступіцца — у героя апавядання па жыцці адно крэда: "Вы мяне ў гэта не ўблытвайце", "Мая хата з краю, нічога не знаю". Хваліўся, які ён круты псіхолаг: калісьці, дзеля адчэпу, кінуў сухія словы жанчыне ў адказ на яе прызнанне. А яна, даведзеная да адчаю, загнаная жыццёвымі абставінамі ў кут, на грані суіцыду, ухапілася за гэтыя абыякавыя яго словы "трэба жыць", як за саломінку тапелец — чужая душа падтрымала яе, гатовую вось праз хвіліну кінуцца ўніз галавой з моста на рэйкі. А ён з такімі жыццёвымі прынцыпамі: "мая хата..." ішоў па жыцці ўпэўнена, яму было так жыць спакойна, выгадна, ёмка. "Вы толькі мяне нікуды не ўблытвайце, не чапайце мяне, не турбуйце мяне сваімі турботамі". Выйшаў з лесу, адразу забыўшыся на нейкую ненармальную дзяўчыну, якая нема прасіла дапамогі, сеў на электрычку. Але акурат цяпер у гэтай электрычцы яму ўтульна не было. Яго так зацiснуў натоўп, што ні дыхнуць, ні выдыхнуць. Людзі "...шумныя, мокрыя, са сваімі вёдрамі, парасонамі, вудкамі, кошыкамі..." У вагоне паветра каменем навальваецца на грудзі, народ агрэсіўны штурхаецца, чапляецца, цісне... Ад духаты ў грыбніка раптам прыхапіла сэрца. Выйсці ў тамбур немагчыма, са страхам адчуў, што вось-вось з ім можа здарыцца самае страшнае. Перасільваючы сябе, ледзь вымавіў-папрасіў у хлопца, над якім стаяў: "Можна я сяду, мне кепска". Хлопец адагнуў навушнік, млява жуючы жвачку адказаў коратка: "Мне таксама". "Куда идти в лесу... Куда идти в лесу" — стукала ў скронях. І аўтарскае: "...куды ў гэтым лесе, у гэтым жыцці мы ідзём, каго, як малыя неразумныя дзеці, усё гукаем. Хто ж і калі нарэшце злітасцівіцца над намі і пакажа дарогу?.."

Здавалася б, ідзе час, людзі павінны духоўна ўдасканальвацца, зведаўшы войны, землятрусы, злы атам, павінны думаць пра сутнасць чалавека. Пра сваю душу і душы іншых. Ды не. Герой апавядання дваццаць гадоў назад хоць дзеля адчэпу кінуў гаротнай жанчыне пару слоў. А тут гэты хлопец з навушнікамі нават вочы заплюшчыў, каб не бачыць таго, каму кепска.

Яшчэ зусім нядаўна, калі жыла ў раённым цэнтры, хадзілі да мяне людзі, як на споведзь, як да таго, хто можа дапамагчы. А дапамагчы і тады, і цяпер я магу толькі парадай, калі яе просяць. А колькі ёсць людзей, якія могуць рэальна дапамагчы, але часцей за ўсё не робяць гэтага. Каб зразумець, як кепска чалавеку, які шукае дарогу з лесу, не трэба чакаць, як галоўны герой апавядання, крытычнага моманту ў сваім жыцці. Ведаеце дарогу з лесу — дапамажыце выйсці з яго таму, хто заблукаў.

Таіса СУПРАНОВІЧ

З нагоды новай кнігі

"Табе, Янка, трэба абавязкова пазнаёміцца з адным хлопцам. Яго завуць Міхась Казлоўскі, у нашым горадзе жыве. Ён вельмі добра ведае гісторыю, літаратуру, піша някепскія артыкулы і рэцэнзіі. З яго будзе толк", — сказаў мне падчас адной з сустрэч Генадзь Каханоўскі.

Даўно тое было, але гэтыя словы помняцца і цяпер. І як бы ганарыўся сёння Генадзь Каханоўскі сваім вучнем і паслядоўнікам, яго поспехамі ў адраджэнні роднай культуры.

Маё знаёмства з Міхасём Казлоўскім перарасло ў сяброўства. Мы часта выступаем разам у школах. І магу засведчыць, што яго з цікавасцю слухаюць школьнікі і настаўнікі.

Міхась Казлоўскі, безумоўна, асоба неардынарная і таленавітая. А яшчэ ён вельмі працаздольны.

Перада мною кніга яркага і самабытнага драматурга Івана Козела "Над хвалямі Серабранкі", дзе надрукаваны тры яго п'есы: "Папараць-кветка", "Над хвалямі Серабранкі" і "Краіна фарбаў". Падрыхтаваў тэксты гэтай кнігі і напісаў да яе прадмову Міхась Казлоўскі.

Калі "Папараць-кветка" і "Над хвалямі Серабранкі" добра вядомыя, то п'еса "Краіна фарбаў" дагэтуль нідзе не друкавалася, і Міхась Казлоўскі ўпершыню пазнаёміў з ёй чытачоў.

"Краіна фарбаў", як піша ў сваёй прадмове Міхась Казлоўскі, самы лепшы драматургічны твор з літаратурнай спадчыны Івана Козела, якую яшчэ чакае, хочацца ў гэта верыць, шчаслівае тэатральнае жыццё.

М. Казлоўскі таксама з'яўляецца ўкладальнікам кнігі "Я тут бачу свой край...". Кніга — пра літаратурную Маладзечаншчыну. Пачынаецца яна ўспамінамі Міхала Агінскага, вершамі Тамаша Зана, Янкі Купалы, Якуба Коласа, а таксама знаёміць чытача з творчасцю вядомых і маладых літаратараў. Яна ахоплівае значны пласт гісторыі і літаратурнага жыцця багатага на таленты краю.

А яшчэ Міхась Казлоўскі выдаў кнігі паэзіі Алы Клемянок "Яны не ведалі мяне", Ніла Гілевіча "Паланез Агінскага", Лідзіі Гардынец "Саламяны капялюшык", Віктара Шніпа "Інквізіцыя" і "Воўчы вецер", Людмілы Рублеўскай "Рыцарскія хронікі", кнігі прозы Яўгеніі Чаплінскай "Іванка", Кастуся Харашэвіча "Зведанае і перажытае", Уладзіміра Корзуна "Успамін і роздум".

Добра вядомы краязнавец, гісторык і публіцыст, Міхась Казлоўскі выдае яшчэ і часопіс "Куфэрак Віленшчыны". Публікацыі ў асноўным прысвячаюцца гісторыі, краязнаўству, фальклору, этнаграфіі, прапагандзе творчасці мясцовых пісьменнікаў, паэтаў і мастакоў. Ужо выйшла дванаццаць нумароў часопіса.

А крыху больш года таму прыхільнікі творчасці Міхася Казлоўскага дачакаліся і яго першай кніжкі "Галасы разбуджаных птушак". Мне і цяпер добра помняцца вобразныя і лаканічныя нарысы з гэтай кніжкі пра Пятра Іванавіча Бітэля, які ў сталінскіх лагерах пераклаў на беларускую мову паэму А. Міцкевіча "Пан Тадэвуш", пра гісторыка Міколу Іванавіча Ермаловіча і краязнаўцу, пісьменніка Генадзя Аляксандравіча Каханоўскага.

І вось я трымаю ў руках новую кнігу Міхася Казлоўскага "Нашчадак слаўных крывічоў", якая нядаўна выйшла ў мінскім выдавецтве "Кнігазбор". Расказваецца ў ёй пра жыццёвы і творчы шлях знанага ў Заходняй Беларусі грамадскага і палітычнага дзеяча Адольфа Клімовіча.

У першым раздзеле, які называецца "Сэрцу мілая, бацькоўская зямля", аўтар няспешна, але грунтоўна апавядае пра вёску Казаноўшчына Свянцянскага павета Віленскай губерні (цяпер гэта Астравецкі раён Гродзенскай вобласці), пра той далёкі час, дзе 20 красавіка 1900 года нарадзіўся Адольф Клімовіч. Цікава расказвае Міхась Казлоўскі і пра сустрэчу Адольфа Клімовіча з Янкам Купалам і Паўлінай Мядзёлкай, якія прыязджалі ў яго вёску на вечарынку, дзе быў паказаны ўрывак з п'есы "Паўлінка". Тады Адольф Клімовіч вучыўся ў вышэйшым пачатковым вучылішчы, яму было чатырнаццаць гадоў.

Адольф Клімовіч актыўна ўдзельнічаў у рабоце "Хаўрусу сваякоў", наладжваў святкаванне Калядаў, вёў заняткі ў беларускай школе, распаўсюджваў газеты і часопісы сярод сялян, ездзіў у Вільню на сустрэчы з дзеячамі-адраджэнцамі.

Пасля заканчэння Віленскай беларускай гімназіі ён едзе ў Прагу і паступае ў Чэшскі тэхналагічны універсітэт. Тут, у Празе, у кастрычніку 1925 года адбылася падзея, якую Адольф Клімовіч доўга чакаў. Ён другі раз у жыцці пабачыў Янку Купалу. Як напамінак пра гэту сустрэчу ў яго засталася падараная народным песняром кніга "Спадчына".

Вярнуўшыся ў Вільню, Адольф Клімовіч вельмі хутка зрабіўся даволі вядомым і аўтарытэтным дзеячам незалежніцкага напрамку. У той час ён уваходзіў у склад кіраўніцтва Беларускай хрысціянскай дэмакратыі і Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры. Яго артыкулы з'яўляліся на старонках "Беларускай крыніцы", "Шляху моладзі" і іншых выданняў.

Але асабліва плённым выдаўся для Адольфа Клімовіча 1932 год, калі выйшлі тры ягоныя кнігі: "І культура і палітыка", "Лекі на здзекі", "Земляробская чытанка" і быў заснаваны часопіс "Самапомач", дзе Клімовіч стаў рэдактарам і выдаўцом.

Міхась Казлоўскі падкрэслівае, што асаблівай папулярнасцю карысталася "Земляробская чытанка" — зборнік артыкулаў пра гаспадарку польную, хатнюю і жывёлагадоўчую, аб рыбацтве, пчалярстве, кааперацыі, прафесійнай асвеце і палітыцы. Матэрыял у той кнізе быў размешчаны паводле пор года і мог служыць як дарадца для дробнага гаспадара-земляроба. Менавіта пра яе, у інтэрв'ю "Белорусской деловой газете" Адам Мальдзіс сказаў: "Была б мая воля — перавыдаў бы цяпер і аддаў бы ў рукі кожнаму гаспадару: фермеру, старшыні калгаса і проста таму, хто мае прысядзібны ўчастак".

Двойчы Адольфа Клімовіча арыштоўвалі. Апошні раз ў жніўні 1952 года. Ён прайшоў усе кругі сталінскага рэжыму.

24 лістапада 1970 года Адольф Клімовіч, змагар за лепшую будучыню сваёй Бацькаўшчыны, памёр, і быў пахаваны на сваёй радзіме.

Вельмі ўдала дапаўняюць кнігу ілюстрацыі, а таксама фотаздымкі таго часу.

У кнізе ёсць і невялічкія лірычныя адступленні, але нідзе не сустрэнеш пустаслоўя і простай гаварыльні, якія заглушылі б галоўную ідэю твора, зрабілі яго нечытэльным і рыхлым. Няма ў творы і лішніх каструбаватых сказаў, якія псуюць стыль.

Адным словам, усім тым, хто цікавіцца гісторыяй і любіць свой край, кніга Міхася Казлоўскага "Нашчадак слаўных крывічоў" прыйдзецца даспадобы.

Янка ГАЛУБОВІЧ

Валадарства святла



Новы цыкл вершаў Дануты Бічэль "Ойча наш..." мае такую знаёмую і — разам з тым — такую нечаканую назву... Знаёмую, таму што кожны з нас, нават самы паслядоўны атэіст, хаця б раз у жыцці гэтыя словы чуў. Нечаканую, таму што наша літаратура пакрысе пачынае забывацца на такія словы і такія тэмы.

А тэма сапраўды рызыкоўная, як і кожная вечная, не раз апісаная тэма. Такія кнігі заўсёды бярэш у рукі з нейкай перасцярогай, бояззю расчаравацца, сустрэўшы нешта банальнае і неглыбокае. Усё-ткі Бог, каханне і Радзіма — гэта рэчы, якія маюць у нашай свядомасці асаблівы статус, рэчы надзвычай інтымныя для кожнага асобнага чалавека.

Вось з такой перасцярогай разгортвала і я кнігу "Ойча наш". Праўда, давер да таленту Дануты Бічэль гэтую перасцярогу прыглушаў. Бывае так, што некаторыя творы найлепей чытаць у нейкім адметным, асаблівым настроі — блізкім настрою аўтара, інакш тое, што ён хацеў сказаць, застанецца незразумелым, непачутым і нават неістотным. Спачатку мне падалося, што і "Ойча наш" — менавіта з такіх кніг. Але я памылілася: для таго, каб чытаць гэтую кнігу не трэба чакаць настрою, бо паэтычны голас Дануты Бічэль у гэтых вершах настолькі моцны, што стварае адпаведны настрой з першых радкоў:

Ты мяне, зерне, пасеяў тут —
я тут расту...
Ойча наш, калі я перайду
праз мяжу ў прастору, у прастату,
праз генетычны код роду
з-пад споду —
ад слова, якое адбілася ценем,
да Слова, якое сталася Целам,
магчыма, так праясніцца
таямніца жывога жыцця —
я — Тваё, Ойча, узлюблёнае дзіця...

Цыкл вершаў "Ойча наш" — надзвычай цэласны, арганічны твор. Кожны з дзевяці вершаў мае назву паводле радка з адпаведнай малітвы, і таму кожны наступны чытаецца як працяг папярэдняга, аднак пры гэтым паэтка не паўтараецца, вобразная палітра гарманічная, але не аднастайная. Часта здараецца так, што аўтар, надаючы адмысловае значэнне структуры вершаванага зборніка, становіцца яго закладнікам, міжвольна ахвяруючы сэнсам на карысць кампазіцыі. Вядома, і Данута Бічэль у гэтым цыкле вершаў мусіла падпарадкоўвацца кампазіцыйнай прадуманасці, бо, зрэшты, невядома нават, што з'явілася спачатку — вершы ці задума кампазіцыі. Аднак у кнізе ўсё настолькі арганічна, што ў чытача складаецца ўражанне, нібыта вершы пісаліся менавіта як цэласны, бесперарыўны твор — адным настроем і адным часам. Крыху выбіваецца, праўда, верш "Прыйдзі валадарства Тваё" — цьмянасцю паэтычнай думкі і невыразнасцю паэтычнай мовы:

Прыйдзі валадарства Тваё...
А мяне тут зусім не было...
Прыйдзі валадарства Тваё —
На святле ланцугоў звяно...

Самае галоўнае ў кнізе Дануты Бічэль — тое, што яна дае магчымасць спрычыніцца да таямніцы паэтычнага свету (а не проста канстатаваць, што тут вось удалая метафара, а тут цікавая рыфма) не толькі на ўзроўні паэтыкі, але і на ўзроўні сэнсу. Можа быць, гэта гучыць крыху дзіўна і нават недарэчна: само сабой зразумела, што ў мастацкім творы ёсць сэнс. Аднак у сучаснай паэзіі гэты сэнс вельмі часта губляецца ці то ў эстэтычнай гульні, ці то ў надзвычай цьмянай падсвядомасці аўтара. Мы перастаем адчуваць існасць паэзіі, яе першавытокі і першапрычыны, а разам з тым губляем і нешта надзвычай важнае ў разуменні існасці быцця. "Ойча наш" — гэта якраз тая кніга, якая вяртае — у свет душы, якая, мінаючы ўсё знешняе, штучнае, надуманае, схематычнае, разбураючы чалавечае ўсёведанне і ўсёпазнанне ("Мы — ад зямной зямліцы. / Нам быць надта дзёрзкімі нельга"), дакранаецца да самага патаемнага, што нельга ні сфармуляваць у думках, ні выказаць, так што ў нейкі момант адчуваеш нават пэўны дыскамфорт ад умяшання ў твой унутраны свет. Гэта вершы, якія адначасна і заспакойваюць сваёй рытмічнасцю і мілагучнасцю, і ўзрушваюць імпульсам пошуку адказаў:

На цыферблаце з падсветкаю сінім,
ходзіць без стрэлак вечны гадзіннік,
Цікае, цікае, цік — маладзік,
поўнік, вятох ды пустыннік...
Над соннай начною зямлёй
цікае па волі Тваёй...

Нягледзячы на тое, што цыкл вершаў Дануты Бічэль прасякнуты найперш рэлігійным пафасам і мае шмат цытат, алюзій са Святога пісання, кніга не пераўтварылася ў павучанне, настаўленне. Гэта нават не столькі спроба паэтычнага асэнсавання біблейскай сімволікі — паэтка прадстаўляе цалкам арыгінальны паэтычны свет, надзвычай багаты, разнастайны і самастойны, калі дарэчным будзе ўжыць такое слова.

Некалі казалі, што сапраўдная паэзія ачышчае і ўзвышае. Цяпер гэтыя ісціны лічацца ўстарэлымі, бо пераважная большасць сучасных паэтаў бачыць іншыя сэнсы ў мастацкай творчасці. Хай будзе так, адзінства меркаванняў у літаратуры — рэч нудная і непрагрэсіўная. Толькі кожны, хто прачытае "Ойча наш" Дануты Бічэль і адчуе чысціню і светласць духоўнасці, якую імкнулася перадаць аўтарка, павінен будзе задумацца над тым, што часам справа не ў прагрэсіўнасці меркаванняў, але толькі ў глыбіні таленту.

Жана КАПУСТА

Кніжная паліца

У РВУ "Літаратура і Мастацтва" выйшла кніга выбраных вершаў **Анатоля АЎРУЦІНА** *"Свет вечерний"*. У зборнік паэта ўключаны як новыя творы, так і вершы з яго папярэдніх кніг.



У выдавецтве "Галіяфы" пабачыла свет кніжка вершаў **Уладзіміра НЕСЦЯРОВІЧА** *"Сто дарог"*. Апроч вершаў, у зборніку знайшлося месца для балад, паэм і нават казкі. Аўтар — мастак (Мінскае мастацкае вучылішча імя Глебава), журналіст (факультэт журналістыкі БДУ) і выкладчык. *"Яго-ныя вершы — адкрыты дыялог з прыродай, шчыры аповед пра ўбачанае, аднойчы перажытае."*



У берасцейскім выдавецтве "Альтэрнатыва" пабачыў свет літаратурны альманах **"СВАЯ СТЫХІЯ"** (на беларускай і рускай мовах). Тут сабраны творы (пераважна вершаваныя, выключэнне складаюць празаічныя тэксты Т. Дземідовіч і Н. Сцёпусь) людзей розных узростаў і розных інтэлектуальных ды творчых узроўняў. Большасць аўтараў — аматары, аднак іх творы даволі прафесійныя. Складальнік, кіраўнік літаратурнага клуба пры Брэсцкім гарадскім доме культуры Т. Дземідовіч. Прадмову да альманаха напісаў С.Грышкевіч. Мецэнат — дырэктар ТАА "Лагуна" Н.Ільніцкая.

У РВУ "Літаратура і Мастацтва" выйшла кніга для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту **Людмілы РУБЛЕЎСКАЙ** *"Карона на дне віра, альбо Казкі з хутара Юстыны"*. Аўтар у асобе Юстыны *"спрабуе завесці юнага чытача ў непаўторны і дзівосны свет роднай прыроды, знаёміць з гісторыяй паходжання назваў і іх лекавымі ўласцівасцямі многіх прыгожых кветак і раслін нашай Баць-каўшчыны"*. Кніга выдадзена ў цудоўным афармленні і з каляровымі малюнкамі мастакоў М. Казлова і Н. Суставай.



У Баранавічах выйшла *"Кніга жонкі паэта"* **Алены БЕЛАЙ**. Нягледзячы на наўмысную аўтарскую самаіронію, змест кнігі змушае да сур'ёзных празаічных разваг над нашай грамадскай будзённасцю і пранікнёнатонкага ўспрымання праяў яе лірычных настрояў. У кнізе змешчаны вершы, проза, эсэ і нават самакрытычная рэцэнзія на гэтую ж самую кнігу. Цікавае і вартае ўвагі выданне.

Уладзімір МАЗГО

* * *

У далях блукаю
Сцяжынкаю роснай,
Нібыта шукаю
Мінулыя вёсны.

Далёкія вёсны
І юныя леты
У краі дзівосным
Зялёнай планеты.

Хоць блізіцца восень,
Не гасне затое
Аддаленых вёсен
Святло залатое.

* * *

Цямнеюць лініі дарог,
А паміж іх адна світае
Дарога для цябе святая,
Якую ў сэрцы ты збярог.

Ты з ёю выйшаў
на прастор
Праз церні ўсе
і перашкоды,
Усім вятрам наперакор
І нечаканасцям пагоды.

Як таямніцу,
у жыцці
Адчуў яе пры нараджэнні,
Але дарэшты не спасціг,
Бо сэнс жыцця —
у спасціжэнні.

"А што далей?
А што далей?.." —
І спадзяванне, і трывога,
Калі наблізіць юбілей
Табой абраная дарога.

ДАЎЖЫНЯ ДНЯ

Вясновы дзень даўжэе,
Крамяніцца, дужэе.
Ён моцы набіраецца
Ад сонца
кожнай раніцай.

Асенні —
карацее
Апошняю надзеяй
На тое,
што свяціла
Дарэшты не астыла.

НАРАЧ

Пра спатканне марачы,
Летнюю вандроўку
Прысвячаю Нарачы
І каханай зноўку.

З нарачонай удваіх
Адчуваем нанач:
Перахоплівае дых
Цішынёю
Нарач.

Да світання не засне
Хваляў калыханка.
Нарач човен прыхіне,
Як мяне
Каханка.

Бы русалачка,
Луску
Скінуўшы на вецце,
Мне адкрыла на пяску
Кут найлепшы ў свеце.

Каб вярнуліся адно
І наступным летам,
Нарач кідае
На дно
Зорныя манеты.

ДАРОГА НА СЛОНІМ

Бяжыць машына па шашы
І набліжае Слонім,
Дзе трапятаць
тваёй душы
У радасным палоне.

Спяшаюць далі паказаць,
Як хораша ў абшары
Вузлы ўспамінаў завязаць
Шаўковай стужкай Шчары.

Жаданні лепшыя твае
Туды накіраваны,
Дзе вечнасць
голас падае
Святы і ўсхваляваны.

Спявае там
званамі храм
На споведнай сустрэчы,
Што нам, нібыта званарам,
Пашчасціла засведчыць.

* * *

У кожным вершы
крылы ёсць,
Што над зямлёй
цябе ўздымаюць.
І сталасць тут,
і маладосць
Іспыт аднолькавы трымаюць:

Адчуеш дотык
лёгкіх крыл
Да белых аркушаў аблокаў,
Дзе толькі ты
і небасхіл
Святой паэзіі высокай.

БЕРАГІНІ

Каля Нёманавай плыні
Зачараваны стаю,
Дзе дзяўчаты-берагіні
Песню родную пяюць.

Падпявае нават сэрца
І цяплей,
і весялей,
Калі нам зайграе скерца
Закаханы салавей.

Памалюся,
як багіням,
Прынямонскім берагіням.
Наша песня не загіне,
Бо спяваюць —
берагіні.

КОНЬ НА КАМАРОЎЦЫ

Сагрэе
думка залатая:
"Зноў конь
на рынак завітае".
Але астудзіць
дотык прозы:
"Вярнуўся конь,
адліты з бронзы..."

* * *

І сум, і радасць:
у твой кош
Ахвяравала восень
Апошні ліст —
апошні грош —
Усё што засталося.

І ты,
расчулены да слёз,
Адчуў сябе багатым,
Нібыта золата прынёс
Асенняе дахаты.

Алена БАГАМОЛАВА

* * *

Жоўтым
гарлачыкам сонца
У азёрна-сініх нябёсах
Села на белы, з аблокаў,
услончык
і распляло свае косы.

Дзень твой пачнецца так,
Як ты мне намалюеш.
Калі і ты пачуў: "Дзівак!"
Значыць, жывеш — не існуеш!

Чырвоным макам сонца
У люстраных азёрных хвалях
Купае перад сном пялёсткі,
Палошча іх і... засынае...
Дзень твой закончыцца так,
Як ты яго пражывеш.
...І, мусіць, жывеш недарма.
Калі напісаўся верш...

* * *

Яшчаркаю самота
Ад ганка да плота
Распаўзлася —
не выйсці!
Схавала свой
Прадажна-палахлівы хвост...
І, як раней,
З абжытага жытла,
Нібы ў вір, наўпрост —
не выйсці!
А я шукаю выйсце,
Бо жыць, стамлёнаю і
паланёнаю, —
нібы НЕ ЖЫЦЬ!..

* * *

Ва ўсім белым свеце
Шэрае дасвецце...

Пакідаю шэрыя крылы
На шэрым даху
Шэры бэз шэпчацца
Ля шэрага,
сляпога шкла...

Любы, запалі свечку...
Шэрай
перадсвітальнай
часінай
Я прыйшла да цябе,
я прыйшла...

ВАГІ

Вагі вагаюцца, узважваючы думкі
і словы, учынкі і пачуцці...
Вагі вагаюцца, вырашаючы,
што важнейшае і што даражэйшае...
Вагі сумняваюцца, ці варта ўзважваць
каханне і сяброўства...
Вагі сумняваюцца, ці варта выбіраць
паміж нябёсамі і зямлёю...
Вагі памятаюць вандроўнікаў
і вернікаў...
Вагі памятаюць вакханак
і вампіраў...
Вагі не любяць валакіты,
але вымушаны да драбніц
па-важнецку ўсё ўзважваць —
варажыць, вырашаючы лёсы...
Вагі высакародна вартуюць
вечнасць, вагі высакародна вартуюць
гармонію...

ЛІСТЫ

Лістуюся з небам
Ветрам белым...
Лістуюся з морам
Ветрам сінім...
Лістуюся з лесам
Ветрам зялёным...
Лістуюся з полем
Ветрам жоўтым...
І лятуць скрозь час і прастору —
Белыя і сінія,
Зялёныя і жоўтыя — лісты...
А з табой лістуюся словам,
А з табой лістуюся паглядам,
А з табой лістуюся дотыкам, —
І лятуць скрозь час і прастору—
Нябёсныя і зямныя — вершы...

* * *

Ад мяне да цябе —
Жарсць...
Ад цябе да мяне —
Ісціна...

Ад мяне да цябе —
Імгненне...
Ад цябе да мяне —
Вечнасць...

Ад мяне да цябе —
Вечна...
Ад цябе да мяне
Ніколі...

* * *

Берагу чаромхавыя
берагі...
Дакранаюся памяццю
зноў і зноў
Да салодкага водару
тых берагоў,
Што, нібыта ў белых
вясельных вянках,
Адпраўляюць
лодку маю
ў жыццёвы шлях...

* * *

І чаромха
яшчэ не нявесціцца —
Недаспелая
пара весняя.
Недаспелая
пара весняя
Адгукаецца
белымі вершамі,
Як радкамі,
Не зарыфмаванымі
нашымі
сэрцамі...
Як словамі,
нібы струны,
напятымі,
Што жылі сто гадоў
за кратамі...

Бо чаромха
яшчэ не нявесціцца —
Недаспелыя
думкі веснія...

Фота Кастуся Дробава

Дзівасіл

Я ўжо апісваў, як мне аднойчы зімой давялося адпачываць, а правільней — працаваць у Доме творчасці "Каралішчавічы" разам з Піліпам Сямёнавічам Пестракам. Другі раз там жа мы адпачывалі разам летам 1967 ці 1968 года.

На гэты раз у пісьменніцкае асяроддзе ўкліняўся жывапісец — народны мастак БССР Іван Восіпавіч Ахрэмчык, які працаваў над партрэтам Піліла Пестрака. Яны зачыняліся ў пакоі на першым паверсе. І ніхто не перашкаджаў ім. А ў перапынках між "сеансамі" гулялі па лясных дарожках то разам, то паасобку. Іван Восіпавіч казаў, што тут, у "Каралішчавічах", яго задача не столькі "жывапісная", колькі "псіхалагічная"' — ён вывучае характар пісьменніка, назірае яго адносіны да людзей, яго звычкі... Хаця мы ведалі, што амаль кожны дзень мастак "прымушае" Піліпа Сямёнавіча і пазіраваць. Мальберт з эскізам партрэта стаяў у тым жа пакоі, дзе яны працавалі, стаяў заўсёды павернутым да сцяны, каб мы не бачылі і не выказвалі сваіх захапленняў ці заўваг — мастакі гэтага дужа не любяць.

І ў сталоўцы, і ў час прагулак размовы іхнія вяліся на розныя тэмы, толькі не пра партрэт. Яны ў нечым былі падобныя адзін да аднаго: абодва любілі гісторыю, мінулае не калупалі похапкам, а разважліва даследавалі кожную падзею.

У Піліпа Сямёнавіча тады была творчая паўза — пасля завяршэння рамана "Серадзібор" (1963) ён працаваў у лёгкіх, як любіў сам казаць, жанрах — пісаў апавяданні, паэму пра Мінск, камплектаваў апошнія тамы свайго чатырохтомніка выбраных твораў.

Я добра ведаў змест рамана Піліпа Пестрака "Сустрэнемся на барыкадах", у якім многа аўтабіяграфічнага. Герой рамана Андрэй Касцевіч, як і Піліп Сямёнавіч, у час імперыялістычнай вайны быў у бежанцах на Паволжы. Там яго і застала Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя. Савецкае Паволжа стала для Андрэя новай радзімай, яму, сялянскаму сыну, адкрылася дарога ў навуку — ён паступае ва універсітэт. Але бацькі Андрэя душой цягнуцца да родных ніў. І калі ў пачатку дваццатых гадоў на Паволжа, як чорная хмара, насунуўся голад, многія бежанцы накіраваліся на захад. Вярнулася ў Заходнюю Беларусь і сям'я Касцевіча.

Нічога не змянілася ў роднай вёсцы. Навокал — голад і галеча. Вяртаецца ў свой фальварак Пан Ельскі. Закабаляюць сялян кулакі, паны і асаднікі. Каб падтрымаць сям'ю, Андрэй вымушаны быў пайсці на работу на лесапільню.

— На лесапільні я і пазнаў сілу рабочай згуртаванасці, — расказваў Піліп Сямёнавіч, успамінаючы сваю маладосць.

Любіў я і вершы Піліпа Пестрака. Запомніўся яго цудоўны "Дзівасіл" з апошняй на той час паэтычнай кніжкі "Падарожнае". Незайздросная з выгляду расліна, якую "напаіла сокамі зямля", мае чароўную сілу — паднімаць на ногі знявечаных людзей. Бабка расказвае пра свайго сына Апанаса, які змагаўся за лепшую долю народа і якому паны пабілі грудзі: "Я ўжо думала, што жыць не будзе, аж знайшлі ратунак — дзівасіл". Верш заканчваецца так:

Калі вам
на сэрцы цяжка стане,
Адбярэ вам немач рэшту сіл,
Не сумуйце, дзеткі...
— Бабка ўстала, —
Дам вам на дарогу дзівасіл.

Дзівасіл — сімвалічны вобраз. Любоў да роднае зямлі, цесная сувязь з жыццём свайго народа — невычэрпная крыніца творчасці паэта. Палымяны патрыёт сваёй Радзімы, Піліп Пестрак не абмяжоўваўся любаваннем квяцістымі лугамі і лясамі, хоць і ўмеў па-свойму глядзець на такія, здавалася б, шаблонныя ў беларускай паэзіі атрыбуты, як верасы, дубы і г.д.

Верасы, верасы...
Яны нешта хаваюць.
Верасы па-асенняму
ціха ўздыхаюць.
То не кветкі на бэзе
нам шчасцем зардзелі —
Ў нарачанскіх лясах
верасы расквітнелі.

Яму не даваў заснуць клопат, вялікі клопат аб тым, каб родны край стаў прыгожым і багатым, каб людзі жылі лепш.

Цяжкім горам для нашага народа была мінулая вайна. Многа давялося папрацаваць, каб залячыць яе раны, аднавіць разбураную гаспадарку, вярнуць урадлівасць зямлі, здратаванай зямлі. А колькі намаганняў, колькі чалавечай цеплыні патрабавалася, каб вылечыць знявечаныя вайной душы! У вершы "Ляснік" паэт расказвае пра сустрэчу са сваім старым знаёмым скрыпачом Данілам, які пайграў за жыццё безліч вяселляў і вечарынак. У вайну Даніла страціў жонку і дзяцей — "замучыў іх кат-людамор". Былы музыка "адрокся сяла", стаў лесніком, жыве пустэльнікам. Як чулы сябар, аўтар гатоў падзяліць з Данілам яго "ціхасць цяжкую" і "смутак вялікі", раіць яму вярнуцца да жыцця:

Вазьмі сваю скрыпку,
вазьмі ты, Даніла.
Няхай загаворыць яна,
Каб сэрцу уцехі прасіла
У восені ціхай струна.
Зайграй,
жа пра новыя дні маладыя,
Пра наш адваёваны край,
Пра пошукі ніваў і былі лясныя
Зайграй жа, Даніла, зайграй!

Сказана гэта проста і шчыра, так можа сказаць толькі блізкі блізкаму, родны роднаму.

Піліп Пестрак быў непаседа, часта ездзіў па краіне і за яе межы. І дзе б ні быў паэт, ён у сэрцы сваім насіў вобраз роднай Беларусі. Прыгажосць Каўказскіх гор навявае яму ўспамін аб родных пагорках; слухаючы ў Латвіі, як "пад рукой рыбачкі-нявесткі коклэ родныя сказы выводзіць", ён успамінае "беларускіх цымбал перазвоны". З павагай адносіцца ён да звычаяў французскага народа, пільна прыглядаецца да простых людзей, імкнучыся зразумець іх жыццё, разгадаць думы і мары. Вось на вуліцы Парыжа стары ветэран "кіркай дзяўбе тратуар". Аб чым ён думае, гэты з выгляду непакорны і суровы рабочы? Пільнае вока мастака заўважае, што брукар

Спыніцца часам на момант,
Твар рукавом абмахне
І, пастарэлы ад стомы,
Цяжка навокал зірне.

Вершы Піліпа Пестрака не падаваліся модным плыням. Ён не гнаўся за "бліскучымі" вобразамі, гуллівымі рыфмамі. Як сапраўдны мастак, ён адмаўляўся ад усялякіх штукарстваў, пісаў проста, зразумела, не баяўся ўзяць на ўзбраенне старую форму, напрыклад, санет. Паэзія для яго была не забавай, а душэўнай патрэбай дзяліцца з народам сваімі думкамі і марамі.

Апошнюю паэтычную кнігу Піліпа Пестрака — паэму "Слова пра Мінск" 1968 — пашчасціла рэдагаваць мне. Я ўжо добра ведаў характар Піліпа Сямёнавіча, асабліва не правіў, граматычныя памылкі і апіскі яму не паказваў, выпраўляў ціхенька. Да 900-годдзя Мінска выдаць кніжку не паспелі, паэма прайшла незаўважаная. Ды і не любіў Піліп Сямёнавіч узносіцца на вяршыню славы, не меў ён і сяброў-крытыкаў, якія б расхвалілі твор.

...Але ж пра "Каралішчавічы". Неўзабаве Ахрэмчык упакаваў свае мастацкія прылады і паехаў завяршаць работу над партрэтам пісьменніка П. Пестрака ў сваёй майстэрні. Мы заўважылі, што Піліпу Сямёнавічу без сябра стала сумнавата, пачалі "далучацца" да яго ў часы прагулак. І ён запрашаў нас у госці, у свой пакой. Частаваў селядцом і салам, вучыў, як захоўваць у воцаце селядзец, як выбіраць смачнае сала.

Наконт сала Піліп Сямёнавіч быў спец, ён мог расказваць цэлыя трактаты: як трэба даглядаць кормных свіней, у якую пару года і пры якім надвор'і забіваць, як смаліць, у якой пасудзіне рабіць засол сала, як начыняць кілбасы, вэндзіць іх і кумпякі... І выбіраў на базары такое сала, што раставала ў роце.

Былі ў характары і паводзінах Піліпа Сямёнавіча дзіўнасці, ад якіх ён не змог пазбавіцца да самай смерці. Звыклы да канспіратыўнага жыцця ў панскай Польшчы, ён быў схільны да неапраўданых падазрэнняў, хваравітай асцярожнасці — нават пісьмы апускаў у паштовую скрыню з аглядкай, каб ніхто не бачыў... Спаў, седзячы за сталом патыліцай да дзвярэй, як у камеры-адзіночцы, каб вартавы ў ваўчок не бачыў, што ён спіць — удзень спаць не дазвалялася. І прадукты хаваў... сам ад сябе. Быў такі выпадак.

На той раз ён прывёз з Камароўскага базара ладны кус сала і, каб ніхто не заўважыў ягонай пакупкі, ціхенька схаваў тое сала пад бэлечку на ганку галоўнага ўваходу ў будынак Дома творчасці. Вяртаемся гэта мы з прагулкі і бачым; на ганку сабраліся ўсе каты — а іх было там многа, — задралі галовы адны, а другія дзяруцца па калонах угору. Мы нічога зразумець не можам, а Піліп Сямёнавіч выгукнуў з трывогай:

— Гэта яны, фашыстоўцы, сала маё ўчулі, — ускочыў на ганак, дастаў з-пад бэлькі пакуначак, распляўся ва ўсмешцы: — Не дасталі яшчэ...— панюхаў праз газету. — А сала, хлопцы, пахне на вярсту, Нясіце пляшку — пачастую.

1991

Яго зброяй быў смех

Захавалася некалькі фотаздымкаў з розных мерапрыемстваў, на якіх мы выпадкова аказаліся побач. Рэспубліканская нарада маладых пісьменнікаў 1948 года, Усесаюзная нарада маладых пісьменнікаў 1951 года, семінар творчых работнікаў на Нарачы ў 1972 годзе, Юбілейны пленум праўлення Саюза пісьменнікаў СССР у 1974 годзе... Сябрамі мы ніколі не былі. Людзі розных лёсаў, розных пакаленняў, мы ведалі адзін аднаго як творчыя работнікі, чые творы змяшчаліся на старонках адных і тых жа тады яшчэ нешматлікіх друкаваных органаў. Для паэта заўсёды знойдзецца месца і ў газеце, і ў часопісе. А дзе надрукавацца драматургу? У той час Макаёнак працаваў у рэдакцыі часопіса "Вожык", дзе друкаваў свае драматычныя мініяцюры пад псеўданімам А. Журавіцкі. Дзейнымі асобамі яго твораў былі не заўсёды выдуманыя людзі, а падчас — тыя, што займалі адказныя пасады. У выніку "рэагавання" на адзін такі твор пра міністра-браканьера Андрэй Ягоравіч вымушаны быў пакінуць рэдакцыю "Вожыка". На гэты ж перыяд прыпадае і самы вялікі перапынак у творчай біяграфіі драматурга — з 1953 па 1959 гг. Затое, як мы стараліся трапіць на новы спектакль Купалаўскага тэатра па п'есе Макаёнка, каб паглядзець Глуздакова — загрыміраванага пад нядаўняга адказнага кіраўніка рэспублікі!..

Неяк на схіле лета мне трэба было ехаць у Крычаў, каб забраць сям'ю, якая там адпачывала. Ведаючы, што ў такую пару — перад пачаткам навучальнага года ў школах — на транспарце бываюць перагрузкі, я купіў білет загадзя, прыйшоў на аўтавакзал і спакойна разгульваў па платформе, чакаючы аб'яўлення пасадкі. І тут сустрэўся з Макаёнкам.

— Ты выпадкова не на крычаўскі аўтобус? — спытаўся ён.

— На крычаўскі.

— Ну, мне пашанцавала, значыць. Прашу цябе, перадай, калі ласка, вось гэты пакуначак маёй маці. Тут лякарствы, ёй дужа патрэбныя.

— Дзе і як я яе пазнаю?

— У Доўску. Яна будзе чакаць на аўтобуснай станцыі, сама падыдзе. Га? Вазьмі, зрабі мне ласку. Звычайна я прашу вадзіцеля, але ж яму ў дарозе клопатаў хапае. А табе ж няцяжка. Згода?

—Добра.

— А я ёй пазваню па тэлефоне, прыкметы твае перадам.

Пакуль мы ехалі, надвор'е сапсавалася. У Доўск аўтобус прыйшоў зацямна. Дажджыла, было холадна і ветрана. Пазнаць маці Андрэя Ягоравіча было няцяжка — яна адна стаяла пад паветкай і, убачыўшы мяне з пакуначкам, рушыла насустрач.

— Прывітанне вам ад сына,— кажу я, перадаючы пасылку.

— Вялікі дзякуй за клопат, за прывітанне. Няхай вам Бог дае здароўечка, — па-гомельску развіталася яна са мной.

Як мне здаецца, Андрэй Ягоравіч страшна не любіў умоўнасцей у адносінах паміж людзьмі, не меў ці мо не хацеў мець ніякіх навыкаў этыкету, не любіў "рассыпацца бісерам" перад начальствам, не кляўся ў дружбе і вернасці сябрам, нічога нікому не абяцаў. Яго зброяй было трапнае слова, гумар, і ён даволі ўдала імі карыстаўся. Рэплікай з месца ён мог астудзіць любую гарачую галаву, збіць з панталыку самага спрактыкаванага прамоўцу ці наадварот — падтрымаць яго, падбадзёрыць. Ні ён мне, ні я яму ніколі не нагадвалі пра той нязначны эпізод з лекамі для яго маці. Успомніў пра яго я пазней, у час Дзён беларускай літаратуры ў Гомельскай вобласці ў 1972 годзе, калі нам пашчасціла пабываць на радзіме Макаёнка — у Журавічах. Яго землякі — калгаснікі і настаўнікі — тыя, хто разам з Андрэем вучыліся ў школе, падкрэслівалі яго чуласць, сардэчнасць, павагу да старэйшых, любоў да бацькоў. "Не глядзіце, што ён любіць пажартаваць, — пераконвала нас адна настаўніца, — а дома дапамагаў маці ўсё рабіць па гаспадарцы. І цяпер не забывае..."

Калі мяне прымалі ў Саюз пісьменнікаў, Андрэй Ягоравіч не выступаў з хвалебным словам, а толькі крыкнуў з месца: "Даўно пара!" і на гэтым абмеркаванне спынілася, прыступілі да галасавання.

Пазней, калі я рэдагаваў газету "Літаратура і мастацтва", а Макаёнак быў галоўным рэдактарам часопіса "Нёман", на дзве рэдакцыі нам выдзелілі адну машыну, сустракацца і званіць адзін аднаму даводзілася часта. Мы разам ездзілі на ўсякія нарады ў Маскву, сустракаліся ў Міністэрстве культуры, у тэатрах. Андрэй Ягоравіч упрыгожваў і весяліў любую кампанію — пасяджэнне рэдсавета ці святочнае застолле, суседзяў па купэ вагона ці чаргу ў буфеце сталічнай гасцініцы. А ўжо калі збярэцца група пісьменнікаў ці выдаўцоў, ён адразу браў на сябе абавязкі вядучага, знаходзіў універсальны ключык, які падыходзіў да ўсіх сэрцаў. Памятаю, у Рускім драматычным тэатры імя Горкага на прэм'еры спектакля "Васіль Цёркін", дзе ўжо занадта прасталінейна былі ілюстраваны радкі несмяротнай паэмы Аляксандра Твардоўскага:

Сам стоит с воронкой рядом
И у хлопцев на виду,
Обратясь к тому снаряду,
Справил малую нужду,

Андрэй Ягоравіч выпусціў такі дасціпны жарт, які імгненна прабег па ўсіх радах партэра, гледачы рагаталі, аж за жываты браліся.

Ён быў народжаны для тэатра, разыгрываў камедыйныя сцэны, дзе толькі можна было, нібы праводзіў міні-рэпетыцыі для будучых п'ес. Аднойчы ў Маскве ён аддаў камусьці са сваіх знаёмых мой купэйны білет на цягнік Масква — Мінск, і мне давялося на Беларускім вакзале выпрошваць у касіра хоць якое месца ў хоць якім вагоне, каб толькі даехаць дамоў. А назаўтра, убачыўшы мяне ў більярднай Саюза пісьменнікаў, Андрэй Ягоравіч тэатральна развёў рукі, усклікнуў:

— Ну во, а вы не верылі! Прыехаў! Я ж казаў, што такога малайца правадніцы і без білета прывязуць, — і калі смех сціхнуў, працягнуў мне більярдны кій. — На, стукні мне па галаве. Бі, колькі хочаш... Мне так трэба было выручыць аднаго чалавека, вось і аддаў яму твой білет. Прабач.

Злавацца і крыўдаваць на Андрэя Ягоравіча было проста немагчыма.

Калі Андрэю Макаёнку было прысвоена ганаровае званне народнага пісьменніка Беларусі, я ўспомніў ягоную рэпліку ў час прыёму мяне ў Саюз пісьменнікаў і паслаў яму віншаванне, якое заканчвалася словамі: "Даўно пара!"

Сур'ёзным бачыў я Андрэя Ягоравіча толькі адзін раз, за некалькі тыдняў да яго смерці. Выпадкова сустрэліся на вуліцы Чырвонаармейскай: я ішоў з бальніцы, ён — у бальніцу.

— Во і я дажыўся, — сумна паскардзіўся ён і пачаў расказваць пра свае немачы: і тое ў яго баліць, і гэтае... Так, не ўсміхнуўшыся, і развітаўся.

Зрэдку мне даводзіцца ездзіць аўтобусам Мінск — Крычаў. У Доўску, які стаіць на скрыжаванні дзвюх шасейных дарог, пабудавана новая аўтобусная станцыя — сучасная будыніна з жалезабетону і шкла. Летам тут можна танна купіць у ружовашчокіх маладух вядро лясных ягад — суніц ці чарніц, паслухаць густую, пявучую, перасыпаную жартоўнымі выразамі гаворку дзядзькоў і кабет. І маё ўяўленне тады малюе вясёлага жыццярадаснага юнака са звіслай на лоб русявай пасмай валасоў — такім быў і выйшаў у свет адсюль выдатны беларускі драматург Андрэй Макаёнак.

1985

Запісы з шуфляды

Хведар ЖЫЧКА

Мінуў год, як ад нас пайшоў Хведар Жычка... Чалавек цудоўнай душы, глыбокага розуму, ён пакінуў пасля сябе не толькі добрую памяць, але і шмат выдатных твораў — паэзію, прозу, публіцыстыку, пераклады. Шмат гадоў Хведар Дзмітрыевіч таксама з'яўляўся рэдактарам тыднёвіка "ЛіМ". Ушаноўваючы памяць творцы, прапануем чытачам невялікія аповеды-ўспаміны пісьменніка.

Арт-пацеркі

З'явіўся першы дзяржаўны Культурны цэнтр Беларусі за мяжой. Ён адкрыты ў Польшчы — краіне, з якою нас звязваюць не толькі сённяшнія добрасуседскія і сяброўскія стасункі, але і агульная гісторыя, і багатая культурная спадчына. Дзейнасць цэнтра скіраваная на шырокае прадстаўленне беларускай культуры і мастацтва ў Польшчы, садзейнічанне развіццю беларуска-польскіх сувязей у галінах культуры і адукацыі, на падтрымку дзейнасці беларускай меншасці ў гэтай краіне. Прэзентацыя Культурнага цэнтра Беларусі адбылася ў Варшаве падчас урачыстага і прадстаўнічага прыёму ў гонар Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Прысутныя, у тым ліку паслы, прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса, іншыя афіцыйныя асобы, пазнаёміліся з канцэртнымі праграмамі Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Беларусі імя Г. Цітовіча і ансамбля акардэаністаў БДУ культуры і мастацтваў, агледзелі выстаўку работ сучасных беларускіх мастакоў. Яшчэ адна прэзентацыя Культурнага цэнтра Беларусі прайшла ў Беластоку.

Гэты дыплом старшы выкладчык кафедры камернага ансамбля Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, канцэртмайстар Вольга Сізко-Габрыелян (на здымку) атрымала ў Кішынёве. На нядаўнім, ужо 14-м Міжнародным конкурсе імя Яўтена Кокі, што праводзіцца там на базе Ліцэя пры акадэміі музыкі Малдовы, наша піяністка, у ліку іншых калег-суайчынніц, акампанавала маладым беларускім выканаўцам на духавых інструментах. Дарэ-

чы, нямала нашых спаборнікаў (а ўсяго было 96 канкурсантаў з Балгарыі, Беларусі, Латвіі, Малдовы, Расіі, Румыніі, Украіны) выйшла на першыя месцы. Усіх і не пералічыць. Сярод іх і тыя студэнты БДАМ, чые выступленні суправаджала Вольга. Напрыклад, трубач А. Хлябовіч (клас прафесара М. Волкава), тубіст П. Корзун (клас прафесара П. Дударэнкі) занялі другія месцы ў сваіх намінацыях, валтарніст А. Андрэйчыкаў (ён вучыцца ў знанага музыканта У. Тарашкевіча) — трэцяе... А Вольгу Сізко-Габрыелян журы ганаравала унікальным дыпломам, у якім пазначана: "За самы лепшы акампанемент".

Пашыраецца культурны абмен між народамі Беларусі ды Венесуэлы. У снежні 2007-га з аншлагам прайшоў гала-канцэрт нашых артыстаў у Каракасе, на адной з лепшых у Лацінскай Амерыцы пляцовак "Teatro Teresa carreno". Музыканты з Венесуэлы гэтым летам гасцююць у нас. Адбыліся вечарыны-прэзентацыі ў сталічным Доме дружбы, выступленні на Міжнародным фестывалі "Звіняць цымбалы і гармонік" у Паставах. Два венесуэльскія калектывы —танцавальна-музычны ансамбль "Фальклор Качэнсе" і музычны квартэт "Марака энсамбле" — суправаджалі ўрачыстасць у мінскім скверы імя Сімона Балівара, дзе адбылося адкрыццё мемарыяльнай дошкі ў гонар гэтага венесуэльскага героя. Пазней "Фальклор Качэнсе" завітаў на "Славянскі базар у Віцебску", а "Марака энсамбле" выправіўся з канцэртамі ў Гомель.

С. ВЕТКА

Фота аўтара

На спектаклях Брэсцкага тэатра драмы і музыкі імя Ленінскага камсамола Беларусі

Ад Шэкспіра да нашых дзён

Гэты тэатр на сённяшні дзень — у ліку самых цікавых драматычных калектываў краіны. Яго ўзначальвае адзін з прафесійных і дасведчаных тэатральных кіраўнікоў — Аляксандр Козак. Толькі ў новым тысячагоддзі Брэсцкі тэатр драмы і музыкі імя Ленінскага камсамола Беларусі тройчы гастраляваў у Мінску: у 2004-м, 2006-м гадах. Дзякуючы сёлетнім гастролям у сталічнай публікі была магчымасць пазнаёміцца з лепшымі пастаноўкамі брэстаўчан: "Злачынства і пакаранне" паводле Ф. Дастаеўскага, "Рамэо і Джульета" У. Шэкспіра, "Вечар" А. Дударава, "Дон Жуан" Ж.- Б.Мальера, "Вэрхал класа люкс, ці Скокі з мерцвяком" Р. Куні, "Крошка" Ж. Летраза, "Рэтра" А. Галіна. Спектаклі розных жанраў усебакова прадставілі як моладзь і сярэдняе пакаленне акцёраў тэатра, так і майстроў, знаёмых мінскаму гледачу па леташніх гастролях.

Гастролі тэатра можна лічыць паспяховымі, мяркуючы ўжо толькі па адным паказе нядаўняй прэм'еры — "Злачынства і пакаранне" паводле Ф.Дастаеўскага ў яркай рэжысуры Ц. Ільеўскага (ён жа з'яўляецца і аўтарам інсцэніроўкі). Мастацкае афармленне В. Лесіна ў спалучэнні з музыкай Д. Шастаковіча, А. Пярта і "Кронас-квартэта" робіць пастаноўку відовішчам маштабным, цікавым і ўзрушальным.

Сцэна ўяўляе сабой злепак, згустак закінутага пецярбургскага двара, здатны трансфармавацца і вызваляць прастору для напружана пабудаваных мізансцэн, карцін, якія адбываюцца ў змрочным доме і дакладна вымалёўваюцца пастаноўшчыкам. Перад вачамі гледача на працягу ўсяго спектакля застаецца варожай і прыцягальнай высокая небяспечная металічная лесвіца, якая вядзе і да кватэры старой Гаспадыні, і да непапраўнага злачынства. Спектакль па сваёй форме і сцэнічнай мове даволі складаны. Вельмі магутна, нават нагнятальна існуе ў ім масоўка (жыхары начнога двара і падвалаў), якая стварае настрой і без якой немагчымы ўчынкі галоўных герояў. Менавіта дзякуючы масоўцы ярка паўстаюць у спектаклі вобразы Раскольнікава (В. Піскун), Соні (Т. Строк), Свідрыгайлава (М. Мятліцкі), Кацярыны Іванаўны (Т. Ляўчук), Дуні (І. Пашэчка), Лізаветы (Я. Малінчык) і іншых персанажаў.

Невыпадкова ўжо не першы раз тэатр прывозіць на мінскія гастролі "Рамэо і Джульету" У.Шэкспіра. Гэта даволі ўдалая эксперыментальная работа калектыву. Рэжысер Ц. Ільеўскі па-свойму і таленавіта трактуе вядомую сумную гісторыю кахання. Немалаважная роля ў гэтым эксперыменце сцэнографа В. Лесіна і мастака па касцюмах Т. Карвяковай. Спектакль з праз шэсць гадоў з часу прэм'еры застаецца маладым, жыццяздольным і іскрыстым, дзякуючы моладзі, якая ў ім занятая.

Відавочна, што і Мальераў "Дон Жуан" у пастаноўцы А. Латэнаса — спектакль вельмі важны для тэатра. На яго выдаткавана шмат сіл і сродкаў. Цікавая сцэнаграфія і касцюмы С. Бацула і арыгінальная музыка Ф. Латэнаса. Тым не менш, на маю думку, рэжысёрам не знойдзены патрэбны ключ да п'есы Мальера. Хаця ў спектаклі ёсць асобныя цікавыя выхады акцёраў І. Пашэчкі, В. Міхайлава і С. Еўдашэнкі. Што ж да галоўных герояў — Дон Жуана ў выкананні С. Пяткевіча і Зганарэля М.Мятліцкага, то іх існаванне вельмі супярэчлівае побач з парцалянавымі статуэткамі і бліскучымі люстэркамі. Акцёры іграюць вельмі напружана, марнуюць шмат энергіі і высілкаў. А жаданага выніку, як мне падаецца, — няма. У спектаклі, нібы ў паралельных сусветах, асобна існуюць рэжысёрская задума і акцёрскае выкананне. Хаця, можна спадзявацца, што такі эксперымент не пройдзе безвынікова для тэатра. Бо, вядома ж, як і куды б ні пайшоў Дон Жуан, ён заўсёды пакідае глыбокі след у душах і сэрцах тых, каго любіў.

Камедыя "Крошка" Ж. Летраза ў пастаноўцы Я. Тарасава вызначаецца лёгкасцю акцёрскага выканання, цікавымі характарамі. Спектакль даносіць да гледача займальны сюжэт, мілую гісторыю, якая прыцягвае гледача. Нельга не адзначыць з густам выкананае мастацкае афармленне В. Лесіна і касцюмы Т. Карвяковай. Зрокавы шэраг спектакля прымушае сачыць за зменай мізансцэн, нібы за фільмам, ад якога цяжка адарвацца.

З прэм'ерных спектакляў вылучаюцца "Вечар" А. Дударава ў пастаноўцы А. Козака і "Рэтра" А. Галіна ў пастаноўцы В. Янавец.

Дудараўскі "Вечар" прачытаны брэстаўчанамі надзвычай шчыра і кранальна. У ім занятыя майстры сцэны — Тамара Ляўчук, Міхаіл Мятліцкі і Мікалай Маршын. Спектакль прыцягвае тонкай атмасферай, створанай рэжысёрам А.Козакам, сцэнографам В. Лесіным і кампазітарам В. Кандрасюком. Мастацкае афармленне спектакля не побытавае, умоўна-метафарычнае. Сцэну ўпрыгожвае ажурная піраміда, якая ў роўнай ступені можа быць аднесена як да часткі рэальнага дома, так і да свету паралельнага, касмічнага, які нам здаецца бачным і ў той жа час не існуе і ніколі не будзе дасягнуты. "Вечар" ужо сёння стаў класікай беларускай драматургіі. Відавочна, што гэта адна з лепшых п'ес А. Дударава. Невыпадкова столькі гадоў яна ставілася як на Беларусі, так і па-за яе межамі. Невыпадкова да яе звярнуўся другі раз і Валерый Раеўскі ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы. Спектакль Брэсцкага тэатра драмы і музыкі не падобны да многіх увасабленняў п'есы, якія мне давялося бачыць. Ён належыць толькі той сцэне, на якой створаны. У ім жыве душа яго стваральнікаў і выканаўцаў. І ў гэтым — каштоўнасць спектакля.

Рэжысёрам Валянцінай Янавец па-сучаснаму цікава прачытана Галінскае "Рэтра". Пастаноўка атрымалася вельмі прыцягальнай па сваім гучанні і мастацкім увасабленні. Яе мастак В. Лесін будуе на сцэне празрыстую фантастычную мэблю, падобную да вялізных акварыумаў, у якіх плаваюць адзінокія бязважкія рыбіны. Праблема адзіноты сучаснага чалавека становіцца галоўнай для пастаноўшчыкаў. Яны свядома не канцэнтруюць увагу на смешным адначасовым спатканні старога і трох яго "нявест", застольнай сустрэчы галоўных герояў. Першаснымі становяцца іх чалавечыя адносіны, характары, якія па-майстэрску ствараюць акцёры Т. Ляўчук (жартаўлівая, экстравагантная Роза Аляксандраўна), Д. Дойбан (элегантная, нязменная ў сваіх камсамольскіх паводзінах Дзіяна Уладзіміраўна), Т. Багрэева (непахісна прынцыповая і правільная ва ўсім Ніна Іванаўна), В. Міхайлаў (дзівакаваты, спакойны, здольны радавацца ва ўсялякіх абставінах Мікалай Міхайлавіч Чмуцін). У "Рэтра" мастаком і рэжысёрам створана тонкая, крохкая атмасфера існавання і ўзаемаадносін герояў, што з'яўляецца асабліва важным для ўвасаблення задумы спектакля.

Сёння ў Брэсцкім тэатры драмы і музыкі актыўна займаюцца рэжысурай Аляксандр Козак і Цімафей Ільеўскі, Валянціна Янавец і Раман Гапанюк. Іх спектаклі розныя, іх хтосьці можа прымаць ці не прымаць. Але відавочна, што кожны з іх імкнецца да сваёй драматургіі, да стварэння ўласнага непаўторнага тэатра. А гэта нялёгкая, напружаная праца, бо тэатр выпускае па 6-7 прэм'ер за сезон.

Адначасова сюды запрашаюць на пастаноўкі самых розных рэжысёраў, якія б маглі па-свойму раскрыць магчымасці трупы: Валерыя Раеўскага, Уладзіміра Савіцкага, Андрэя Бакірава, Альгірдаса Латэнаса і іншых. На сённяшні дзень тэатр не прытрымліваецца якога-небудзь аднаго стылістычнага кірунку і не навязвае яго свайму гледачу. Ён у роўнай ступені імкнецца быць і яркім, святочным, радасным, як у сваіх лепшых камедыях "Вэрхал класа люкс, ці Скокі з мерцвяком" Р. Куні, "Прымакі" Янкі Купалы; і ўдумлівым, шматгранным, псіхалагічным, як у "Дзядзьку Ваню" А.Чэхава, "Вечары" А. Дударава ды інш. Магчыма, як і кожнаму жывому арганізму, тэатру пакуль яшчэ не ўсё ўдаецца, але тое, што ім абраны адзін з перспектыўных творчых шляхоў, відавочна. Гэта шлях да прафесіяналізму на сцэне. Да прафесіяналізму ва ўсіх складніках спектакля.

Вераніка ЯРМАЛІНСКАЯ

Будучыня нашай шафы

У Нацыянальнай школе прыгажосці прайшла абарона дыпломаў выпускнікоў факультэта дызайну (кафедра мадэлявання адзення і мастацкіх тканін) Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Даволі значная падзея, таму што мадэлі з тых дыпломных калекцый, якія мы сёння бачым на подыуме, заўтра могуць апынуцца ў нашай шафе. І нічога дзіўнага, бо шмат хто з выпускнікоў не раз удзельнічаў у "Млыне моды", "Белай амфары" і іншых знаных фестывалях, не раз іх калекцыі адзначаліся ўзнагародамі.

Заўтра некаторыя з гэтых маладых спецыялістаў прыйдуць на прамысловыя прадпрыемствы і будуць ствараць моду не на паперы, мадэляваць адзенне. Дык што ж чакае нас заўтра?

На абароне былі прадстаўлены сем калекцый адзення і два габелены. Дызайнеры адзення пайшлі па трох напрамках: сінтэз мастацтваў, фальклорныя матывы і сучасная гарадская жаночая мода. Сінтэз мастацтваў прадстаўлялі калекцыі Вячаслава Казлова "Колер Марыны" і Ірыны Пашукевіч "Ружы алхімікаў". Першая ўвасабляе ў тканіне лірыку Марыны Цвятаевай, другая — гатычныя матывы архітэктуры. Але ніякіх простых асацыяцый і цытавання! Вячаслаў адышоў ад марской тэмы і зрабіў пяць цікавых сукенак-паліто ў ружова-чорнай і белай гамах. Ірына адмовілася ад стрэльчатых дэталяў, але гэта не пазбавіла яе мадэлі імкнення ў вышыню. Магія гэтых калекцый у тым, што вы з лёгкасцю правядзеце сваю ўласную паралель паміж дзяўчынай у суконцы-паліто і вершам Цвятаевай, прычым не толькі тэкстава, але і рытмічна, графічна. Фальклорныя матывы чыталіся ў калекцыях Галіны Івановай "12 месяцаў" і Алены Савашэвіч "Прыгажосць па-руску". Галіна ў сваёй працы абапіралася на традыцыі беларускага календара, а за аснову ўзяла ніжнюю жаночую кашулю з беларускіх народных строяў, якая пад уздзеяннем часу трансфармавалася ў звычайную майку з мужчынскай бялізны. І з гэтай звычайнай майкі атрымалася дванаццаць цікавых і яркіх мадэляў. Сумняваюся, што іх можна насіць у штодзённым жыцці, але тое, што гэтае адзенне сталася творам мастацтва, — несумненна. Алена Савашэвіч, натхніўшыся творчасцю Барыса Кустодзіева, збоку глянула на культуру нашых суседзяў і стварыла калекцыю вобразаў рускіх Венер. У яе мадэлях змяшчаюцца ўсе міфы пра рускую жанчыну і зусім адсутнічае кіч.

Гарадскія модніцы былі прадстаўлены ў трох калекцыях. Вікторыя Колб сінтэзавала матывы 1980-х і сучасную мару пра імідж бізнесвумен у калекцыі "Мега-бляск". Аліна Шастакова, незвычайна спалучыўшы адценні карычневага і бірузовага, стварыла калекцыю "Шоўкавы шэпт". А Вольга Зарэцкая, абурыўшыся, што сёння людзі перасталі на святы апранацца па-святочнаму, прапанавала калекцыю адзення для ўрачыстасцей "Vyanok": ад вяселля да кактэйля.

Габелены, прадстаўленыя Таццянай Закрэўскай і Вольгай Дзенічэнкай, будуць упрыгожваць музей Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь і адну з дзіцячых бальніц.

Мадэлі, прадстаўленыя ў калекцыях дыпломнікаў, надзвычай прыгожыя і амаль усе прыдатныя нават для штодзённага ўжытку. Так што светлая будучыня нашай шафы — не за гарамі.

Алена МАЛЬЧЭЎСКАЯ

Фота аўтара

Прырода — вось яго натхненне!

Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі. Узнімаюся на чацвёрты паверх. Вакол — гукі, гукі, гукі. На лесвіцы разыгрываецца кларнетыст, у фае малады віяланчэліст іграе меладычны эцюд. А з-за гэтых дзвярэй чуюцца спевы. Ціхенька ўваходжу ў клас: вучань народнага артыста Беларусі Пятра Рыдзігера студэнт трэцяга курса Павел Кацюшын (дарэчы, ужо лаўрэат міжнароднага конкурсу) выконвае вакальныя практыкаванні пад кіраўніцтвам педагога... Пётр Васільевіч завяршае ўрок, і мы можам пагутарыць.

Народны артыст Беларусі Пётр Рыдзігер — выдатны артыст, майстар сцэны, вядомы некалькім пакаленням гледачоў Беларускага дзяржаўнага музычнага тэатра, цудоўны педагог, вучні якога становяцца лаўрэатамі сур'ёзных міжнародных конкурсаў, — яшчэ і цікавы суразмоўца.

— Пётр Васільевіч, звычайна тое, чаго дасягае чалавек у жыцці, закладваецца ў яго дзяцінстве. Які характар быў у вас, калі вы былі маленькі? Якія ўспаміны звязаныя са школай?

— Я быў выхаваны, спакойны хлопчык з інтэлігентнай сям'і, а многія вучні нашай Сяміпалацінскай школы былі дзецьмі алкаголікоў і бандытаў. Да чацвёртага класа ў нас былі больш-менш мірныя адносіны, але потым надышоў пераходны ўзрост, і аднакласнікі пачалі здзекавацца з мяне. Мая маці хацела даць мне спецыяльнасць, а менавіта — фартэпіяна. Хлопцы зайздросцілі, што я займаўся музыкай, і дражнілі мяне "музычныя пальчыкі", вылівалі мне за каўнер чарніла, тыцкалі пер'евымі ручкамі. Перастрэўшы па дарозе са школы, білі. І вось аднойчы ўсё, што ў маёй душы назбіралася, нарэшце вылілася: калі завадатар хлапцоў схапіў мяне, я не вытрымаў, узняў яго і грукнуў аб падлогу, прыціснуў і пачаў лупцаваць. Потым заплакаў і, як цяпер памятаю, усё пытаўся ў таго Сашы: "Як цябе такога маці нарадзіла?" Усе зніякавелі: ніхто не чакаў ад мяне (я ж раней нават голасу не павышаў), такога ўчынку. Аўтарытэт завадатара імгненна ўпаў, а мяне пачалі лічыць самым моцным.

— Вы іралі на фартэпіяна, а як прыйшлі да спеваў?

— Калі вучыўся ў сёмым класе, маці заўважыла ў мяне неблагі голас, і я пачаў выступаць на школьных святах. Спяваў арыі Анегіна, князя Ігара. З дзяцінства быў выхаваны на класічнай музыцы: на творах Чайкоўскага, Брамса, Гайдна, Гендэля, Моцарта... Дыскаў і касет тады не было, і мы слухалі музыку на пласцінках (дарэчы, у мяне і сёння захоўваюцца рэдкія запісы Пірагова і іншых выдатных спевакоў). Мяне ніхто не прымушаў слухаць класіку — гэта было натуральна: маці сама добра спявала і грала на фартэпіяна (яна нават вучылася ў талінскай кансерваторыі), бабуля таксама добра валодала інструментам.

— Акрамя музычнага, ці выяўляліся ў вас іншыя таленты?

— Маляваць я не ўмеў, хаця маці маляваля добра. Яна таксама спрабавала прывучыць мяне да калекцыяніравання марак, да ігры ў шахматы, але марна. Мне вельмі падабалася займацца фізкультурай, я добра плаваў, быў неблагі спрынтэр, нават стаў чэмпіёнам Казахстана сярод юніёраў. Я ўдзячны матулі, што яна навучыла мяне любіць прыроду. Мы часта выязджалі гуляць у бор — там, дзе мы жылі, раслі вялікія лясы на сотні кіламетраў. Гарадскім аўтобусам ехалі да канцавой і ішлі гуляць... І цяпер прырода з'яўляецца маім хобі — побач з маім домам вельмі прыгожа, ёсць рэчка. Нават зімой прыемна. Летам, калі добрае надвор'е, магу там знаходзіцца нават да 4-ай гадзіны раніцы: у вадзе адлюстроўваецца святло ліхтароў, месяц свеціць — можна хоць газету чытаць: як у Летнім садзе Пецярбурга... Прырода — гэта маё натхненне, сканцэнтраванне, расслабленне.

— А што было самым цяжкім у асваенні музыкі?

— Я не быў гультаём, але, зразумела, мне — маленькаму хлопчыку — хацелася бавіць час з сябрамі. А як усё паспяваць? Прыходзіў з агульнаадукацыйнай школы дадому літаратурна на паўгадзіны — і трэба было ўжо бегчы ў музычную. Вяртаўся ўвечары, мусіў рабіць ўрокі і займацца на фартэпіяна. Дзяцінства, лічыце, не было. Але я ўдзячны маці, бо інакш з мяне, можа, нічога б і не выйшла.

— Разумею, што музыка — ваша жыццё, але ці ёсць такія жанры ці творы, якія вас раздражняюць?

— Я з павагай стаўлюся да розных відаў музыкі, скажам, да джаза, лічу, гэта неўміручая музыка. А што да папсовых матылькоў-аднадзёнак, дык іх песні я не тое што запомніць, нават успрыняць не магу. Я неаднойчы прымушаў сябе слухаць папулярныя сучасныя песні: думаў, трэба ж "адукоўвацца" — усе ж слухаюць! Вынік такі: гэтыя песні выклікаць у мяне толькі смех. Не хачу нікога пакрыўдзіць, але я яшчэ раз упэўніўся, што гэта — не маё. Што Гендэль, Брамс, Чайкоўскі, Рахманінаў, Брытэн, Лоу — гэта элітарная музыка. І так хацелася б, каб людзі, якія слухаюць у навушніках музыку, аддавалі перавагу менавіта класіцы. Неяк быў выпадак у нашым тэатры: ідзе акцёр з плэерам, пытаюся: "Што ты слухаеш?" — "Музыку", — кажа. — "Дай паслухаць". Надзяваю навушнікі — а там: "Ум-па, ум-па". Хіба ж гэта музыка?!

— "Папса" моцна ўздзейнічае на культурны ўзровень народа...

— Больш за тое: гэта кшталту наркотыка, дэцыбелы ўздзейнічаюць на падсвядомасць. Усе, думаю, бачылі, як хлопцы і дзяўчаты скачуць з бутэлькамі пад такую "музыку". А як вам падабаюцца тэлешоу з гучнымі назвамі, кшталту "Народны артыст" — яго ж удзельнікі нідзе вакалу не вучыліся, а хочуць стаць "зоркамі". Не тое, што мне шкада самога звання — калі ласка, бярыце! Але ж глядзець на гэтыя шоу проста немагчыма.

— На ваш погляд, як можна зацікавіць моладзь музычным тэатрам?

— Гэта, напэўна, не да мяне пытанне, таму што ўсё залежыць ад агульнага культурнага ўзроўню грамадства, ад тых каштоўнасцей, якія прапагандуюцца ў ім. І тут у нас няма агульнай палітыкі, часам кіраўніцтва патурае шырспажыву. Дрэнна, што моладзь ніхто не выхоўвае ў рэчышчы добрага густу. Чамусьці добра помняцца словы песень Бабаджаняна, Тарывердзіева, Пахмутавай... А сённяшнія песні матылькоў-аднадзёнак — нібы на адзін твар.

— А на студэнтаў творчых ВНУ "папса" ўздзейнічае?

— Тыя, хто сур'ёзна вырашыў прысвяціць сябе класіцы, да "папсы" ставяцца з насцярогай. Хаця, канечне, дзе-нідзе ў кампаніі і яны могуць патанцаваць пад сучасныя песні. Ды, можа, і я калі-небудзь у рэстаране пад іх "павыстаўляюся". Памятаю, былі мы на гастролях у Чэхаславакіі. Зайшлі ў рэстаран "Кантыненталь". І ведаеце, што запомнілася больш за ўсё? Падчас усяго вечара (а адпачываюць людзі там вельмі падоўгу) гучала цудоўная музыка — зусім нейтральная, вельмі меладычная, яна атуляла, абдымала публіку. Гэта было вельмі пяшчотнае суправаджэнне мелодыі тваёй душы.

— Пётр Васільевіч, вашы парады маладым людзям, якія пачынаюць займацца музыкай...

— Час, напэўна, змяніўся. Бо сёння прафесія музыканта не дае магчымасці зарабіць вялікіх грошай, таму, відаць, яна і непапулярная сярод моладзі. Да таго ж, каб чаго-небудзь дасягнуць, трэба мець схільнасці (ужо не кажучы пра талент) і ахвоту настойліва працаваць — інакш нічога не атрымаецца. Цікава, што, скончыўшы музычную школу, я аднойчы сказаў маці: "Дзякуй, але я больш не хачу займацца музыкай!" Я закрыў вечка інструмента і думаў, што на гэтым мая музычная кар'ера скончылася. Я быў найшчаслівейшы чалавек у свеце — тыдні два-тры не падыходзіў да піяніна, гуляў з сябрамі, хадзіў на рэчку, купаўся. Маці была разумным чалавекам, дазваляла мне рабіць усё, што я хачу. Ды праз нейкі час я, нарэшце, падышоў да піяніна, патыцкаў пальцам у клавішы, потым закрыў вечка і пайшоў на вуліцу. Але... я вырашыў паступаць у музычнае вучылішча. Сам падаў дакументы, паехаў і здаў экзамены.

— Значыць, чалавек павінен сам вызначыць свой шлях...

— Канечне, але трэба ўлічваць, што не кожны можа дасягнуць вышыняў, як, скажам, Рыхтэр. Дарэчы, калі я, хлопчык з правінцыі, прыехаў паступаць у Маскоўскі інстытут імя Гнесіных, Святаслаў Рыхтэр праслухаў мяне і адзначыў, што мая ігра яму спадабалася. Я скончыў два факультэты Гнесінскага інстытута, адначасова вывучаючы вакал і фартэпіяна. Калі б хтонебудзь мне цяпер сказаў, што гэта можа паўтарыцца, я б не паверыў: такое мажліва толькі ў маладосці. Фартэпіяна і вакал — гэта, можна сказаць, узаемавыключальныя рэчы. Я жыў у інтэрнаце, у падвале якога былі спецыяльныя класы, дзе я ноччу займаўся фартэпіяна. Быў перыяд, калі загадчыкі дзвюх кафедраў спрачаліся, якую спецыяльнасць зрабіць для мяне асноўнай, і ў выніку "перамог" вакал.

— А вам самому што было бліжэй?

— Было шмат нюансаў. Вакал вабіў мяне асаблівай энергетыкай. Ён дае магчымасць адчуваць радасць душы і цела. Паколькі я быў піяністам, вакал даваўся мне дастаткова лёгка, да таго ж я ведаў мноства выдатных піяністаў, якія мусілі выступаць у глыбінцы літаральна за капейкі. Вядомы барытон Павел Лісіцыян таксама падтрымаў мой выбар, сказаўшы: "З тваім багажом як піяніста табе як вакалісту цаны не будзе". І без залішняй сціпласці скажу, што ў Беларусі няма спевака, які б скончыў маскоўскую ВНУ і як вакаліст, і як піяніст.

— У якіх тэатрах, акрамя Беларускага дзяржаўнага музычнага, вы працавалі?

— Калі я скончыў "Гнесінку", многія тэатры прапанавалі мне працу: у Куйбышаве, Днепрапятроўску, Свярдлоўску, Сараташе, Горкім, Пермі, Уфе. Але я спачатку паспрабаваў свае сілы ў Вялікім тэатры СССР: праслухаўся ў яго стажорскую групу. І сітуацыя склалася, як у кіно: мяне праслухалі, я спадабаўся, і калі, здавалася б, усе іспыты скончыліся, старшыня прыёмнай камісіі Вядзернікаў мне сказаў: "Ну што, спадабаўся! Малайчына! А з прапіскай у цябе ўсё ў парадку?" Аказалася, што мяне не могуць узяць у стажорскую групу Вялікага тэатра толькі з-за таго, што ў мяне не было маскоўскай прапіскі. З гора я паехаў у Куйбышаўскі (цяпер Самарскі) оперный тэатр. А потым спяваў у Ленінградзе — таксама ў оперы. У 1981 годзе мяне запрасілі ў Мінск, у тэатр музычнай камедыі. Непрыемна ўспамінаць, але амаль два тыдні мне давялося жыць у тэатры, бо тых людзей, якія мяне запрасілі на працу, якраз звольнілі...

— Пётр Васільевіч, якія вартасці вы лічыце галоўнымі для акцёра? Як вы ставіцеся да творчасці артыстаў іншых тэатраў Мінска?

— Мяне ўвогуле ў людзях прываблівае сумленнасць. Гэтая якасць ёсць у акцёраў драматычных тэатраў: я, напрыклад, сяброўю з многімі артыстамі тэатра імя Горкага. Часта наведваю калег з тэатра оперы, з Купалаўскага, пастаянна бываю на спектаклях, прычым імкнуся прыйсці незаўважаным, каб нікога сваёй прысутнасцю не збянтэжыць.

— Раскажыце пра вашу выкладчыцкую працу.

— З 1990 года я выкладаю на кафедры сольных спеваў у Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Для мяне гэта вельмі захапляльная справа. Люблю займацца са студэнтамі, дапамагаць ім, запальваць іх душы вакалам. Моладзь мне давярае, бо я сам захоплены гэтай справай. Я выхоўваю студэнтаў у рэчышчы добрай музыкі. І, ведаеце, яны сапраўды цікавяцца ёй, прыносяць новыя ноты. Мяне гэта грэе.

Гутарыла
Вольга НАВАЖЫЛАВА

Жывыя вобразы

Амаль шэсцьдзесят гадоў не сыходзіць са сцэны Нацыянальнага акадэмічнага тэатра оперы Беларусі "Царская нявеста" Мікалая Рымскага-Корсакава. Пастаўленая яшчэ ў 1950-м заслужаным артыстам БССР, рэжысёрам Уладзімірам Шахраем і народным мастаком Беларусі, вучнем славутага К. Каровіна, Сяргеем Нікалаевым, опера дасканала перадае атмасферу эпохі Івана Грознага. Наогул, Сяргей Нікалаеў афармляў у Мінску нямала цікавых оперных спектакляў. А тагачасная пастаноўка "Царскай нявесты" карыстаецца поспехам у публікі да сённяшняга дня.

Цудоўную традыцыю пастаноўшчыкаў "Царскай нявесты" працягнуў дырыжор Вячаслаў Воліч. Беларускі маэстра быў адным з пастаноўшчыкаў гэтай оперы (як музычны кіраўнік) на сёлетнім Шаляпінскім фестывалі ў Казані і, як адзначыў у сваім артыкуле вядомы маскоўскі крытык Дзмітрый Марозаў, выявіў тонкае разуменне музычнай драматургіі. Тое ж можна сказаць і пра мінскі спектакль, у якім аркестр пад кіраўніцтвам В. Воліча гучаў моцна, магутна, ярка, адпаведна зместу оперы, перадаючы ўсю гаму пачуццяў герояў.

Шматлікія аматары музычнага мастацтва прыйшлі тады паслухаць Уладзіміра Пятрова — яго першае выкананне партыі апрычніка Рыгора Грознага. Артыст паўстаў перад публікай прыгожым заліхвацкім сэрцаедам. Але закаханы ў Марфу Сабакіну, ён даведваецца, што дзяўчына сасватаная за іншага, і з гора ладзіць баляванне. А яго адрынутая палюбоўніца Любаша спявае журботную песню пра дзявочую долю.

Аксана Волкава ў вобразе Любашы выйшла такая прыгожая, упэўненая ў сабе, што міжволі прыцягнула ўвагу ўсіх. Яе гераіня кахае, пакутуе. Колькі пачуццяў, шчырых, выразных, у яе выкананні! А цудоўны голас спявачкі гучыць так ярка... Да глыбіні душы крануў і дуэт Любашы ды Рыгора Гразнога.

Выразная і кранальная Тацяна Гаўрылава ў партыі Марфы, прыгажуні, закаханай у нарачонага, — баярына Івана Лыкава, у вобразе якога ўдала выступіў Юрый Балацько.

Вядомая гісторыя з любоўнымі жарсцямі і трагічнай развязкай увасобілася ў яркі, прыгожы спектакль. Парадавалі публіку і аркестр, і салісты. Сярод іх — і ўжо названыя, і Янаш Нялепа, які цудоўна справіўся з характарнай партыяй лекара Бамелія, і Уладзімір Пятроў, які ўдала паказаў складаны вобраз Рыгора Гразнога.

Вера КРОЗ

ЭСЭ

Звон над Оснабрукам

Да 110-годдзя з дня нараджэння Эрыха Рэмарка

Далёка ад Беларусі ў нямецкім горадзе Брэмене прачытаў у рускамоўнай газеце, што ў Оснабруку ў зале Славы мэр горада ўручыў Прэмію міру імя Рэмарка беларускай пісьменніцы Святлане Алексіевіч за адлюстраванне ў яе кнігах антыванных ідэй.

Оснабрук знаходзіцца ў 130 кіламетрах ад Брэмена, а я і не ведаў, што Рэмарк там нарадзіўся, і аб тым, што там ёсць яго музей. Паехаў, паглядзеў, і толькі пасля захацелася напісаць... Для каго? Для чаго? Ну хоць бы для тых маладых людзей, ва ўзросце якіх мы некалі пазнаёміліся з кнігамі Рэмарка. Нават "няпоўнае" веданне гэткіх біяграфій прыбаўляе веры ў чалавецтва, глыбока падарванай сучаснасцю.

Мне здаецца, што сёння гэта больш небходна, чым учора. Нават калі толькі некалькі маладых асоб перад тым, як даць нырца ў Інтэрнет, пабывае ў гасцях у Эрыха Рэмарка, то і тады можна лічыць, што "ўрок" дасягнуў мэты.

* * *

Эрых Марыя... Дзіўнае гэта было ўтварэнне для нашага вуха: чаму мужчыну назвалі жаночым імем? А можа, гэта жанчына? Гэты рэбус быў разгаданы для мяне тут, у Германіі.

Напрыканцы дзевятнаццатага стагоддзя, 22 чэрвеня 1898 года ў Оснабруку, у сям'і патомных рамеснікаў нарадзіўся хлопчык, якога зарэгістравалі пад імем Эрых Пауль Рэмарк. Продкі хлопчыка прыйшлі ў Германію з Францыі. Прадзед яго быў рабочым па кладцы з цэглы, каменю, дзед — цвікаром, бацька — пераплётчыкам. Сям'я жыла бедна. У пошуках таннага жылля яна змяніла ў Оснабруку адзінаццаць кватэр. Комплекс беднаты будзе пастаянна прыгнятаць Рэмарка. Калі ж стане багатым, пісьменнік усё жыццё будзе "адыгрывацца" за беднае дзяцінства і юнацтва — лепшыя аўтамабілі, лепшыя гасцініцы і рэстараны і самыя прыгожыя жанчыны.

Рэбус жа "Марыі Рэмарк" быў разгаданы лёгка. Трэба было толькі больш дэталёва пазнаёміцца з жыццём пісьменніка, чаго ў мой час, калі мы таго і жадалі, зрабіць не змаглі. Гэта быў псеўданім у памяць аб любай матулі, якой рана не стала. Праз дваццаць гадоў пад гэтым імем — Эрых Марыя Рэмарк — ён стаў сусветна вядомым пісьменнікам.

Не будзе перабольшваннем, калі скажу, што Рэмарк быў уладаром думак некалькіх пакаленняў і "пакінуў свае рысы на вялізным зменлівым жалезным твары часу". Ён і Хемінгуэй прыадчынілі для нас, тады яшчэ маладых, прастору за межамі СССР. Мы любілі і ведалі ўсё, што друкавалася. Чыталі і доўга жылі гэтым.

У рамане "Ночь в Лиссабоне" герой перад ратушай у Оснабруку думае: "Здесь, на этом крыльце, в 1648 году было провозглашено окончание Тридцатилетней войны. А в 1933 — начало "тысячелетнего рейха". Я задумался: доживу ли до того дня, когда будет объявлено о его конце?" (У сувязі з тым, што аўтар у якасці крыніц выкарыстоўвае існуючыя рускамоўныя пераклады нямецкіх тэкстаў, большасць цытат — гэтак жа, як і назвы твораў, — падаюцца на рускай мове. — ***Рэд.***)

Пісьменнік намнога перажыў ненавісную сістэму. Ён усімі фібрамі сваёй мудрай душы імкнуўся да прыроднай рэчы: проста жыць. Жыць і кахаць. Гэта ўсё, што патрэбна чалавеку. І за тое, што кнігі Рэмарка былі менавіта аб гэтым, яго прымусілі пакінуць родны горад, родную краіну...

* * *

Будынак старажытнай ратушы, побач уваход у музей Эрыха Рэмарка...

"На Западном фронте без перемен". "Эта книга, — піша Рэмарк ва ўступе, — не является ни обвинением, ни исповедью. Это только попытка рассказать о поколении, которое погубила война, о тех, кто стал жертвой, даже если спасся от снарядов". Кніга — папярэдніца многіх твораў аб Карэі, В'етнаме, Афганістане, Чачні, Іраку... Кніга, насуперак таму, што сказаў аўтар, — і суровае абвінавачванне, і цяжкая споведзь.

Гісторыя дадзенай кнігі гэткая. Выдадзеная ў 1929 годзе "На Западном фронте..." выклікала і сенсацыю, і шок. Вайна Рэмарка — гэта баі, смерць, хваробы, пакуты, гразь і кроў. А дзе ж арэол гераічнай нацыі? Які арэол, кажа Рэмарк, калі з абрубка адарванай рукі хлышча апошняя кроў. Пісьменнік быў абвінавачаны ў тым, што напісаў яе, маўляў па заказе Антанты. У Аўстрыі — забарона на кнігу ў салдацкіх бібліятэках. У Германіі распаўсюджваецца плётка: аўтар — здраднік радзімы, яўрэй і камуніст. У Італіі кніга забаронена. А ў краінах свету апладзіруюць таленавітаму твору. У тым жа 1929 годзе "На Западном фронте..." перакладзена на 49 моў, яе тыраж склаў 20 мільёнаў. Да гэтага часу такі тыраж мела хіба толькі Біблія. У 1931 годзе галівудская экранізацыя рамана атрымлівае "Оскара". У Германіі фільм забаронены. Рэмарку на радзіме становіцца цяжка дыхаць. Фашысты шалеюць. Ганенне можа абярнуцца трагедыяй. Зімой 1933 года — Гітлер на парозе ўлады — на адным з літаратурных вечароў Рэмарк атрымлівае ад сябра запіску: "Тэрмінова пакідай горад!". Не зазірнуўшы нават дахаты, Рэмарк едзе ў Швейцарыю.

10 мая 1933 года Гебельс абвясціў у Германіі "Свята кастра". Напачатку ў вогнішча трапіла адна тысяча кніг 250 забароненых аўтараў. У першай дзесятцы была і кніга Рэмарка "На Западном фронте..." Галоўны касцёр палыхаў на плошчы Оперы. Падчас прамовы Гебельса чуліся выкрыкі: "Хай жыве высакародства чалавечай душы!"

Своечасова пакінуў Германію Эрых Рэмарк. Сусветная слава пісьменніка прымусіла фашыстаў пайсці на неверагодную акцыю: Герынг паслаў да яго свайго прадстаўніка з прапановай вяртання на радзіму. "65 миллионов только и думают, как им выбраться из страны, а я добровольно должен вернуться туда? Ни за что на свете!" Пасля гэтага фашысты пазбавілі яго грамадзянства. Тлумачэнне і падаплёка: "При поддержке еврейской прессы Эрих Ремарк годами самым низким и подлым образом глумился над памятью павших в Мировой войне и уже тем самым поставил себя вне сообщества, называемого немецким народом". Ён стаў грамадзянінам Амерыкі, Панамы і Швейцарыі. Кожная з гэтых краін прадаставіла яму сваё грамадзянства.

У Амерыцы Рэмарк піша "кнігі выгнання" — "Возлюби ближнего" і "Триумфальную арку". А ўжо пасля Вялікай Айчыннай вайны — "Время жить и время умирать", "Жизнь взаймы", "Ночь в Лиссабоне", "Тени в раю" — горкія, маркотныя і светлыя кнігі, дзе пераплятаюцца вайна і мір, гнёт і воля, каханне і бяда. Аб чым бы ён ні пісаў, за плячыма ў яго стаялі тысячы яго братоў, якія загінулі на вайне; тысячы пакутнікаў, вымушаных жыць, кахаць і сумаваць далёка ад радзімы.

* * *

Ён шырокавядомы, славуты, яго кнігі ведае ўвесь свет, урэшце шчаслівы ў сям'і; ён спазнае "момент истины" — абмяркоўваецца яго вылучэнне на Нобелеўскую прэмію... А для нас ён, па нашых гадах юнацтва, быў пісьменнікам "нашай", галоўнай кнігі — "Три товарища". У адным шэрагу са "Спартаком", "Оводом", "Дванаццатью стульямі" і "Тремя мушкетёрами".

"Три товарища" — пароль сяброўства, адданасці, братэрства. У пасляваенныя гады, падчас нашай маладосці, вышэй за гэтыя каштоўнасці нічога не было. Як не было і няводнага чалавека побач, хто б не прачытаў гэту кнігу, у якой цэлы свет: і занядбаны аўтамабіль "Карл", і апошні рамантык Германіі — Ленц... А кальвадос! Гэта чароўнае слова прынеслі да нас у студэнцкі інтэрнат Рэмарк і тры яго героі. З таго моманту мы не пілі нічога іншага, а толькі высакародны "кальвадос", чым бы ні напаўняліся гранёныя шклянкі. Ад іх жа, "товарищей" Рэмарка, мы ўсвядомілі адну з галоўных мужчынскіх ісцін: прайграваць трэба ўмець. А тых, хто не прайграе, у жыцці не бывае. І ў сітуацыях пройгрышу — ці ў карты, ці ў каханні — мы казалі "голасам" Рабэрта ці Ленца: "А не выпить ли нам кальвадосу?" Канечне, можна іншы раз і выпіць, але ніколі не варта напівацца — гэтаму таксама вучылі "Три товарища". А яшчэ яны вучылі высакароднасці ў каханні да жанчыны, "істоце з іншага свету", і — няма нічога вышэй!

У невялікім вестыбюлі музея Эрыха Рэмарка размяшчаюцца даведачная і крама: кнігі пісьменніка, буклеты, плакаты, праграмы канферэнцый і семінараў, а таксама праспекты на нямецкай, англійскай, французскай, іспанскай, партугальскай, італьянскай, галандскай, турэцкай, рускай мовах. У зале вялікая, на паўсцяны, дыяграма выданняў Рэмарка ў розных краінах свету: чатырнаццаць разоў яго кнігі з пятнаццаці ім напісаных, выдаваліся ў СССР амаль кожны пасляваенны год.

Два ўзроўні музея — шэсць прыступак па лесвіцы — гэта шэсць прыступак да чалавека з'явы. На другім узроўні музея ў вітрынах, на стэндах: дакументы, фатаграфіі, кадры кінахронікі, якія знаёмяць з дзяцінствам і юнацтвам Эрыха Марыі Рэмарка.

...Рэмарк пасля заканчэння народнай школы працягвае вучобу, становіцца настаўнікам. У лістападзе 1916 года ён прызываецца на вайсковую службу, трапляе на Заходні фронт. А праз восем месяцаў, паранены, трапляе ў шпіталь у Дуйсбургу. Потым будзе камісаваны.

Ён ураставаўся ад снарадаў, але, як пасля напіша, стаў "ахвярай вайны назаўсёды".

Вярнуўшыся ў Оснабрук, пэўны час працаваў настаўнікам. А пасля, кім ён толькі ні быў — бухгалтарам, рэпетытарам, арганістам, гандлёвым служачым і нават прадаўцом помнікаў і магільнай пліткі. Менавіта ў гэты цяжкі для яго час ён даведваецца, што ўзнагароджаны "за мужнасць у баі" Жалезным крыжам 1-й ступені. Аднак Рэмарк адмаўляецца ад узнагароды. Ён ненавідзіць вайну і не жадае прымаць узнагароду за кроў.

У "Черном обелиске" пісьменнік апавядае аб гэтым. Яшчэ праз тры гады Рэмарк — складальнік рэкламных тэкстаў, а пасля рэдактар гановерскага часопіса. У 1925 годзе — рэдагуе спартыўны часопіс у Берліне. У гэты ж час ён выдае свой першы раман "Мансарда снов" і ўпершыню падпісваецца Эрыхам Марыяй Рэмаркам. Гэта быў "арыстакратычны" перыяд у яго жыцці. Ён быў прыгажунчыкам, і ўсё жыццё яго суправаджалі прыгожыя жанчыны. Але ці многія з іх разумелі стан яго душы?

Ён ужо дабра зарабляў, модна апранаўся, бавіў час у тых месцах, дзе бавілі яго і гаспадары жыцця. Эрых Рэмарк ажаніўся з першай сталічнай прыгажуняй Ютай Цамбоне. Аб ёй дакладна сказала другая яго жонка Рут Альбу: "Он был влюблён в её красоту. Всегда. Любил окружать себя красивыми вещами". Пра пісьменніка ў яе ўспамінах ёсць і наступныя радкі: "До беспамятства был влюблён в одиночество. Закутывался в него, словно в свои элегантные кашемировые пуловеры..." Тым не менш, гэта быў час знаёмства з арыстакратычным светам Берліна і пачаткам яго донжуанства.

Другая жаніцьба адбылася ў зорную часіну яго творчасці: ў 1929 годзе друкуецца раман "На Западном фронте без перемен", які быў напісаны за паўтара месяца. Гэткі кароткі тэрмін тлумачыцца тым, што аўтару нічога не трэба было выдумляць. Вось так ён і пераўвасобіўся ў летапісца Першай сусветнай вайны.

Яшчэ праз год пасля выхаду рамана ён жэніцца з маладзіцай, узыходзячай зоркай берлінскага тэатра дзевятнаццацігадовай Рут Альбу. Добра адукаваная, выхаваная ў асяродку людзей мастацтва, Рут фарміруе густы свайго мужа: знаёміць з вядомымі мастакамі і артыстамі, уводзіць у вышэйшыя кругі Берліна. Свайго "першага" Ван Гога ён купіў па парадзе Рут. З таго часу і ўсё жыццё каштоўныя творы мастацтва — карціны, дываны, кніжныя рарытэты... — суправаджаюць Рэмарка. Рут жа прымусіла яго набыць вілу пад Асконай у Порта-Ронка, у якой ён пражыў сорак гадоў. Вось і жыць-пажываць бы яму з Рут... Не атрымалася... Пасля пабылі ў ліку вельмі блізкіх знаёмых і нават у жонках знакамітыя і славутыя — кіназорка Марлен Дзітрых, пляменніца рускага цара Аляксандра III прынцэса Наталі Палей, галівудская зорка, былая жонка Чарлі Чапліна Палет Гадар. Яна была маладзейшай за пяцідзесяцітрохгадовага Эрыха Рэмарка на дванаццаць гадоў. Яна вывела пісьменніка з дэпрэсіі, у якую яго ўвагнала фашысцкая Германія, і стала яго трэцяй жонкай, а ён яе чацвёртым мужам і бліскуча сыграла адну з галоўных роляў у галівудскай экранізацыі рамана "Время жить и время умирать". Кінакарціна атрымала найвышэйшую прэмію — "Оскар", што яшчэ больш узрушыла страсці вакол Рэмарка. А з Палет Гадар яны шчасліва пражылі дваццаць гадоў.

У 1964 годзе Эрыху Рэмарку споўнілася шэсцьдзесят пяць гадоў. Оснабрук узнагароджвае земляка найвышэйшай узнагародай — медалём імя Мёзера. Дэлегацыя горада прыязджае ўручаць яго ў Швейцарыю, у Порта-Ронка. Праз тры гады туды ж, але ўжо дэлегацыя Бундэстага, прывязе Рэмарку Вялікі крыж "За заслугі перад ФРГ". Толькі адзін раз за ўвесь час эміграцыі ён наведаўся ў Германію, калі памёр бацька. Ён прыехаў у маленькі Ротэнфельд, што непадалёк ад Оснабрука, але афіцыйна ў родны горад не паехаў.

За восем гадоў да смерці (памёр у 1970 годзе) у інтэрв'ю "Цюрихской неделе" Эрых Рэмарк сказаў: "Правительство ФРГ предъявило мне своего рода ультиматум: вновь принять западногерманское гражданство или оставаться "высланным" из Германии. Лишили меня гражданства нацисты и, насколько я знаю, это решение никогда не пересматривалось. Тогда меня сделали гражданином мира против моей воли. Теперь я — гражданин мира по своей воле". А за чатыры гады да смерці ў адным з інтэрв'ю пісьменнік падкрэсліць: "Насколько я знаю, ни один из организаторов массовых убийств третьего рейха не был лишён гражданства. Итак, эмигранты стоят ниже".

* * *

...Рэмарк. Легенда. Здаецца, што ён жыў далёка ад сённяшняга дня, як усе вялікія творцы. А ён жыў "паралельна" з намі. Многія гэтага не ведаюць. Праз чатырнаццаць гадоў пасля яго смерці ў Оснабруку было заснавана таварыства Эрыха Марыі Рэмарка. Яшчэ праз дванаццаць — быў адкрыты цэнтр, названы яго імем, а ў 1991 годзе горад устанавіў прэмію Рэмарка. Яе ўдастойваюцца літаратурныя, журналісцкія і навуковыя працы на антыванныя тэмы.

P.S. *У 1943 годзе была пакарана смерцю сястра Рэмарка Эльфрыда Шольц — за тое, што назвала Гітлера нягоднікам. На самай справе, яе пазбавілі жыцця, помсцячы Эрыху Рэмарку. Імем Эльфрыды Шольц названа адна з вуліц Оснабрука.*

Навум ЦЫПІС

Павел САКОВІЧ

Эпіграмы як рэкламы

Анатолю Аўруціну



Ён піша вершы, не спыняецца:
Працэс, напэўна, падабаецца.
Таленавіты, непаседлівы,
Мо для каго і надаедлівы.
Ды хоць зайздроснікі
яму і шкодзілі,
Ён як перпетуум...
Адно — без НОБЕЛЯ.

Леаніду Дайнеку



Ён знаў, калі гарэлку гнаў,
Што ўся па шклянках
разальецца
Сам піў яе — не шкадаваў,
Прытым зусім не сумаваў:
Напісанае ж — застанецца!

Мікола ШАБОВІЧ

Сяргею Давідовічу



Забыць яго няма падставы:
Куды ні глянь —
паўсюль выставы!
Ён і ў паэзіі, прызнацца,
Гатоў штодзённа выстаўляцца.

Кастусю Жуку

Хоць і не вернуцца часінкі,
Як долу гнуліся "лазінкі", —
Нашчадкі ўспомняць, без сумніву,
Твой "Яблык белага наліву".

Мікола ПАДАБЕД

Туфлі з-за бугра

Неяк завітаў да свайго дзеда ўнук Юрка дый кажа:

— Дзед! Родненькі, даражэнькі! Дай мне дзвесце тысяч рублёў.

— Ну апетыт у цябе, саколік! А навошта ж столькі?

— На туфлі.

— Табе ж нядаўна маці купіла.

— Няхай сама іх носіць. Нямодныя. Сорамна абуць. Нават куры засмяюць. А я хачу такія, каб ні ў кога падобных не было.

— Ага... Улавіў... Не хвалюйся, Юрка! Будуць у цябе такія туфлі.

— Гэта — праўда? Няўжо мая мара збудзецца? Мілы дзядуля, толькі маху не дай! Купі туфлі імпартныя, арыгінальныя і з натуральнай скуры.

— Добра, Юрачка, добра. У блін разаб'юся, а выканаю твой заказ.

— А дзе ты іх возьмеш?

— Камерцыйная тайна.

Як толькі Юрка шмыгануў за дзверы, бабка Ганна, нібы падкалодная змяя, зашыпела на Сцяпана Васільевіча:

— Ты чаго, трухлявы пень, хлопцу мазгі пудрыш?! Хіба ж у нас можна такі абутак дастаць? Яго днём з агнём не знойдзеш. Лепш аддаў бы яму грошы. А то не ўладзім, пакрыўдзіцца.

— Не з тваімі курынымі мазгамі вучыць мяне! — агрызнуўся стары. — Я сам разбяруся!

— Ну і ўпарты, як казёл. Нават і слова нельга сказаць...

Сцяпан Васільевіч узяў веласіпед і пакаціў да ўрочышча Бугор. Там нарэзаў маладых ліпак, надраў лыка і сплёў лапці. А праз тры дні аднёс унуку. Убачыўшы падарунак, Юрка ад радасці аж запляскаў у далоні:

Ай-яй-яй! Вось гэта туфлі! Проста супер! Якраз такія, якія я хацеў. Сёння прашвырнуся ў Дом культуры на танцулькі. Сябры, як убачаць мяне, ад зайздрасці будуць кусаць свае локці, а дзяўчаткі — слінкі глытаць. Бо ні ў каго такіх няма. Дзякуй, дзядулька, дзякуй. Стрымаў сваё слова. Ты ў мяне самы лепшы ў свеце. Дарэчы, а адкуль прывёз іх?

— З-за Бугра.

— Значыць, ты скокнуў за мяжу? Ай жа, малайчына! А як табе ўдалося так хутка вярнуцца? Мо, на самалёце лятаў?

— Не, унучак, не-е-е. На веласіпедзе ездзіў.

— Не залівай, дзядуля. Думаеш, я і паверыў. Ну і жартаўнік. Мастак байкі баіць... Вядома, туфлі класныя. Толькі я не ўмею імі карыстацца.

— Гэта не бяда. Навучу. Тут шмат розуму не трэба. Ужо сёння будзеш выпендрывацца перад дзяўчатамі ў модных туфлях...

Назаўтра ранічкай Юрка прыбег да Сцяпана Васільевіча. На твары — сонечная усмешка.

— Дзе-ду-у, дзе-ду-у! — раздаўся яго зычны голас. — Ёсць вялікая просьба!

— А якая, унучак?

— Дастань яшчэ 20 пар туфель. Такіх, як мне. Умеюць там жа, за бугром-мяжой, рабіць цудоўныя рэчы. Нашым бы павучыцца ў іх.

— А навошта табе столькі?

— Учора хлопцы, як убачылі мае новыя туфлі, то ледзь з ног не сцягнулі. Вельмі спадабаліся. Прасілі, каб ты і ім прывёз. А цана ім па барабану. За кожную пару адсцягнуць не менш за сотню долараў. Ну як, дамовіліся? Ці "бабак" малавата? То накінуць. Бацькоў сваіх на вушы паставяць, а валюту з кішэняў вытрасуць. Згаджайся, дзеду!

У адказ Сцяпан Васільевіч загадкава ўсміхнуўся ў рыжыя вусы і прабубніў сабе пад нос: "Шанц не трэба ўпускаць. Ёсць унікальная магчымасць усіх моднікаў абуць у лапці".

Міхась СЛІВА

Сучасная казка

Начальнік канторы Мядзведзь быў вельмі заклапочаны.

— Трэба тэрмінова ехаць камусьці ў камандзіроўку! — звярнуўся ён да падначаленых.

— Ой, Міхаіл Патапавіч! — адразу ўскочыў Воўк. — Мне паабяцалі на гэтым тыдні прывезці будаўнічыя матэрыялы на дачу. А паеду — прападзе ўся задума.

— Тады, можа вы? — з надзеяй зірнуў Мядзведзь на Ліса і Зайца.

— Што вы, Міхаіл Патапавіч! — у адзін голас ускрыкнулі тыя. — Заўтра ж гуляе наша любімая каманда "Палясоўшчык". Прапусціць гульню — ды лепш з работы звольніце!

— А як Бабёр?

— Я з жонкай паслязаўтра ў тэатр іду. Упершыню за паўгода сабраліся, жонка ўжо вушы пратрубіла. І білеты ў кішэні.

— Што ж, давядзецца ехаць самому, — сказаў Мядзведзь. — Дарэчы, камандзіроўка на паўднёвы бераг Крыма. На месяц...

Амброзь КАРШУНЬСКІ

Якія сны сняцца творцам:

Георгій Марчук першым з беларускіх творцаў атрымаў Нобелеўскую прэмію 3008 года. Гэтак ацэнена давыд-гарадоцкая мудрота яго афарызмаў;

Алесь Камароўскі правёў тэлерэпартаж з сустрэчы каманд старога і новага пісьменніцкіх саюзаў. Злаваўся на гульню. І тыя і гэтыя шмат б'юць па сваіх жа варотах;

Уладзімір Скарынкін пачаў перакладаць Андрэя Скарынкіна на мову Дантэ;

Віктар Ярац урэшце прымірыў пісакаў, што не трапілі ў яго класічную "сотку", увёўшы іх у склад будучай "дзесяткі";

Яўген Хвалей нарэшце трапіў на прыём караля Іспаніі;

Леанід Дайнека наладзіў вытворчасць новага напою, настоенага на жалезных жалудах;

Алесь Масарэнка стварыў сапраўдны элексір творчай маладосці, паядналаўшы бабровы струмень з бабровай слязою.

(Працяг будзе)

Валерыя МІХНО

Развод

Працуе Пчолка цэлы дзень,
Каб назбіраці мёду,
А Труцень есць і кажа:
— Страва дрэнь,
не тая асалода.
Ты не Пчала —
сама лянота!
Мне нават есці не ў ахвоту
Той мёд, што ты кладзеш у соты.
Пабач, вунь як жыве братуха
З сваёю жонкай — шызай Мухай.
Штодзень —
то свята на двары,
Ля іх натоўпамі сябры...
А ты, халера пабяры,
Скажы, чым корміш,
верціхвостка?
Я хутка высахну на костку,
Мне мёд ужо не лезе ў рот.
Усё, Пчала, — бяру развод. —
Сагнуўся у баранні рог
І шмыгнуў да суседзяў на парог.
А Муха перад носам
дзверы зачыніла
І госця ў хату не пусціла.

Калі ў дварах чужых
шукаеш шчасця,
Самому, Труцянёк,
не доўга запрапасці.

Пятро РАДЗЕЧКА

О, дайце, дайце мне прастору!

Я ёсць, я дзікі, я сабака,
Дакуль я помню, я ім быў.
З людзей нікога не любіў
І з іх па мне ніхто б не плакаў.

Павал Змітрук



Наколькі помню, быў сабакам,
Бо нарадзіўся ў кануры...
Не знаў работы аніякай,
Апроч, як гаўкаць на двары...

Ды ўсё ж скажу:
Хваліцца нечым! —
Што за жыццё у кануры?
Умоў ніякіх чалавечых...
А я ж умею гаварыць!!!

Бывае й вершык занатую,
Калі душа праявіць спрыт!
Але ж гады ішлі ўпустую —
Заеў ушчэнт сабачы быт!

Парою — рыфмы супраць волі
Ляцяць, ляцяць.
Як коней цуг...
А я стаю ўсё на прыколе,
Абмежаваў шляхі ланцуг!

Калі б замест касцей мне мяса,
І гранты выдалі калі б —
Я змог бы асядлаць Пегаса
І ўзяць кірунак на Алімп!!!

Хацеў бы я пабыць на моры,
Там закахацца, як паэт...
О, дайце, дайце мне прастору —
Я гаўкну так — Пачуе свет!!!

Шаржы Алега КАРПОВІЧА

№ 30 25 ліпеня 2008 г. Літ

Вядзе наперад дарога... Крок за крокам... Метр за метрам... Ты яшчэ не ведаеш пэўна, што чакае цябе вунь за тым паваротам, за гэтай каржакаватай ялінай. Але не сумняваешся — абавязкова нешта новае, штосьці дагэтуль нязведанае.

У такую няблізкую дарогу і выбраўся я аднойчы з бацькамі. Вядома, пехам... Мы ўтрох, а яшчэ — звычайная каляска...

Сабраліся ажно ў самае Пузава. Там, казалі добрыя людзі, гуркоў неблагіх можна купіць. Крамяных, моцных, сама на засол. Ад Комсіч, дзе мы тады жылі, гэта няблізка. Асабліва па тагачасных маіх меркаваннях, а так, дык кіламетраў з дзесяць набярэцца. Спачатку прасёлкавай дарогай — звычайнай, пыльнай. Потым — даволі ўезджанай гравійкай: ідзе яна з саміх Цімкавіч. З левага боку пакідае Комсічы, Славінку, з правага — Браткава.

Недзе за Славінкай — невялікім, у адну вуліцу, пасёлкам, дарога гэтая бы вострым вялізным нажом разразае на дзве паловы лес. Векавыя яліны суседнічаюць з крыху сарамяжнымі маленькімі бярозкамі, што, прытуліўшыся да іх, таксама цягнуцца ўгору, да сонца...

Праз колькі часу, калі мы, здарожаныя (вядома, больш за ўсіх быў стомлены я), вярталіся назад, і сонца, таксама стомленае за дзень, бляклымі промнямі сваімі кранулася купчастых вершалін самых высокіх дрэў, а першая вечаровая прахалода лёгкім ветрыкам казытала твар, харашынь гэтая стала асабліва вабнай.

Шмат потым было ў мяне, як і ў кожнага, для каго жыццё толькі яшчэ пачынаецца, іншых дарог, куды больш далёкіх, якія таксама вялі наперад, пашыраючы ўяўленне аб тым, што атуляе цябе. Уваходзілі ў свядомасць новыя назвы вёсак і вёсачак — Піліпавічы, Гулевічы, Вялікая Раёўка, Дягцяныя, Кукавічы... Пузава неўзабаве стала .. Вясёлае — якраз пачалі перайначваць назвы некаторых населеных пунктаў, але фантазіі ў тых, хто рабіў гэта, не заўсёды хапала дый не надта стараліся яны падшукаць нешта арыгінальнае, таму і пачалі з'яўляцца, бы грыбы пасля спорнага дажджу, дзесяткамі падобныя Вясёлыя, Лясныя, Азёрныя. А Крывасёлкі, куды неўзабаве пераехалі мае бацькі-настаўнікі, і дзе я заканчваў сярэднюю школу, сталі Навасёлкамі.

Гэта ўсё адтуль, сапраўднае

Тое, што ўмясцілася ў сэрцы

Дарога на Пузава... Хіба мог падумаць я тады, дый пазней яшчэ, што праз некаторы час яна запомніцца назаўсёды, бо стане для мяне не толькі адной са шматлікіх жыццёвых сцяжынак, але і вялікай дарогай у неабсяжны свет творчасці Кузьмы Чорнага. Спачатку адчуў вабную сілу і харство ягоных апавяданняў, якія слынны майстра пісаў для дзяцей — "Юзік і Рыгорка", "Сцяпанавы дзеці", а таксама аповесці "Насцечка", а неўзабаве прачытаў і "праграмны" для школы на той час раман "Трэцяе пакаленне". Будуць уваходзіць у маю свядомасць героі любімых твораў пісьменніка. І вось аднойчы, здзіўлены, я даведаюся, што ён, Мікалай Раманоўскі, нарадзіўся ў тутэйшых мясцінах. Працаваў у Цімкавічах. Меў шмат добра знаёмых і сяброў у Комсічах, Браткаве, у тым жа Пузаве, "маіх" Крывасёлках.

Сапраўднае чалавечае шчасце далучанасці лёсам сваім да жыцця вялікага земляка, перажыву ў хвіліны, калі шчымлівай радасцю ўвойдуць у душу радкі, сказаныя ім, непаўторным Кузьмой Чорным, у гады вайны: "Учора ўночы паведамілі ў зводцы, што ўзялі Цімкавічы, Вялікую Раёўку, Жавалкі. Родныя мае мясціны... Як мая душа рвецца туды! Яна заўсёды там. Там жывуць усе мае персанажы. Усе дарогі, пейзажы, дрэвы, хаты, чалавечыя натуры, пра якія калі-небудзь пісаў. Гэта ўсё адтуль, сапраўднае".

Асабліва ж мелодыя гэта адчувальна ў тым, што пісалася ў гады вайны, калі думкамі, сэрцам пісьменнік быў са сваімі землякамі:

"Тут крыжуецца з шашою вялікі грунтавы шлях з Палесся. На поўдзень ад шашы ён вядзе на Вызну, Морач, Страхінь і Орлік і ўваходзіць у самыя Агаркаўскія балоты. На поўнач жа ад шашы, пасля свайго перакрыжавання з ёю, шлях ідзе на Семежава, Лешню, Цімкавічы, Капыль, Старыцу, Перавоз, Самахвалавічы і такім парадкам кіруецца на Мінск... Крыжуецца тут з шашою і яшчэ адна, не менш вялікая дарога. Яна ідзе недзе з мясцовасці паміж Бабруйскам і Гомелем. Недзе адтуль, дзе хвоя саступае месца ясеню і дубу, і дзе менш цудоўнай мяккай пахмурнасці і задуменнасці ў пейзажы, як у тых укрытых хвояй краявідах, куды ідзе яна цераз шашу. Гэтая дарога, няроўная, выкручастая і больш ціхая, чым людная, канчаецца недзе паміж Нясвіжам і Клецкам, праходзіць праз Цапру і Балвань і такім парадкам злучае дзве адлегласці нашай Бацькаўшчыны...".

У тым жа рамане "Пошукі будучыні" адзін з герояў Акаловіч разважае, як лепш дабрацца яму. Спачатку вырашае: "Пасля Слуцка праз Селіцкія крыжы, Лядныя, Гулевічы, Піліпавічы і кіламетраў сорак не даходзячы да Сіняўкі..." А потым схамянуўся: "Мусіць-такі, я пайду з-пад Гулевіч на Цімкавічы, на Пузава...".

Зашмат цытую Кузьму Чорнага. Але што зробіш, калі так часта гучаць у яго творах назвы мясцін, блізкіх і дарагіх мне. Гэта ж з Піліпавіч дабіраўся студэнтам у Мінск аўтобусам ці на спадарожнай машыне... З Селішчаў — родам мой бацька. У Гулевічах школьнікам грузіў цэглу для калгаса... Праз Сіняўку вяла дарога да маёй першай журналісцкай работы ў Драгічыне...

Атрымліваецца вялікі, своеасаблівы шматкутнік на карце Беларусі, звязаны з жыццём Кузьмы Чорнага, а правільней, з жыццём ягоных герояў. Як незабыўны Іван Мележ пісаў з асаблівым захапленнем пра сваіх палешукоў, так яго выдатны папярэднік Кузьма Чорны дасканала ведаў сваіх цімкаўцаў. Няважна, што адны з іх жылі ў саміх Цімкавічах, другія — у Гулевічах, ці Семежаве, Вялікай Раёўцы альбо ў Крывасёлках... Усе яны былі з багатай, урадлівай слуцкай зямлі. Гэта пазней пачалі ўжо называць — Капыльшчына, Старобіншчына (цяпер Салігоршчына), Старадарожчына. Раней была адна Случчына. І слуцака можна было лёгка пазнаць, дзе б яго ні напаткаў. Трэба было толькі ўважліва паглядзець, як есць ён сала. Калі бярэ вялізны кавалак хлеба і маленькі скрылёчак — смела можна называць любую мясцовасць, толькі не Случчыну. А вось сядзіць задаволены мужык на возе, смачна прыцмоквае губамі, трымаючы ў правай руцэ вялізны кус сала, а ў левай малюсенькую скарыначку, з кім хочаш спрачайся, — слуцак гэта. І ніхто іншы! З зямлі ўраджайнай тутэйшы чалавек, з зямлі, што любіць людзей працавітых.

Новая старая зямля

Хто не быў у Цімкавічах некалькі гадоў, завітаўшы сюды, не пазнае іх. Асабліва тую частку, што знаходзіцца бліжэй да вёскі Чаргагубава. У аграгарадку штогод будуецца не адзін дзесятак дамоў-катэджаў. Усе яны як на падбор. І не цягнуцца абапал доўгай вуліцы, нібы збіраючыся абагнаць адно аднаго, а размясціліся ў шахматным парадку. Тэрыторыя ж паміж імі добраўпарадкавана, сям-там размяшчаюцца пляцоўкі для дзіцячых гульняў. А галоўнае — ідэальная чысціня. Зімой жа, калі выпадае снег, усе вуліцы ачышчаюцца. І не толькі ў саміх Цімкавічах, а і ў іншых вёсках, што ўваходзяць у склад тамашняга сельсавета.

Старшыня яго Алена Вострыкава невыпадкова атрымала вышэйшую адукацыю ў тагачасным Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя А. Горкага па спецыяльнасці беларуская мова і літаратура. Адчувае яна роднае слова, шануе яго. Сама з задавальненнем перакладае на беларускую мову тыя п'есы, што ідуць у Цімкавіцкім народным тэатры.

Дарэчы, тэатр гэты — цэлая гісторыя. Бярэ свой пачатак з 1918 года, калі ўзнік драматычны гурток. Сярод першых цімкавіцкіх акцёраў была і сястра Кузьмы Чорнага Ганна Карлаўна. Ля вытокаў тэатра стаяла заслужаная настаўніца БССР Зінаіда Раманенка. Яна доўгі час з'яўлялася ягоным кіраўніком. Званне народнага тэатра было прысвоена яшчэ ў 1967 годзе. Праўда, пасля таго як Раманенка пайшла на пенсію і пераехала ў Мінск, тэатр перажываў не лепшыя часы.

Цяпер у самадзейным калектыве, дзе змянілася не адно пакаленне акцёраў, чарговы ўздым. У спектаклях ахвотна прымаюць удзел тыя, хто захапляецца сцэнічным мастацтвам. Прапанавалі выступіць і Вострыкавай. Праўда, яна адмовілася. Спаслалася не на занятасць на асноўнай працы, што, безумоўна, не прэчыла б ісціне. Паўплывала на адмову Алены Мечыславаўны іншая прычына. У адным са спектакляў народнага тэатра ёй адводзілася роля легкадумнай жанчыны. Толькі, як кажуць, гэта не яе амплуа.

Дарэчы, калі адкрывалі аграгарадок, толькі з-за межаў капыльскага раёна паступіла больш як 100 заяў з просьбай атрымаць права на месца жыхарства менавіта ў Цімкавічах. Безумоўна, людзі невыпадкова імкнуцца сюды: усё ж сёння хочацца жыць не ў горшых умовах, чым у горадзе. Аднак ёсць на тое яшчэ і іншая прычына. Закрытае акцыянернае таварыства "Капыльскае", а яно, нягледзячы на такую назву, знаходзіцца менавіта ў Цімкавічах, не толькі славіцца ў раёне, а і з'яўляецца адной з лепшых гаспадарак Міншчыны.

Не ўсё кепска, што «Раньш было»

Цімкавічы сёння — новыя, але яны і ранейшыя, бо гэта ўсё адно — чорнаўскія Цімкавічы. Але, на жаль, цяпер я завітваю сюды куды радзей, чым хацелася б. Ужо больш як дзесяць гадоў ніхто мяне ў Навасёлках не чакае — састарэлых бацькоў забрала ў Мінск мая сястра, дзе бацька пражыў усяго каля сямі месяцаў. Мама, на шчасце, жывая, нядаўна ёй споўнілася 88 гадоў. Сваякоў жа ў Навасёлках у мяне няма. А так заўсёды адпачынак праводзіў у бацькоў. Часам садзіўся на веласіпед і ехаў не толькі ў Цімкавічы, а і ў Капыль — у адзін канец не так і шмат, кіламетраў дваццаць з невялікім.

Чорнаўскія Цімкавічы — гэта колішні цэнтр вёскі. Ён праўда, мала змяніўся: некалькі магазінаў, клуб, будынак сярэдняй школы, непадалёку ад яго літаратурны музей Кузьмы Чорнага. Крыху далей — аўтобусная станцыя. Хіба што некаторыя будынкі адрамантаваны, пераабсталяваны, а то і памянялі сваё прызначэнне. І гэтаксама, як у гады майго маленства, поруч з могілкамі ёсць сцежка, што вядзе да рэчкі. Могілкі, праўда, ужо паўзабытыя, рэчка, як і шмат дзе, бадай, адна толькі назва. А на маёй памяці — прыгадваецца ледзь-ледзь — тут працаваў вадзяны млын і вада ў бушылаўскай рэчцы ("Бушылава — гэта кусты каля Цімкавіч, — тлумачыў Кузьма Чорны ў нарысе "У роднай глушы", напісаным у 1927 годзе) была вірлівай, можна было нават тут, побач з мостам, пакупацца.

Дарэчы, пра могілкі. Да 1985 года на іх стаяў касцёл Святога Міхаіла — адзін з самых выдатных архітэктурных помнікаў не толькі Беларусі, але і ўсяго славянства. Польскія даследчыкі, уражаныя аздабленнем яго інтэр'ера, параўноўвалі Цімкавіцкі храм з Францысканскім касцёлам у Кракаве, афармленым сусветна вядомым жывапісцам Станіславам Выспяньскім. Над упрыгожваннем гэтага помніка беларускага драўлянага дойлідства працаваў чалавек знакаміты — Францішак Бруздовіч. На адным з шасці званоў значылася: "1648". Сам жа храм — спачатку гэта быў касцёл, потым яго перабудавалі ў царкву — прыняў вернікаў на год раней. На жаль, цуд архітэктуры згарэў, бо своечасова не быў узяты пад належную ахову дзяржавы.

Калі ісці па дарозе, што вядзе ў бок Браткава, на якой праз некалькі кіламетраў, злева — паваротак на Комсічы, а пасля іх ужо і "мае" Навасёлкі, — вёска Агароднікі, што ўпрытык падышла да саміх Цімкавіч. Калісьці, вельмі даўно, пачалі тут выраб ільняных сурвэтаў, чым Агароднікі і праславіліся. Пра гэта можна прачытаць у нарысе Кузьмы Чорнага "Слуцкія сурвэты". Гэтай справе ў Агародніках першым навучыўся нехта Міхалевіч. А пасля пад ягоным наглядам і паводле яго планаў Радзівілы, якім тады належалі Цімкавічы і навакольныя вёскі, пабудавалі тут сурвэтную майстэрню. У свой час у музей Кузьмы Чорнага паступіў абрус, які некалі выткала маці пісьменніка, — яго падарыла колішняя суседка Раманоўскіх Марыя Даменя.

А ўвогуле прыемна пахадзіць у ваколіцах Цімкавіч, асабліва прайсціся там, дзе ў свой час бываў Кузьма Чорны. Недаравальна не зазірнуць і ў Доўтае. Па той прычыне, што адразу за гэтай вёсачкай пачынаецца Скіп'ёўскі лес. Апісаннем тутэйшых краявідаў пішменнік, як вядома, пачынаў свой аднайменны раман. Ёсць у гэтым творы і такія радкі: "Усе дваццаць дзве хаты Скіп'ёўскага Перабродцзя пабарасталі вішняком і арабіннікам. За хатамі спеюць улетку антонаўкі, папяроўкі і слуцкія бэры, і да самых замаразкаў вісяць у голлі чырванабокія "цыганкі". Да самых маразоў цвіце бабіна лета".

"Скіп'ёўскі лес" ён пісаў да свайго апошняга ўздыху. 22 ліпеня 1944 года зрабіў апошнюю занатоўку ў дзённіку, завяршыў некалькі старонак гэтага рамана. Застаўся недапісаным сказ, як адчуў сябе блага, а пад вечар Кузьмы Чорнага не стала.

* * *

Пакідаў я Цімкавічы з рознымі пачуццямі. З радасцю, бо чарговы раз сутыкнуўся з тым, што назаўсёды прапісалася ў маёй душы. Са смуткам, што многае змянілася тут. А яшчэ напаўняла сэрца спадзяванне, што пройдзе некаторы час і будзе зроблены істотны крок па далейшым ушанаванні памяці знакамітага земляка. Я не пра тое, каб ЗАТ "Капыльскае" атрымала найменнне імя Кузьмы Чорнага. Канечне, гэта было б ідэальна, ды столькі часу і выдаткаў выкліча пераафармленне. А вось, пры жаданні, не складана ўстанавіць імянныя стыпендыі лепшым вучням Цімкавіцкай сярэдняй школы. За кошт мясцовай гаспадаркі. Сума набяжыць нязначная, а справа будзе зроблена вялікая.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Спадчына

Яшчэ адзін верш Міколы Купрэева

Штодня ў рэдакцыю прыносяць, як мінімум, дзве новыя кніжкі. Часцей за ўсё са шчодрымі высокапарна-рытарычнымі аўтографамі, як нейкай маленькай зарукай (ці авансам) на будучы цёплы водгук, рэцэнзію, а то і "кулуары". Я ўжо аброс гэтымі кніжкамі, як бядняк пазыкамі...

Але як жа радуешся кожнай нечаканай знаходцы хоць бы аднаго, пажоўклага ад часу, рукапіснага аркуша сапраўднай Паэзіі!

І вось нядаўна такая ўдача мяне напаткала. Ужо гадоў некалькі зрэдку лістуюся з адным з найбліжэйшых сяброў Міколы Купрэева журналістам з Івацэвічаў Мікалаем Мікалаевічам Рымачам (дарэчы, у адной з аповесцей Купрэева выведзены яго прататып пад прозвішчам Чамыр; і тут, трэба зазначыць, паміж сябрамі адбылося першае і, бадай, крыўдлівае непаразуменне, бо Купрэеў паказаў у творы свайго нацыянальна заангажаванага сябра ў негатыўна-парадыйным свеце, а на пытанне: *"Чаму?!"* — вінавата папрасіў: *"Не сярдуй, так трэба было... Вып'ем?.."*) Ужо амаль чатыры гады як няма Купрэева, цяжка хварэе апошнім часам і яго лепшы сябар Рымач. Але між іншым, паціху знаходзіць ён у сваіх архівах нейкія рэчы і запісы Міколы Купрэева, які, наведваючы радзіму свайго юнацтва, часта жыў у Міколы Рымача па тыдні і больш у асобна выдзеленым пакойчыку... І вось удача — абсалютна невядомы верш. (Яшчэ Мікола Рымач, перасільваючы хваробу, паспрабуе адшукаць у сваёй немалой хатняй бібліятэцы арыгінал верша *"Цяжка адкрываюцца дзверы ў ЦК..."* Калі знойдзе — таксама будзе важкі дарунак для прыхільнікаў паэзіі.)

Аднак вернемся да ўжо знойдзенага верша. Мікалай Мікалаевіч напісаў мне так: *"Не верш, а крык душы... Падумаў яшчэ: гэтыя словы напісаны за 20 гадоў да ягонай смерці, а ў іх — увесь Мікола Купрэеў. Чытаў і быццам чуў яго голас. Не, не з таго 1984-га, а адтуль, — з неба, ужо сённяшняга... Да верша яшчэ была такая прыпіска:* ***"Паважанаму Мікалаевічу з просьбай: каб верыў у гэта (а можа, і так?).. 13.03.84".***

ЛеГАЛ

Мікола Купрэеў

* * *

Не, я не разбіўся ўшчэнт,
я не стаміўся —
вось толькі тут
на некалькі зямных арбіт стаіўся,
паміж палёў, лясоў,
наўзбоч ад аўтастрады,
каб падрахаваць спакойна
свае страты.
А іх нямала.

Не, я не адышоў ад вас,
сябры-паплечнікі, —
хачу адзін пабыць пад небам вечным,
каб дабраты і шчырасці набрацца —
і потым зноўку з вамі прывітацца.
А вас — нямала.

Не, я не ўцёк ад вас,
мае старыя ворагі —
я толькі начыню
тут сэрца сваё порахам,
каб на абрыве зноў
мог сутыкнуцца з вамі
і кулакамі, й вершамі, й вачамі!
А вас — нямала.

Пасланнем гэтым пра сябе напамінаю:
плыву тут Ясельдаю —
пыл і бруд змываю,
ды мускулы на хвалях правяраю,
кладуся на спіну —
і неба на грудзях трымаю.
Мяне — яшчэ нямала.

Саюз пісьменнікаў Беларусі і Мінскае гарадское аддзяленне СПБ смуткуюць з прычыны смерці пісьменніка Яўгена Якаўлевіча КАНТЫЛЁВА і выказваюць спачуванне родным і блізкім нябожчыка.

Саюз пісьменнікаў Беларусі і Мінскае гарадское аддзяленне СПБ смуткуюць з прычыны смерці дзіцячага пісьменніка Анатоля Фёдаравіча МАЙСЕЕВА і выказваюць шчырае спачуванне яго родным і блізкім.

Саюз пісьменнікаў Беларусі выказвае шчырае спачуванне члену СПБ Полеес Лізавеце Давыдаўне ў сувязі з напаткаўшым яе горам — смерцю мужа МАЙСЕЕВА Анатоля Фёдаравіча.

19 снежня гг. споўніцца сто год з дня нараджэння слыннага берасцейскага паэта Міколы Засіма. Няўмольны лёс адмераў таленавітаму творцу з вёскі Шэні Пружанскага раёна няпоўных 49 гадоў, але яны былі надзвычай насычаныя падзеямі.

У гонар паэта-земляка



Мікола разам з перадавой моладдзю Шэняў наладжваў спектаклі, якія з трыумфам праходзілі не толькі ў роднай і ў суседніх вёсках, а таксама і ў Пружанах (з 1930 па 1932 гады было пастаўлена 10 спектакляў). Ён таленавіта спяваў, выконваў камедыйныя ролі, іграў на балалайцы ў вясковым аркестры. Як загадчык вясковай бібліятэкі Таварыства беларускай школы (фонд налічваў паўтысячы кніг), Мікола Засім меў добрую магчымасць займацца самаадукацыяй. У сяброў і знаёмых юнак браў кнігі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Змітрака Бядулі, Цёткі, Кандрата Крапівы, Міхася Чарота. Трапіў яму ў рукі таксама і канфіскаваны зборнік Максіма Танка "На этапах".

Літаратурны дэбют Міколы Засіма адбыўся ў 1928 годзе на старонках віленскага сатырычнага часопіса "Маланка" вершам "Ні кароўкі ні мандата", у якім высмейваўся пан-хітрун, які хацеў падкупіць выбаршчыкаў, каб трапіць у польскі сейм. Часта радкі яго твораў станавіліся афарызмамі:

Наша школа — мур за кратай,
Наш тэатр — то секвестратар,
Кіно наша — у шынку,
Воля наша — на шнурку.

Аўтарытэт, заваяваны на змагарскіх дарогах Заходняй Беларусі, дазволіў Міколу Засіму пасля верасня 1939 года стаць старшынёй Шэнеўскага сельсавета. Паэт прыняў актыўны ўдзел у станаўленні савецкай улады на Пружаншчыне.

Вайна прымусіла Міколу Засіма зноў стаць на дарогу змагання. Змагаўся з ворагам ён не толькі зброяй паэзіі, аб чым і прагучала ў вершы "Паэту":

Пісаць пра волю — гэта мала,
Без справы слова — гэта грош,
Трэ, каб адна рука трымала
Пяро, другая — востры нож.

Паэт з першых дзён вайны становіцца падпольшчыкам, а вершы той пары нагадваюць палітычныя лістоўкі. У сакавіку 1942 года Мікола Засім уступае ў адзін з першых партызанскіх атрадаў на Пружаншчыне. У снежні 1943 года ён быў прызначаны інструктарам Антыфашысцкага камітэта Брэсцкай вобласці.

У 1944 годзе нястомны змагар прызначаецца намеснікам старшыні Пружанскага райвыканкама і на гэтай пасадзе ён быў да 1946 года. Затым — вучоба ў Рэспубліканскай партыйнай школе пры ЦК КПБ, пасля якой ён стаў працаваць у 1948 годзе ў брэсцкай абласной газеце "Зара", а потым і ў раённай газеце "Заря над Бугом".

У Брэсце паэт узначальвае абласное літаратурнае аб'яднанне і дапамагае многім маладым літаратарам стаць на ногі. Пра гэты перыяд яго жыцця скажа даследчык творчасці Міколы Засіма У. Калеснік: "Самы каштоўны ўрок з усіх, якія даваў Мікола Засім літаратурнай моладзі на Брэстчыне, — гэта прыклад. Мікола Засім увасабляў у вачах юнакоў і дзяўчат прыклад сапраўднага "жывога" паэта, які вырас на той жа зямлі, на якой раслі яны, і данёс яе клопаты і радасці да слыху ўсёй шматнацыянальнай краіны. Засім быў тутэйшым паэтам, якога хваліў не толькі па-зямляцку Піліп Пестрак, але і Максім Танк ды Аркадзь Куляшоў, а перакладаў і друкаваў у "Новом мире" Аляксандр Твардоўскі".

Пры жыцці паэта выйшлі толькі два яго зборнікі: у 1947 годзе — "Ад шчырага сэрца" і ў 1954 годзе — "Вершы". У пасляваеннай лірыцы гэтага аўтара ў пераважнай большасці славіцца гераізм беларускага народа ў гады ваеннага ліхалецця ("Дачка Радзімы", "Масква з намі" ды іншыя) і паэтызуецца мірная стваральная праца ("Герой працы", "Касавіца", "Думкі аб Волга-Доне"...).

Не стала па-свойму арыгінальнага і цікавага Пружанскага паэта 19 ліпеня 1957 года.

У сувязі са святкаваннем сёлета стогадовага юбілею з дня нараджэння М. Засіма раённымі ўстановамі Пружаншчыны сумесна з Брэсцкім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі ладзіцца шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных гэтай падзеі. Так, на тэрыторыі Шэнеўскага сельсавета пройдзе тыдзень Міколы Засіма, у рамках якога ў мясцовых школе і клубе будуць арганізаваны паэтычныя чытанні, конкурсы чытачоў і юных паэтаў, літаратурныя вечары, сустрэчы з паэтамі Брэстчыны і Пружаншчыны.

Зараз мясцовым сельсаветам вядзецца работа па падборы адпаведнага памяшкання для размяшчэння ў ім музея М. Засіма, які раней месціўся ў будынку сярэдняй школы.

Ва ўстановах адукацыі раёна пройдуць тыдні, прысвечаныя юбілею. Запланаваны фестываль паэзіі "Не для тых пяю...", выстава народнай творчасці, літаратурная гасцёўня "Вас вітаць заўсёды рады".

У літаратурнай гасцёўні "Сустрэча" цэнтральнай раённай бібліятэкі будзе арганізавана літаратурнае свята "Быў заўсёды я з народам — і ў прыгодах і ў нягодах". У бібліятэчных і клубных установах раёна пройдуць бібліяграфічныя агляды, часы паэзіі, літаратурныя кампазіцыі, вечары-партрэты, дзіцячыя гадзіны ды іншыя мерапрыемствы.

З мэтаю ўвекавечання памяці паэта аддзелам культуры таксама разглядаецца пытанне аб устаноўцы барэльефа М. Засіма на будынку цэнтральнай раённай бібліятэкі, якая носіць яго імя.

Анатоль КРЭЙДЗІЧ

Таямнічая дабрадзейка

Летась у хроніцы пра жыццё і творчасць Якуба Коласа нямала пісалася пра тыя часіны, калі ён пасля настаўніцкага з'езда 1906 года быў звольнены з працы, аддадзены пад нагляд паліцыі і на яго пачалі заводзіць судовую справу. Цяпер хацелася б пазнаёміць чытача з пэўнымі дакументальнымі падрабязнасцямі, што прымушаюць па-новаму зірнуць на тагачасную рэчаіснасць і некаторых асоб.

Звольнены з працы і знаны толькі ў вузкіх настаўніцкіх колах 24-гадовы Канстанцін Міцкевіч намагаўся і зарабіць на пражыццё, і штосьці добрае зрабіць для асветы і духоўнасці Беларусі. Ужо ў канцы 1906-га ён адчыняе сваю нелегальную школу, пачынае складаць "Другое чытанне для дзяцей беларусаў", пасля закрыцця "Нашай долі", дзе ўпершыню друкаваўся пад псеўданімам Якуб Колас, спрабуе прыжыцца ў Вільні пры "Нашай Ніве". Ды ў 1907-м паліцыя абшуквае ягонае жыллё (начаваў і ў газетным пакойчыку, дзе, канечне ж, намагаліся высачыць яго і праз няшчыльна прыгорнутыя фіранкі), канфіскуе рукапісы і загадвае пакінуць горад. Пазней гэтая экзекуцыя паўторыцца (справу спецыяльна не спяшаліся давесці да суда, каб настаўнік і паэт пад гвалтам, без капейчыны паболей пакутаваў, сам адрокся ад нацыянальнай свядомасці).

У 1926-м Якуб Колас у аўтабіяграфіі зазначыць, што ў 1908 годзе, шукаючы паратунку, на нейкі час (студзень — красавік) апынуўся ў прыватнай школе ў Магілёўскай губерні, дзе навучаў каля 20 дзяцей. Асабліва не шматслоўнічаў: яму, ужо вядомаму, небяспечна было распавядаць, што гаспадыняй-фундатаркай той школы была не бедная жанчына, а памешчыца, "буржуйка". Адным з першых прачыніў таямніцу той загадкавай асобы даследчык С. Александровіч у лімаўскім артыкуле "Там, дзе настаўнічаў народны пясняр" за 5 кастрычніка 1962 года. Пазней ягоныя даследаванні трапяць і ў іншыя выданні. І толькі ў 1993-м у біябібліяграфічным слоўніку "Беларускія пісьменнікі" будзе афіцыйна прызнана: тая "эксплуататарка" была, не толькі прыстойная асоба, яна *па-сапраўднаму дбала пра Беларусь*. І больш за тое. Менавіта з яе імем звязана такая з'ява, як **узнікненне на пачатку XX стагоддзя на беларускіх землях беларускамоўных школ**.

100 гадоў таму, паўторым, нейкім (і сёння мала вядомым) чынам Міцкевіч-Колас трапляе ў Магілёўскую губерню. Там яго чакае *Тэрэза Гардзялоўская*. Яна дае яму прытулак і пражытак. На вялікі жаль, Якуб Колас сам не пазначыў звестак з біяграфіі яго дабрадзейкі, нават таго, колькі прыкладна было ёй гадоў. Толькі пазней даследчыкі выявілі, што тая Тэрэза паходзіла з заможнай шляхты (мела маёнтак у межах сённяшняй вёскі Сані Талачынскага раёна). Перад прыездам Коласа пабывала ў Італіі і Францыі, а яго запрасіла, каб ён пачаў навучаць у адной з першых беларускамоўных школ пры яе матэрыяльнай падтрымцы. Перапісвалася з "Нашай Нівай" (мо фундавала і яе?), пільна сачыла за беларускім нацыянальным рухам і (гэта ўжо вядома) падмацоўвала яго сродкамі. І сама вяла асветніцкую працу, дзеля ўзбагачэння беларушчыны. "Нашай Ніве" яна не толькі спачувала, але і з 1907 года дасылала ёй свае матэрыялы, супрацоўнічала з выдавецкім таварыствам "Наша хата", з "Лучынкай", у тым ліку, перакладаючы для іх творы польскіх і рускіх пісьменнікаў. І, як зазначае даследчык Г. Кісялёў, пераклады рабіла на выдатнай для таго часу беларускай мове. Выданнямі перакладаў нікога не абцяжарвала, бачачы, што беларускія газеты і часопісы ледзь дыхаюць. Усё выдавала ўласным коштам. І за свае сродкі накіравала ў дарогу кнігі Я. Коласа "Апавяданні", Ядвігіна Ш. "Бярозка", зборнік "Беларускія казкі" і інш.

Вось якая была паніспадарыня, не шыкавала, не траціла марна тое, што ёй дасталося па волі лёсу, а дбала пра люд беларускі. **100 гадоў таму** *адна з першых на Беларусі* не толькі марыла пра *беларускамоўную школу*, але і **ажыццявіла задуму на справе.**

Генрых ДАЛІДОВІЧ

Чалавек яркай біяграфіі

"З Ядвігіна Ш. вырабіўся такі пісьменнік, што не можна яго ставіць ніжэй крупных прадстаўнікоў таго ж жанру ў іншых літаратурах: гляньце, напрыклад, на казкі Шчадрына, або гэткія ж апавяданні Горкага, — няўжо ж Ядвігін Ш. горшы ад іх?" (Максім Багдановіч, з ліста ў рэдакцыю газеты "Наша Ніва" ад 14 лістапада 1912 года.)

Антон Іванавіч Лявіцкі — высакародная непаўторная постаць у гісторыі айчыннай літаратуры. Паплечнік Янкі Купалы, Змітрака Бядулі, Максіма Багдановіча, пачынальнік беларускай прозы, асоба драматычнага лёсу і шчырай душы, нястомны працаўнік, ён прайшоў цярністым шляхам беларускага праўдалюба, адданага абаронцы нацыянальнай ідэі.

Біяграфія Лявіцкага захоўвае нямала таямнічага. Ён выбраў цікавы і заманлівы псеўданім, усе спробы разгадаць які дагэтуль застаюцца безвыніковымі, — Ядвігін Ш. Паводле рамантычнай легенды, аднойчы маладому Антону сустрэлася Ядвіга — дзяўчына выключнай прыгажосці. Яна зачаравала хлопца сваімі бяздоннымі вачыма, вабным станам, пявучым голасам, запаланіла яго сэрца і розум, авалодала ягонымі марамі. Сваімі думкамі, жаданнямі, памкненнямі юнак належаў красуні Ядвізе, стаў Ядвігіным. Магчыма, яе прозвішча пачыналася з літары "Ш", адсюль — Ядвігін Ш. Але гэта толькі адна з версій. Сапраўдныя вытокі псеўданіма, напэўна, так і застануцца для нас таямніцай — вечнай, неразгаданай, ад таго яшчэ больш загадкавай і прыцягальнай.

Псеўданім спадарожнічаў Лявіцкаму амаль на працягу ўсяго творчага жыцця. Пад большасцю сваіх твораў аўтар ставіў нязменны подпіс — Ядвігін Ш. Таленавіты апавядальнік-навеліст, арыгінальны байкапісец з беззаганным адчуваннем мовы Антон Іванавіч Лявіцкі быў высокапаважаны сучаснікамі. З Янкам Купалам яго звязвалі цесныя сяброўскія стасункі. У адным з лістоў Купала напісаў: "У перыяд 1904 — 1906 гадоў я пазнаёміўся з Ядвігіным Ш. (жылі мы па суседстве). Гэта была для мяне вялікая падзея, бо я ўпершыню сутыкнуўся з чалавекам, які не толькі пісьменнік, якога друкуюць, але і піша па-беларуску. З Ядвігіным Ш. я вельмі зблізіўся". З глыбокай пашанай ставіўся да старэйшага калегі па пяры Максім Багдановіч: "Няма спрэчкі, што ў асобе Ядвігіна Ш. мы маем аднаго з найлепшых баечнікаў нашых часоў, да таго ж вельмі блізка стаўшага да творчасці самаго народа". Іх асабістае знаёмства адбылося ў Мінску ў 1916 годзе: абодва былі сябрамі "Беларускага таварыства дапамогі пацярпеўшым ад вайны" і клуба інтэлігенцыі "Беларуская хатка". Менавіта Лявіцкі з уласцівай яму тонкай пісьменніцкай інтуіцыяй адзіны ўгадаў імя аўтара новага палымянага шэдэўра — верша "Пагоня". Дзякуючы ўспамінам непасрэднай удзельніцы гэтай падзеі Апалоніі Савёнак, мы таксама можам стаць сведкамі гістарычнага факта: "Незабыўная сцэна аднэй вечарыны канца 1916 года. Неяк у сярэдзіне вечарыны Аркадзь Смоліч папрасіў усіх сесці.

— Я маю прачытаць верш, новы твор. — Тон голасу нізкі, прыцішаны. — Аўтар прасіў не называць яго імя. Смоліч урачыста і ціха прачытаў "Пагоню". У прыцемненым з поваду ваеннага часу пакоі панавала абсалютная цішыня. Пасля нясмелае: "Хто гэта? Хто напісаў? — Старэйшыя абступілі Смоліча, зашумелі: — Гэта небывалае ў нашай... ды што ў нашай — у сусветнай літаратуры... Хто аўтар?"

— Я звязаны словам, я сказаць не магу, пастарайцеся здагадацца.

— Прачытайце яшчэ раз! Гэта... гэта... — не знаходзіць словаў Ядвігін Ш.

Цяпер ужо Смоліч не чытае, а прайменнёна дэклямуе, закончвае амаль скандуючы: "Старадаўняй Літоўскай Пагоні не разбіць, не спыніць, не стрымаць".

— Гэта можа быць або Янка Купала, або... або наш Максім! — выпаліў Лявіцкі.

— Ён, — каротка кінуў Смоліч. А ў другім канцы пакоя сядзіць аўтар, усхваляваны, ледзь ухапляючы паветра сваімі хворымі грудзьмі.

Мы сядзелі прыціхшы, не здаючы сабе справы, што зараз вось сталі сведкамі вялікай падзеі".

Чалавекам яркай біяграфіі назваў Ядвігіна Ш. вядомы вучоны Захар Шыбека. Сапраўды, жыццё Лявіцкага не было ціхім і спакойным. Яно нагадвала вірлівы акіян жарсцяў, перажыванняў, здарэнняў — шчаслівых і журботных, радасных і трагічных, раптоўных і доўгачаканых. Біяграфія Антона Іванавіча — імклівы падзейна-прыгодніцкі калейдаскоп. Вучоба на медыцынскім факультэце Маскоўскага універсітэта. Удзел у студэнцкіх хваляваннях. Выключэнне з універсітэта, арышт і ўтрыманне ў бутырскай турме. Літаратурнай дзейнасцю Лявіцкі сур'ёзна пачаў займацца ў зняволенні і актыўна працягваў гэтую справу пасля вызвалення — працаваў у газетах "Виленский вестник", "Белорусский вестник", "Наша Ніва", "Беларус", часопісах "Саха", "Лучынка". Творчая спадчына Ядвігіна Ш., самае знакамітае ў якой — зборнікі апавяданняў "Бярозка" (1912 год), "Васількі" (1914 год), паэма "Дзед Завала" (1910 год), адметная сваім плённым унёскам у станаўленне і развіццё літаратурнага слова на Беларусі. Лявіцкі — аўтар першага беларускага рамана "Золата" (1920 год) — псіхалагічнага вострахарактарнага твора з напружаным драматычным сюжэтам. На жаль, складаныя жыццёвыя абставіны, невылечная тады хвароба на туберкулёз горла не дазволілі завяршыць раман. Няздзейсненымі засталіся розныя намеры і надзеі Ядвігіна Ш. — грамадскія, палітычныя, творчыя. Але многія планы "уладар беларускай прозы" паспеў ажыццявіць, таму сёння мы маем магчымасць атрымліваць эстэтычную асалоду ад поўных мастацкага густу і самабытнасці твораў Антона Іванавіча Лявіцкага — Ядвігіна Ш., чалавека моцнага духам і чыстага думкамі.

Кацярына ДАВЫДАВА,
загадчык філіяла Літаратурнага музея М. Багдановіча "Беларуская хатка"

РЫТМ ПРАДПРЫЕМСТВА

Прадпрыемства "Рытм" — комплекс рамонтна–будаўнічых работ па ўсёй Беларусі.

ТРАДЫЦЫІ ДЫНАМІКА НАВАЦЫІ ЯКАСЦЬ

Напрамкі дзейнасці прадпрыемства:

- новае будаўніцтва
- рэканструкцыя
- капітальны і касметычны рамонт
- дахавыя і гідраізаляцыйныя работы
- электрамантажныя работы
- сантэхнічныя работы
- праектныя работы
- дызайнерскія паслугі

220021, г. Мінск, вул. Агарова, 1
Тэл.: +375 (17)242-99-62,
факс: +375 (17)243-30-60
E-mail: company@ritm.biz
www.ritm.biz

ЛіМ

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная калегія:

Анатоль Акушэвіч
Лілія Ананіч
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Святлана Берасцень
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Уладзімір Дуктаў
Анатоль Жук
Вольга Казлова
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Дзмітрый Лыбін
Алесь Марціновіч
Мікола Станкевіч
Юрый Цвяткоў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
220034, Мінск,
вул. Захарава, 19

Тэлефоны:
галоўны рэдактар,
намеснік — 284-66-73

Аддзелы:
публіцыстыкі — 284-66-71
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-95-62
крытыкі і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі — 284-44-04
мастацтва — 284-82-04
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: lim_new@mail.ru

Адрас у Інтэрнеце:
www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва".

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
г. Мінск,
пр. Незалежнасці, 79.

Індэкс 63856
Наклад 3427
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 23.07.2008 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 3914

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 0024-4686